Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

14 САКАВІКА 2007 г.
СЕРАДА

№ 48 (25913)

Кошт 400 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

МОЦНАЙ ПАВОДКІ НЕ ЧАКАЕЦЦА

У адпаведнасці з доўгатэрміновым прагнозам дэпартамента гідраметэаралогіі Мінпрыроды, максімальныя ўзроўні веснавой паводкі будуць фарміравацца ў сакавіку—красавіку.

На большасці рэк пойменныя землі будуць падтоплены паводкавымі водамі. Згодна з прагнозамі, вышыня максімальных узроўняў вады па басейнах Нёмана, Заходняга Буга, Заходняй Дзвіны чакаецца ніжэй нормы, па басейнах Дняпра, Сожа, Беразіны — блізкай да нормы, а ў басейне ракі Прыпяць максімальныя ўзроўні вады веснавой паводкі чакаюцца блізкімі да нормы ці некалькі вышэй яе.

У басейне ракі Прыпяць і яе левабярэжных прытокаў магчымыя частковыя падтапленні падворкаў, будынкаў і збудаванняў у 45 населеных пунктах, у зону падтапленняў могуць трапіць 2155 чалавек у Жыткавіцкім, Петрыкаўскім, Пінскім, Лельчыцкім, Лунінецкім, Мазырскім і Столінскім раёнах. У басейне Беразіны ў зоне падтапленняў могуць апынуцца 17 населеных пунктаў (386 чалавек) у Барысаўскім, Светлагорскім, Жлобінскім, Клічаўскім, Рэчыцкім і Кіраўскім раёнах. У пойме Дняпра часткова падтопленымі могуць быць падворкі жыхароў у 11 населеных пунктах (усяго 88 чалавек), а на рацэ Сож пры дасягненні максімальных паказчыкаў, што прагназуюцца, падворкі ў 26 населеных пунктах (167 чалавек).

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВЯСНА НА ПАРОГ — ХЛЕБАРОБ У ПОЛЕ

На Брэстчыне пачалася сяўба яравых

Адразу ж пасля свята жанчын выйшлі ў поле земляробы самага паўднёвага раёна Брэстчыны — Маларыцкага. За дзень-другі падрыхтавалі глебу, і запрацавалі сеялкі ў чатырох гаспадарках. Нездарма ж кажуць: сей авёс у грязь, будзеш жыць як князь. Першыя палеткі засеяны аўсом у СВК «Хаціслаўскі», прыватным УП «Савушкіна», сельгаспрадпрыемстве «Радзеж» Брэсцкага аддзялення Беларускай чыгункі. СВК «Чырвоны партызан» пачаў веснавыя работы з сяўбы ячменю. Паводле слоў намесніка старшыні Маларыцкага райвыканкама Вячаслава Федзюковіча, прыказка прыказкай, але ніхто нават аўса ў грязь не сее. Гаспадаркі вядуць пасяўную пакрысе, выбіраючы палі на ўзгорках у самых сухіх мясцінах, там, дзе зямля гатовая прыняць зерне.

13 сельгаспрадпрыемствам Маларытчыны трэба засеяць гэтай вясной 12 тысяч гектараў. Пакуль зроблены першыя крокі — пасеяны дзесяткі гектараў. Паралельна вядзецца ўвесь комплекс палявых работ: рыхтуецца глеба, падкормліваюцца азімыя збожжавыя, рапс.

На пытанне, ці памятае Вячаслаў Іларыёнавіч за сваю 30-гадовую біяграфію аграрыя такую раннюю сяўбу, кіраўнік раённага сельгасхарча адказаў, што ўсякае бывала. Гадоў дзесяць таму аднойчы выходзілі ў поле ў канцы лютага. Але звязваць тэрміны сяўбы з прагнозам на будучы ўраджай ніяк не выходзіць. Ніхто не ведае, як павядзе сябе прырода ў далейшым. Падтрымаў калегу ў гэтых меркаваннях і намеснік старшыні Брэсцкага райвыканкама па сельскай гаспадарцы Віктар Лукашэвіч. У прыгарадным раёне праз дзень-два прыступяць да пасяўной кампаніі ўсе гаспадаркі. Аб гэтым учора ішла гаворка на нарадзе кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў. Піянерамі сёлетняй сяўбы ў раёне сталі землякі першага беларускага касманаўта Пятра Клімука — ААТ «Камароўка» сее ўжо другую сотню гектараў ячменю. Прадпрыемства «Брэсцкі» вядзе сяўбу гэтай жа культуры. Пасяўны клін Брэсцкага раёна сёлетняй вясной складзе прыкладна 18 тысяч гектараў, з іх толькі пяць тысяч — збожжавыя. Але ж як рана ні пачынай, пасадка бульбы, агародніны, іншых культур можа быць закончана толькі ў маі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

* * *

Сёння пасяўная стартуе і ў цэнтральным рэгіёне. Асноўная стаўка падчас правядзення палявых работ робіцца на сучасную, высокапрадукцыйную тэхніку.

Парк трактароў на Міншчыне за апошнія гады абнавіўся дзесьці на 40 працэнтаў, шмат было закуплена і іншай тэхнікі. Гэта дазволіць правесці сяўбу ў сціслыя тэрміны — за 10—12 дзён, праўда, пры адной умове — калі будзе спрыяльнае надвор'е. Усяго ў сяўбе возьмуць удзел 14 тысяч механізатараў, амаль чвэрць ад гэтай колькасці (2,9 тыс.) неабходна будзе прыцягваць на дапамогу з іншых арганізацый. Як лічыць Уладзімір Хацяноўскі, такі недахоп узнікае перш за ўсё з-за таго, што працаваць у вёсцы пакуль лічыцца непрэстыжным. Каб павялічыць прывабнасць працы, і закупляецца імпартная тэхніка. Яе прымяненне дазваляе палепшыць умовы працы і адчувальна павялічыць заробак (у выніку выканання большага аб'ёму работ).

У Мінскім раёне падрыхтоўка да сяўбы вялася без адставання, у межах графікаў. Рытмічна адбывалася пастаўка мінеральных удабрэнняў, назапашванне «гаручага». Як запэўніў першы намеснік начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Мінскага райвыканкама Сяргей Серы, у сярэднім гаспадаркі ўжо маюць пэўны запас дызпаліва, якое пастаўлялася са скідкай і адтэрміноўкай плацяжоў на месяц. Да пачатку сяўбы патрэба будзе задаволена практычна поўнасцю. Не ўзнікае і пытанняў наконт падрыхтоўкі тэхнікі — як паведаміў Сяргей Серы, апошнім часам парк быў абноўлены на 70—80 працэнтаў. «Ранняя вясна для нас не стала нечаканасцю», — адзначыў спецыяліст.

Мікалай ЛІТВІНАЎ, *Мінскі раён.*

Прэзідэнт Беларусі ўдастоены ўзнагароды «Зорка ордэна Архангела Міхаіла»

Гэта вышэйшая ўзнагарода Народнага ўзнагароднага камітэта Расіі, які ажыццяўляе сваю дзейнасць па бласлаўленню Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Аляксія II. Урачыстая цырымонія перадачы ўзнагароды адбылася ў Пасольстве Беларусі ў Расіі.

Як адзначыў на цырымоніі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол нашай краіны ў РФ Васіль Далгалёў, вялікая работа, праведзеная Народным узнагародным камітэтам па адраджэнню святых каштоўнасцяў праваслаўя ў краінах усходне-хрысціянскіх традыцый, умацаванню духоўнага адзінства, міру і згоды паміж аднавернымі народамі, заслугоўвае самай шчырай павагі. У Беларусі шырокае адабрэнне атрымала дзейнасць арганізацыі па адраджэнню хрысціянскіх каштоўнасцяў, умацаванню міру і згоды. «Перакананы, што менавіта духоўны пачатак дапамагае беларусам і расіянам знаходзіць дарогу адзін да аднаго, будаваць Саюзную дзяржаву, захоўваць адзінства веры і вечную дружбу братэрскіх славянскіх народаў», — сказаў дыпламат.

У адпаведнасці з палажэннем «Зорка ордэна Архангела Міхаіла» прысуджаецца кіраўнікам дзяржаў, урадаў і парламентаў, прадстаяцелям праваслаўных цэркваў і іншых канфесій, вядомым грамадскім і палітычным дзеячам, кіраўнікам буйных карпарацый, арганізацый і рухаў. Гэтай узнагародай адзначаецца дзейнасць, накіраваная на духоўнае адраджэнне і прымнажэнне нацыянальнай культуры, умацаванне эканамічных і палітычных сувязяў дзяржаў, зацвярджэнне высокіх нормаў духоўнай і агульначалавечай маралі, захаванне культурнай і духоўнай спадчыны, умацаванне міру, дружбы і супрацоўніцтва паміж народамі, аднаўленне, адбудову і будаўніцтва аб'ектаў духоўнага, культурнага і сацыяльнага значэння. Раней гэтым ордэнам былі ўзнагароджаны Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Аляксій II, прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт, Найсвяцейшы Павел — Патрыярх Сербскі, Найсвяцейшы Максім — Патрыярх Балгарскі, Высокапраасвяшчэнны Лаўр — Першаіерарх Рускай замежнай царквы, а таксама вядомыя грамадскія і палітычныя дзеячы.

БЕЛТА.

ЗОЛАТА Ў «ДЫПЛАМАЦЕ»

Буйная партыя залатых і сярэбраных вырабаў без прабірнага кляйма Рэспублікі Беларусь канфіскавана ў непрацуючай жыхаркі Гродна. Папярэдняя ацэначная вартасць канфіскаваных каштоўных металаў складае Br65,5 млн, паведаміў карэспандэнту **БЕЛТА** начальнік упраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі УУС Гродзенскага аблвыканкама Антон Вількель.

46-гадовая жыхарка Гродна была затрымана ў час сустрэчы з пакупніком. У канфіскаваным у яе дыпламаце знаходзілася звыш 100 залатых упрыгажэнняў агульнай вагой каля 500 г і 400 вырабаў з серабра агульнай вагой 2350 г. Кошт вырабаў склаў каля Br48 млн. У ходзе агляду кватэры затрыманай былі канфіскаваны аналагічныя ўпрыгажэнні яшчэ на Br17 млн. Там жа знайшлі вагі, біркі з надпісам «Маскоўскі ювелірны завод».

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

ПА ПУШЧАНСКІХ ДАРОГАХ

Сяргей ТАРАСЕВІЧ — з шафёрскай сям'і. Кіраваў аўтамабілем яго бацька, два браты таксама «абаранкі» круцяць. Хоць гэтым, бадай, сёння нікога не здзівіць — век хуткасцяў і аўтамабільнага буму. І нават у вёсцы Роўбіцк Пружанскага раёна (дзе жыве гэты вопытны кіроўца) што двор — то вадзіцельскі. А вось месца працы Тарасевіча — «эксклюзіў»: Белавежская пушча. Сем гадоў у ягоных руках заўсёды спраўны, паслухмяны і па-пушчанску ўпрыгожаны аўтамабіль.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

МЕНШ СПІРТНОГА — МЕНШ ЗЛАЧЫНСТВАЎ

У Гомельскай вобласці забарона начнога гандлю спіртным прывяла да скарачэння колькасці вулічных абрабаванняў. Аб гэтым паведаміў начальнік абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама Валерый Яромкін на прэс-канферэнцыі.

Паводле яго слоў, год таму спачатку ў Гомелі, а затым і ў буйных гарадах Гомельскай вобласці быў праведзены эксперымент па забароне рэалізацыі спіртных напояў у начны час. Абмежаванні закранулі кругласуткавыя магазіны як камунальнай, так і прыватнай формы ўласнасці. Летась такая забарона была распаўсюджана на ўсе раённыя цэнтры рэгіёна. Гадавы аналіз вынікаў паказаў, што дзякуючы гэтаму эксперыменту ў вобласці на чвэрць скарацілася колькасць вулічных абрабаванняў і значна стабілізавалася крымінагенная абстаноўка ў месцах размяшчэння кругласуткавых аб'ектаў гандлю, адзначыў Валерый Яромкін.

Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.

ХАКЕР СУПРАЦЬ БІЗНЭС—ПАРТАЛА

Хакер узламаў самы папулярны ў Прыдзвінскім краі сярод наведвальнікаў мясцовых Інтэрнэт—рэсурсаў даведачна—інфармацыйны партал «Віцебская вобласць для бізнэсу і інвестыцый». Гэты партал быў распрацаваны па заданню Віцебскага аблвыканкама спецыялістамі Віцебскага цэнтра падтрымкі прадпрымальніцтва.

Апошніх, мякка кажучы, проста здзіўляе, навошта віртуальнаму хулігану трэба было разбураць электронную крыніцу дзелавой інфармацыі? Як паведамілі «Звяздзе» ў гэтым цэнтры, частку інфармацыі аднавіць ужо нельга. Штомесяц на партал www.vitinvest.by.com заходзілі каля 9 тысяч наведвальнікаў. Вельмі папулярнай была афіцыйная інфармацыя ўпраўлення юстыцыі аблвыканкама пра ўсе існуючыя ў рэгіёне суб'екты гаспадарання, аб інвестыцыйных праектах, занятасці, прапановах па тэме адпачынку і здароўі, пытаннях права, падтрымкі бізнэсу... Вельмі актыўна працаваў дзелавы форум, на якім бізнэсмены не толькі маглі абмеркаваць свае праблемы, абмяняцца думкамі па важных для іх тэмах, але і атрымаць адказы на пытанні, што іх цікавяць. Хакер узламаў і форум. Зараз партал зноў дзейнічае і прымаюцца дадатковыя меры абароны супраць віртуальных вандалаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЮРЫСТ «НАСТУПІЎ» НА ЗАКОН

Днём у Мінску праваахоўнікамі былі затрыманы адказная асоба Беларускага таварыства «Кніга» і юрыст аднаго з рэспубліканскіх унітарных таварыстваў.

Супрацоўнікі ГУУС Мінгарвыканкама ў ходзе спецаперацыі затрымалі гэтых жыхароў сталіцы на вуліцы Чайкоўскага. Паводле папярэдняй інфармацыі, абедзве асобы падазраюцца ў тым, што атрымалі 5 мільёнаў рублёў і 5 тысяч долараў ЗША хабару ад непрацуючага за станоўчае вырашэнне пытання аб здачы ў арэнду складскіх памяшканняў. Па гэтаму факту ўзбуджана крымінальная справа.

Ігар ГРЫШЫН.

ПАСАДЗІ СВАЁ ДРЭВА

Новыя лясы — нашчадкам у спадчыну. Пад такім дэвізам 14 красавіка Міністэрства лясной гаспадаркі плануе правесці агульнарэспубліканскую добраахвотную акцыю «Дзень лесу-2007». У гэты дзень з дапамогай добраахвотных удзельнікаў плануецца высадзіць 10 мільёнаў дрэў лясных парод — фактычна па дрэву на кожнага жыхара Беларусі.

Як паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Мінлясгаса, асноўная задача акцыі — прыцягнуць увагу грамадскасці да вырашэння задач узнаўлення лясных багацця краіны. У прыватнасці, паказаць грамадзянам, з якімі намаганнямі і якой працай ствараюцца новыя лясы для будучых пакаленняў, аднавіць традыцыі беражлівага стаўлення да лесу і яго насельнікаў. З ростам урбанізацыі, развіццём новых тэхналогій, працэсаў глабалізацыі такія задачы набываюць асаблівую актуальнасць. Прыняць удзел у пасадках дрэў запрашаюцца ўсе ахвотнікі: навучэнцы і студэнты, навуковыя і педагагічныя работнікі, прадстаўнікі органаў улады і грамадскіх арганізацый і г.д. Як абяцаюць арганізатары акцыі, арганізацыямі лясной гаспадаркі будуць забяспечаны дастаўка добраахвотнікаў да лесакультурных аб'ектаў, выдача пасадачнага матэрыялу і прыладаў працы. У гэты ж дзень для ўдзельнікаў акцыі запланаваны экскурсіі на лясныя гадавальнікі і паляўнічыя базы, дэманстрацыя працы айчыннай тэхнікі, кірмашы і канцэрты мастацкай самадзейнасці лясгасаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВА ЎРАДЗЕ

У Беларусі на рэканструкцыю дзяржаўных тэатраў за тры гады накіравана больш як Br15,7 млрд

У Беларусі за 2004—2006 гады на выкананне Праграмы рэканструкцыі і тэхнічнага перааснашчэння дзяржаўных тэатраў Рэспублікі Беларусь на 2004—2010 гады накіравана больш як Br15,7 млрд, што склала 104 працэнты да плана. Аб гэтым паведаміў міністр культуры Уладзімір Мацвяйчук на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, якое прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага.

Паводле інфармацыі міністра культуры, па рэспубліканскаму бюджэту за тры гады праграма была выканана на 185 працэнтаў. У той жа час аб'ём работ па рэканструкцыі і тэхнічнаму перааснашчэнню тэатраў камунальнай уласнасці ажыццёўлены толькі на 84,4 працэнта.

Прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі адзначыў у ходзе пасяджэння, што аблвыканкамы павінны не дапускаць пераносу тэрмінаў мерапрыемстваў па рэалізацыі праграмы і не адцягваць сродкі на будаўніцтва іншых аб'ектаў.

Прэм'ер-міністр запатрабаваў таксама ўзмацніць кантроль за правядзеннем тэндараў на пастаўку абсталявання і матэрыялаў для рэканструкцыі тэатраў.

Паводле інфармацыі старшыні Камітэта дзяржкантролю Зянона Ломаця, пры рэканструкцыі будынка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета выяўлены грубыя парушэнні.

Паводле слоў Зянона Ломаця, умяшанне Камітэта дзяржкантролю дало магчымасць дзяржаве зэканоміць 260 тыс. еўра на тэндары па закупцы сцэнічнага абсталявання для тэатра. Акрамя таго, ёсць парушэнні заканадаўства ў праведзеным тэндары на пастаўку гэтаму тэатру дзверэй. «Перамагла абсалютна незразумелая падстаўная фірма», — сказаў ён. Цяпер ідзе праверка гэтай аперацыі.

У сувязі з гэтым прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі адзначыў, што сёння ў канцэрне «Беллеспаперапрам» дастаткова прадпрыемстваў, якія маюць серыйную тэхналогію, праспектыў спецыфікацыю і калькуляцыю. Прэм'ер-міністр сказаў, што на рэканструкцыю дзяржаўнага тэатра можна было «прыцягнуць беларускага вытворцу, які зрабіў бы любыя дзверы».

Вольга СРЭДНЕВА, БЕЛТА.

Кватэра вернута ў дзяржаўны фонд

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-цэнтры Пракуратуры Рэспублікі Беларусь, была ўзбуджана крымінальная справа у адносінах да былога намесніка ваеннага камісара аднаго з раённых ваенкаматаў Гомельскай вобласці.

Прадаставіўшы фіктыўныя дакументы аб наяўнасці ў яго выслугі ў 20 каляндарных гадоў на ваеннай службе, афіцэр набыў права бясплатнай прыватызацыі трохпакаёвай кватэры ацэначнага кошту звыш Br11 млн. Бабруйскім міжгарнізонным ваенным судом абвінавачаны быў асуджаны да штрафу ў памеры 60 базавых велічынь. На іску Гомельскага міжгарнізоннага ваеннага пракурора дагавор аб бязвыплатнай перадачы ва ўласнасць указанай кватэры прызнаны судом несапраўдным. Яна вернута ў дзяржаўны жыллёвы фонд.

«Еўрабачанне-2007»

Беларусь стартуе чацвёртай

12 сакавіка кіраўнікі дэлегацый краін, якія ўдзельнічаюць сёлета ў песенным спаборніцтве «Еўрабачання», сабраліся ў Хельсінкі на жараб'ёўку, якая вызначыла парадак выступлення канкурсантаў у фінале і паўфінале. Усяго «па палічках» трэба было расставіць 42 удзельнікаў, 28 з якіх пачынаюць барацьбу з паўфіналу. Гэта пакуль што абсалютны рэкорд па колькасці ўдзельнікаў за больш чым паўвекавую гісторыю конкурсу.

Па выніках жараб'ёўкі беларускі прадстаўнік, які выступае пад сцэнічным імем Калдун, у паўфінале конкурсу выйдзе на сцэну чацвёртым з песняй «Work Your Magic». Перад ім свае нумары прадставяць канкурсанты з Балгарыі, Ізраіля і Кіпра. Апошні нумар дастаўся Латвіі (дакладней, прадстаўнікі гэтай краіны выцягнулі так званую «дзікую карту» і самі выбралі сабе стартавую пазіцыю). Дэбютанты конкурсу — а ў гэтым годзе іх два, Грузія і Чэхія — выступяць у паўфінале пад нумарамі 6 і 15 адпаведна. У конкурс вярнуліся Венгрыя і Аўстрыя, якім лёс вызначыў паўфінальныя стартавыя нумары 22 і 27. Сербія і Чарнагорыя возьмуць удзел у «Еўрабачанні» ўжо ў якасці самастойных дзяржаў — пад нумарамі 15 і 7 адпаведна.

У фінале «Еўрабачання» традыцыйна выступаюць 24 краіны — 10 лепшых па выніках леташняга конкурсу, «вялікая чацвёрка» краін-арганізатараў (Вялікабрытанія, Германія, Іспанія, Францыя) і 10 лідараў паўфіналу. Адкрые фінал конкурсу Боснія і Герцагавіна, а пад нумарам 24 выступіць хтосьці з пераможцаў паўфіналу (іхняя жараб'ёўка пройдзе непасрэдна перад канцэртам, 11 мая). Свабоднымі для выхадцаў з паўфіналу засталіся таксама пазіцыі 3, 6, 7, 8, 11, 14, 17, 21 і 22.

Нашы суседзі — Расія і Украіна — пачнуць барацьбу адразу з фіналу. Прадстаўнік Расіі, які вызначыўся літаральна днямі (праект Максіма Фадзеева, дзявочы гурт «Серабро» з песняй пад амбіцыйнай назвай «Song #1»), выйдзе на сцэну пад нумарам 15. Канкурсанту(цы?) з Украіны, якім(ой) сёлета названы(а) Андрэй Данілка ў вобразе Веркі Сярдзючкі з песняй «Dansing», дастаўся нумар 18. Ці спрацуе сёлета правіла першых і апошніх нумароў, якія быццам бы лепш запамінаюцца публіцы — убачым 10 і 12 мая. Дарэчы, вынікі глядацкага галасавання наша краіна будзе абвяшчаць другой па ліку — пасля Чарнагорыі.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Нерухомасць

КОШТ ЭЛІТНАГА ЖЫЛЛЯ Ў СТАЛІЦЫ ДАСЯГАЕ 3,5 ТЫС. USD ЗА КВ. М

Элітнае жыллё ў мегаполісах усіх краін свету заўсёды вызначалася сваёй выключнасцю па якасці і кошту. Зараз, калі нават звычайныя стандартныя кватэры на другасным рынку даражэюць ажыятажнымі тэмпамі, эксклюзіўнае жыллё і зусім пачынае каштаваць па завоблачных расцэнках. Колькі сёння каштуе нерухомасць такога класа? Зараз мы працягваем размову з пастаянным экспертам нашага выдання дырэктарам Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалаем Прасталупавым.

Прэстыжным, або элітным жыллём у Мінску лічацца нават невялікія аднапакаёвыя кватэры ў пяці- або дзевяціпавярховых дамах у цэнтры горада, або ўздоўж праспектаў каля знакавых гандлёвых цэнтраў. Кватэры прадаюцца абавязкова пасля еўрарамонту, з сучаснымі пліткай, кафелем, ламінатам і наяўнасцю падземных гаражоў. Такія кватэры агульнай плошчай 30—35 квадратных метраў каштуюць сёння 70—80 тысяч долараў.

Кошт двухпакаёвага элітнага жылля залежыць ужо не толькі ад плошчы кватэр і месцазнаходжання дамоў, але і ад дызайн-праектаў, мэблі і сучаснага бытавога абсталявання. Такія «двойкі» плошчай ад 50 да 80 квадратных метраў каштуюць ужо ад 85 да 185 тысяч долараў.

Вялікія па плошчы шматпакаёвыя кватэры, часам на двух узроўнях прапануюцца часцей у адносна новых дамах, дзе квадратны метр жылля каштуе ад 2 да 2,5 тысячы долараў. Існуюць у Мінску і кватэры сапраўды экстра-класа. Такое жыллё будуецца ці рамантуецца пад еўра-стандарт, дзе абавязкова прысутнічае падлога з падагрэвам, з убудаванымі кухнямі па спецпастаўках з краін Заходняй Еўропы і з усімі неабходнымі бытавымі прыборамі для камфортнага жылля. Кошт квадратнага метра такога жылля дасягае 3,5 тысячы долараў. Асобныя кватэры элітнага жылля прапануюцца зараз за 250—350 тысяч долараў. Існуе і больш дарагое жыллё, але рэальны кошт такіх кватэр вызначаецца толькі выключна па дамоўленасці з канкрэтным патэнцыяльным пакупніком.

Самыя танныя катэджы ў сталіцы без аддзелкі каштуюць каля 300 тысяч долараў. Атрымліваецца, што квадратны метр такога жылля каштуе 1,2—1,5 тысячы долараў. Катэджы ў Мінску, цалкам гатовыя для жылля, але без мэблі каштуюць ужо 500—600 тысяч долараў, калі квадратны метр агульнай плошчы дасягае 2 тысяч долараў. Вядома, што на такое жыллё плошчай 150—300 квадратных метраў існуе выключна свой індывідуальны пакупнік. Катэджы такога плана прадаюцца агенцтвамі нерухомасці гадамі.

Сяргей КУРКАЧ.

Футбол

СЕЗОН АДКРЫТЫ

Футбольны сезон можна лічыць адкрытым: у чатырох гарадах Беларусі (Віцебску, Мінску, Гродне і Пінску) стартаваў першы розыгрыш «Кубка федэрацыі».

Па задуме арганізатараў шаснаццаць каманд вышэйшай лігі і дзве з першай (сталічны «Лакаматыў» і пінская «Хваля») бяруць удзел у гэтым турніры, каб лепш падрыхтавацца да нацыянальнага чэмпіянату, але ў большасці ў сёлетніх спаборніцтвах удзельнічаюць не асноўныя саставы клубаў, а дублі, бо тэрмін правядзення новага турніру супаў з часам правядзення замежных збораў для большасці галоўных каманд. І ўсё ж «Кубак федэрацыі» нясе вялікую карысць, бо трэнеры маюць магчымасць зірнуць на патэнцыяльных кандыдатаў у «аснову» непасрэдна на полі, праверыць бліжэйшы рэзерв у матчах.

Вынікі першых матчаў: група «А»: БАТЭ (Барысаў) — «Гомель» — 4:2, «Віцебск» — «Днепр» (Магілёў) — 3:0; група «Б»: «Дынама» (Мінск) — «Мінск» — 1:3, «Дарыда» (Ждановічы) — «Тарпеда» (Жодзіна) — 2:0; група «В»: МТЗ-РІПА (Мінск) — «Лакаматыў» (Мінск, Д2) — 0:0, «Нёман» (Гродна) — «Смаргонь» — 1:3; група «Г»: «Шахцёр» (Салігорск) — «Хваля» (Пінск, Д2) — 1:1, «Нафтан» (Наваполацк) — «Дынама» (Брэст) — 5:0. Другі тур «Кубка федэрацыі» адбудзецца 15 сакавіка, трэці — 18-га. 22 сакавіка пройдуць паўфінальныя сустрэчы, пераможцы якіх разыграюць паміж сабой (25 сакавіка) Кубак першых афіцыйных спаборніцтваў новага футбольнага сезона.

Ірына ПРЫМАК.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЮШЧАНКА ЛІЧЫЦЬ РАЗМЯШЧЭННЕ АМЕРЫКАНСКАЙ ПРА Ў ЕЎРОПЕ АДПАВЕДНЫМ ІНТАРЭСАМ УКРАІНЫ

Прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка лічыць ідэю размяшчэння элементаў амерыканскай сістэмы ПРА ў Польшчы і Чэхіі адпаведнай інтарэсам усёй Еўропы.

На думку Юшчанкі, развіццё любой абарончай мадэлі ў любым рэгіёне свету, уключаючы і Еўропу, узмацняе асновы міру. Адказваючы на пытанне аб адносінах да яўна адмоўнай пазіцыі па размяшчэнню ў Еўропе элементаў ПРА прэм'ер-міністра Украіны Віктара Януковіча, прэзідэнт назваў яе «няправільным сігналам». Нагадаем, 14 сакавіка ва Украіну прыедзе група амерыканскіх экспертаў па пытаннях ПРА.

Згодна з вынікамі сацапытанняў, каля 70 працэнтаў украінцаў адмоўна ставяцца да магчымасці размяшчэння баз проціракетнай абароны ў Чэхіі і Польшчы.

ПАРЛАМЕНТ ГРУЗІІ ПРАГАЛАСАВАЎ ЗА ЧЛЕНСТВА Ў НАТО

Парламент Грузіі прыняў дэкларацыю аб тэрміновым уступленні рэспублікі ў Паўночнаатлантычны альянс. Дакумент быў зацверджаны адзінагалосна.

Дэкларацыя заклікае хутчэй выканаць умовы, якія дазволяць Грузіі перайсці на чарговы этап супрацоўніцтва з НАТО. Акрамя таго ў дакументе вядзецца размова аб больш шырокім удзеле рэспублікі ў ваенных аперацыях пад эгідай блока. Спікер парламента Ніно Бурджанадзэ падкрэсліла, што з членствам у Паўночнаатлантычным альянсе для Грузіі «звязаны надзеі на аднаўленне тэрытарыяльнай цэласнасці рэспублікі».

У Маскве еўраатлантычныя планы Тбілісі звязваюць з жаданнем сілай вярнуць кантроль над Абхазіяй і Паўднёвай Асеціяй. Як заявіў пасол Расіі Вячаслаў Каваленка, магчымае членства Грузіі ў НАТО «бязмерна ўскладніць рашэнне канфліктаў», звязаных з гэтымі непрызнанымі рэспублікамі.

У ЗША 7-ГАДОВУЮ ДЗЯЎЧЫНКУ ЗАКАРМІЛІ ДА 222 КГ

Амерыканскі тэлеканал ABC6 апублікаваў шакіруючае відэа дзяўчынкі з Чыкага, якая ў свае 7 гадоў важыць больш за 200 кг.

7-гадовая Джэсіка з-за сваёй велізарнай вагі не можа хадзіць і нават стаяць на нагах, перасоўваецца па хаце паўзком ці ў сядзячым становішчы. Дзяўчынка з цяжкасцю размаўляе, у яе пастаянная аддышка. Але пры гэтым яна пастаянна просіць есці. Штодня яе маці кілаграмамі скормлівае Джэсіцы ежу з фаст-фуда і дае пяць літраў газіроўкі. Такім чынам дзяўчынка атрымлівае за дзень 10 тысяч кілакалорый, у той час як сутачная патрэба дзіцяці такога ўзросту складае 1800 ккал. Мясцовыя ўлады па гэтаму факту абяцалі распачаць расследаванне.

ВЫКРАЎ АЛМАЗАЎ НА $28 МІЛЬЁНАЎ

Паліцыя Бельгіі аб'явіла ўзнагароду ў 2 мільёны еўра за прадастаўленне інфармацыі, якая дапаможа злавіць рабаўніка, які 5 сакавіка выкраў з банка ABM Amro ў Антверпене алмазаў на суму 28 мільёнаў долараў.

Паводле некаторай інфармацыі, рабаўніком мог стаць адзін з пастаянных кліентаў банка, які меў доступ да сховішча алмазаў. Праваахоўныя органы распаўсюдзілі яго фотаробат. Паводле слоў служачых банка, рабаўніком мог стаць мужчына ва ўзросце 55—60 гадоў, ростам пад 190 см. Паліцыя пакуль нічога не паведаміла аб прычынах, па якіх інфармацыя аб крадзяжы была абнародавана толькі праз тыдзень пасля злачынства. Таксама невядома, кім прадастаўлены грошы на ўзнагароджанне.

ISSN 1990-763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.03.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 142,00
1 еўра	2 819,84
1 латвійскі лат	3983,26
1 літоўскі літ	816,50
1 чэшская крона	99,89
1 польскі злоты	725,95
1 расійскі рубель	81,80
1 украінская грыўня	427,29

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	26,1873
10 UAH	51,7270
1000 BYR	12,1865
EUR	34,4808

Курс у гандлёвых кампаніях (на 13.03.2007 г.)

USD ..... 2210 / 2320

Падпісьцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Ва ўрадзе

Саўмін Беларусі змяніў спіс вытворчасцяў, якія даюць права на пенсію за работу з асаблівымі ўмовамі працы

Унесены дапаўненні і змяненні ў пастанову Савета Міністраў ад 25 мая 2005 года № 536 «Аб спісах вытворчасцяў, работ, прафесій, пасад і паказчыкаў, якія даюць права на пенсію па ўзросту за работу з асаблівымі ўмовамі працы». Адпаведнае рашэнне змешчана ў пастанове ўрада № 268, што ўступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

Як паведаміла карэспандэнту БЕЛТА намеснік начальніка ўпраўлення аховы і дзяржаўнай экспертызы ўмоў працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Гараева, пастанова № 536 была прынята ў мэтах прывядзення назвы асобных прафесій рабочых і пасад служачых, прадугледжаных рэдакцыяй Спісаў №1 і № 2, у адпаведнасць з новымі выпускамі Адзінага тарыфна-кваліфікацыйнага даведніка работ і прафесій рабочых (АТКД) і Адзінага кваліфікацыйнага даведніка пасад служачых (АКДП).

«Аднак структурныя змяненні, што адбыліся ў асобных галінах эканомікі, прымяненне новых нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць пытанні нармiравання і аховы працы, а таксама практыка прымянення Спісаў № 1 і № 2 паказалі, што па асобных прафесіях, пасадах і вытворчасцях неабходна ўдакладненне, прывядзенне нормаў пенсійнага заканадаўства ў адпаведнасць з прынятымі нарматыўнымі дакументамі», — сказала спецыяліст. Гэтыя карэкціроўкі і адлюстраваны ў пастанове № 268.

У прыватнасці, у Спісы № 1 і № 2 унесены новыя назвы некаторых пасад. У сувязі з падпарадкаваннем ААТ «Барысаўскі завод бытавой хіміі» канцэрну «Белнафтахім» узнікла неабходнасць перагледзець пазіцыю «Вытворчасць бытавой хіміі» ў падраздзеле «Хімічная вытворчасць» Спіса № 2. У пазіцыі «Машыніст халадзільных установак» выключана ўмова «ў прамысловасці», таму што ў арганізацыях іншых галін эканомікі таксама заняты работнікі па гэтай прафесіі, і на гэтых рабочых месцах вынікамі атэстацыі пацвярджаюцца асаблівыя ўмовы працы па Спісу № 2.

У пастанове Саўміна ўдакладнены фармулёўкі параметраў умоў працы на падставе тэхнічных нарматыўных прававых актаў.

БЕЛТА.

Прамая лінія

РАБОТА. ПЛЮС «ЖЫЛЛЁВЫЯ ПЫТАННІ»

З тымі ці іншымі праблемамі час ад часу даводзіцца сутыкацца кожнаму з нас. І першы крок да іх вырашэння — дакладна ведаць свае правы. Таму тэма чарговай «прамой лініі» «Звязды» была выбрана зусім не выпадкова. Канфліктныя сітуацыі на рабоце, кантракты, камандзіроўкі, працоўны час, мінімальныя заробкі, графікі водпускаў, дзіцячыя дапамогі, а таксама магчымыя варыянты вырашэння «жыллёвага пытання» — размова аб усім гэтым і іншым атрымалася па-сапраўднаму «гарачай». Аднак аб усім па парадку. Такім чынам, на пытанні чытачоў нашай газеты адказваюць загадчык юрыдычнай кансультацыі галоўнага прававога ўпраўлення апарату Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзімір Іванавіч ШЭЛКОВІЧ і намеснік загадчыка юрыдычнай кансультацыі ФПБ Васіль Мікалаевіч КОРСУК.

☎ — Мой сын, як малады спецыяліст, быў накіраваны на работу ў сельгасарганізацыю, дзе з 2 жніўня 2005 года па 2 жніўня 2007 года з ім быў заключаны кантракт. Аднак атрымалася так, што з леташняга па сёлетні студзень сын служыў па прызыву ў арміі. У сувязі з гэтым, калі ласка, патлумачце: які зараз працоўны дагавор павінен заключыць з ім наймальнік і колькі яшчэ сын павінен адпрацаваць па размеркаванню?

А.А. ЛАРКОВІЧ, *г. Горкі*

— Заключаць зараз бестэрміновы працоўны дагавор або кантракт — гэта вырашае кіраўнік арганізацыі. Прычым, калі будзе выбраны варыянт бестэрміновага дагавора, то адпрацаваць па размеркаванню два гады вашаму сыну ўсё роўна давядзецца. Праўда, у гэтыя два гады «ўвойдзе» і час службы ў арміі.

Калі ж будзе выбраны другі варыянт, то варта падкрэсліць — паводле заканадаўства, кантракты ў нашай краіне могуць заключацца тэрмінам не менш чым на год. І «адлік» гэтага года пачнецца з моманту вяртання сына на ранейшае працоўнае месца пасля службы. Адно, што тут можна нагадаць: сам кантракт павінен заключацца толькі па ўзаемнай згодзе бакоў.

☎ — Напрыканцы пятага курса бюджэтнага аддзялення нарадзіла дзіця, і ў сувязі з гэтым мне не далі размеркавання. Ці магчыма атрымаць яго зараз?

Кацярына Аляксандраўна НАЗАРАВА, *г. Мінск*

— Калі не было просьбы аб свабодным працаўладкаванні, то прапанаваць першае месца вам павінны былі. Калі ж гэтага не адбылося, зараз лепш за ўсё звярнуцца ў Міністэрства адукацыі. Прычым пажадана — пісьмова. Бо ў такім выпадку вам проста абавязаны даць адказ.

☎ — Я і брат з'яўляемся прамымі спадчыннікамі прыватнага дома, у якім зараз жыве маці. А пытанне такое: як потым адбудзецца падзел гэтага дома з улікам таго, што я пражываю асобна? І колькі пашпартоў будзе афармляцца на гэты дом — адзін або два?

Іван Васільевіч ПЕТРУШКЕВІЧ, *Карэліцкі раён*

— Калі больш спадчыннікаў першай чаргі няма, то вы і брат атрымаеце роўныя долі — па 1/2 дома. І кожны з вас зможа распараджацца гэтымі долямі па ўласнаму меркаванню. Што ж да пашпартоў, то тут ёсць варыянты. Пашпарт можна аформіць адзін з указаннем долі кожнага спадчынніка, а можна і два — кожнаму спадчыннiку асобна.

Аднак нельга забывацца, што ў любым выпадку па пытанню афармлення неабходна звярнуцца ў натарыяльную кантору на працягу 6 месяцаў з моманту ўзнікнення права на спадчыну.

☎ — Літаральна за чатыры метры ад сцяны прыватнага дома, дзе я жыву, праходзіць высакавольтная лінія. Ці дапушчальнае такое «суседства» і ці павінны перанесці лінію далей ад дома?

Іна Вячаславаўна ЛАЗУН, *Карэліцкі раён*

— Як вядома, прафсаюзы ў першую чаргу займаюцца працоўнымі справамі. Таму, Іна Вячаславаўна, вам усё ж лепш звярнуцца па іншаму адрасу — да энергетыкаў.

☎ — У арганізацыі, дзе я працую, існуе даволі распаўсюджаная практыка аб'яўлення вымоў з любой нагоды. Колькі такіх вымоў могуць прывесці да звальнення? І што рабіць, калі, на мой погляд, падобныя вымовы ці заўвагі з'яўляюцца абсалютна не абгрунтаванымі?

Алена, *г. Мінск*

— Сама колькасць абвяшчэння дысцыплінарных спагнанняў па сутнасці нічым не абмежаваная — тут усё залежыць ад меркавання наймальніка. Пры гэтым Працоўны кодэкс вызначае магчымасць звальнення за сістэматычнае невыкананне працоўных абавязкаў. І ў сваю чаргу весці размову аб сістэматычнасці выпадае ў сітуацыі, калі работнік ужо меў дысцыплінарнае спагнанне і здзейсніў новы праступак. Аднак казаць, што ў такіх варунках работніка павінны звольніць у абавязковым парадку, нельга — гэта зноў-такі права наймальніка, і менавіта ён павінен прымаць канчатковае рашэнне.

Разам з тым трэба адзначыць, што любое дысцыплінарнае спагнанне павінна сапраўды грунтавацца на нейкіх «вінаватых дзеяннях». І работнік мае поўнае права абскардзіць накладанне спагнання ў камісіі па працоўных спрэчках або, у выпадку нязгоды з рашэннем камісіі, — у судзе. Аднак варта памятаць, што звярнуцца ў падобных варунках у суд неабходна на працягу трох месяцаў.

Да таго ж нялішне заўважыць наступнае. З адпаведным загадам аб дысцыплінарным спагнанні работніка павінны азнаёміць у 5-дзённы тэрмін «пад роспіс» (інакш спагнанне фактычна лічыцца неправамоцным), і апроч таго, работнік мусіць у абавязковым парадку даць свае тлумачэнні. Прычым у сітуацыі, калі ён першапачаткова гападдаецца з загадам, а потым змяняе пункт погляду, магчымасць звароту ў суд таксама не выключаецца.

☎ — Працую ў вёсцы, пры гэтым мяне і іншых работнікаў раз-пораз выклікаюць па службовай неабходнасці ў горад. Ці павінны ў такім выпадку кампенсавацца праезд і выдавацца «камандзіровачныя»?

Аляксандр Іванавіч, *Магілёўскі раён*

— Безумоўна. Даручэнне работніку выконваць свае працоўныя абавязкі ў іншым населеным пункце з'яўляецца камандзіроўкай. Адпаведна, у такім разе павінны аплачвацца і праезд, і камандзіровачныя выдаткі. Пры гэтым варта заўважыць, што «іншым населеным пунктам» лічыцца іншая адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, і ў тым ліку — у межах аднаго раёна.

☎ — Вас непакоіць Людміла Васільеўна, і вось з якім пытаннем. Мая дачка закончыла медуніверсітэт і атрымала размеркаванне ва Узду. Я, хоць і не бізнэсмен, але зараз усё ж хацела б купіць ёй там кватэру. Адпаведна, нам тут узнікае пытанне: пад які працэнт і на якіх умовах даюць крэдыты на набыццё жылля маладым спецыялістам?

— Калі ваша дачка хоча працаваць у сельскай мясцовасці ці ў малым горадзе, то, згодна з Указам ад 14 красавіка 2000 года № 185, яна можа разлічваць на крэдыт для будаўніцтва ці набыцця жылля тэрмінам на 40 гадоў пад 3 працэнты гадавых. Пры гэтым сама сума крэдыту ў выпадку будаўніцтва можа складаць да 95 працэнтаў яго кошту. А ў выпадку набыцця — не будзе перавышаць 70 працэнтаў максімальнага памеру крэдыту, што выдзяляецца на будаўніцтва. Разам з тым трэба мець на ўвазе, што галоўная ўмова для атрымання такога крэдыту — знаходжанне ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў.

☎ — Маем кватэру, у якой пражывае 5 чалавек, і ў тым ліку — дзіця-інвалід. Пры гэтым стаім у агульнай чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў з 1990 года, і ў асобнай чарзе, як бацькі дзіцяці-інваліда, — з 1995 года. Парайце, як нам у рэшце рэшт атрымаць новае жыллё?

Галіна Іванаўна, *г. Мінск*

— Як вядома, усе жыллёвыя пытанні ў нас вырашаюцца па месцы жыхарства (у райвыканкаме ці ў адміністрацыі вашага раёна), або па месцы працы. Што ж да агульных нормаў, то яны такія. Паколькі вы выхоўваеце дзіця-інваліда, ваша сям'я мае права на атрыманне бясплатнага жылля — сацыяльнага карыстання. Разам з тым трэба мець на ўвазе, што зараз такое жыллё прадастаўляецца толькі тым грамадзянам, у якіх даход на кожнага члена сям'і не перавышае бюджэт пражыткавага мінімуму, а на сёння гэта — 170 500 рублёў. І калі даход атрымліваецца большым, то застаецца толькі адно — чакаць агульнай чаргі.

Сяргей ГРЫБ.
Фота Яугена ПЯСЕЦКАГА.
(Працяг будзе.)

Пытальнік

А яшчэ чэкі можна прадаць, падарыць, завяшчаць...

Прачытала ў газеце артыкул пра чэкі і хачу задаць пытанне: а дзе было раней тое Палажэнне аб парадку пераафармлення чэкаў «Маёмасць» на чэкі «Жыллё»? Я звярталася і ў ААБ «Беларусбанк», і ў сельскі Савет з гэтым пытаннем, а мне адказалі, што можна толькі вывесці чэкі «Жыллё» з чэкаў «Маёмасць», а перааформіць нельга. Справа ў тым, што мы прыватызавалі сваю двухпакаёвую кватэру ў кастрычніку 2006 года (атрыманую ў 1974 годзе) па новаму закону. Аказалася, што нам патрэбна яшчэ даплаціць 10 275 813 рублёў. Сваіх чэкаў «Жыллё» — 8 800 (880) — хапіла толькі на адзін пакой. А нашы чэкі «Маёмасць» ляжаць у нас дома. Ці маем мы цяпер права пагасіць якую-небудзь частку доўгу чэкамі «Маёмасць», і куды нам звяртацца?

Зінаіда Канстанцінаўна МАЛІНОЎСКАЯ, *п. Лукскі Жлобінскага раёна.*

Падрабязны адказ на пастаўленыя чытачкай пытанні мы атрымалі з Фонду дзяржаўнай маёмасці Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь.

«У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб раздзяржаўленні і прыватызацыі ў Рэспубліцы Беларусь», бязвыплатная частка дзяржаўнай маёмасці, якая перадаецца кожнаму грамадзяніну, вызначаецца дзвюма квотамі: жыллёвай квотай на падставе Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь» і вышэйуказанага Закона; квотай на маёмасць дзяржаўных прадпрыемстваў на падставе Закона Рэспублікі Беларусь «Аб імянных прыватызацыйных чэках Рэспублікі Беларусь» і вышэйуказанага Закона.

У адпаведнасці з артыкулам 12 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб раздзяржаўленні і прыватызацыі ў Рэспубліцы Беларусь», квоты ў першую чаргу выкарыстоўваюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь па іх мэтаваму прызначэнню: жыллёвая квота (чэкі «Жыллё») — для прыватызацыі жылых памяшканняў у дамах дзяржаўнага і грамадскага жыллёвага фонду; квота на маёмасць дзяржаўных прадпрыемстваў (чэкі «Маёмасць») — для набыцця прыватызуемых дзяржаўных аб'ектаў.

У адпаведнасці з Палажэннем аб парадку абмену імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё» на чэкі «Маёмасць», пры немагчымасці выкарыстання чэкаў «Жыллё» для прыватызацыі жылых памяшканняў яны маглі быць пераафармлены на чэкі «Маёмасць» пры іх налічэнні.

Палажэннем аб парадку пераафармлення чэкаў «Маёмасць» на чэкі «Жыллё» (зарэгістравана ў Рэестры дзяржаўнай рэгістрацыі 30 ліпеня 1996 г. № 1527/12) грамадзянам прадастаўлялася магчымасць зваротнага пераафармлення на чэкі «Жыллё» тых чэкаў «Маёмасць», якія раней былі атрыманы імі ў абмен на чэкі «Жыллё». Чэкі «Маёмасць», атрыманыя грамадзянамі на іншых падставах, пераафармленню на чэкі «Жыллё» не падлягаюць.

Для выкарыстання чэкаў «Маёмасць» па мэтаваму прызначэнню вам неабходна звярнуцца ў адасобленае падраздзяленне ААБ «Беларусбанк» па месцы жыхарства. Там маюцца праспекты эмісіі акцый адкрытых акцыянерных таварыстваў, у якіх змяшчаецца інфармацыя аб характары дзейнасці і фінансавым стане кожнага акцыянернага таварыства з указаннем іх адрасоў і тэлефонаў, а таксама даведкі аб прыпадаючым на адну акцыю кошце маёмасці акцыянернага таварыства. Пасля азнаямлення з гэтай інфармацыяй вы зможаце зрабіць свой выбар і абмяняць чэкі «Маёмасць» на акцыі адкрытых акцыянерных таварыстваў. Чэкі «Маёмасць», акрамя выкарыстання іх па мэтаваму прызначэнню, можна таксама прадаць, падарыць, завяшчаць».

Аўто і злачынства

НАЕХАЎ І ЎЦЁК

Пад Баранавічамі ноччу аўтамабіль «Фольксваген-Пасат» збіў трох чалавек: жыхарку вёскі Антонава і яе дачок. Пенсіянерка памерла ў бальніцы, дваццацігадовая дачка загінула на месцы, а старэйшая атрымала пералом нагі. П'янага вадзіцеля знайшлі па пашкоджанай аўтамашыне каля дома ў Баранавічах.

АБ'ЕХАЎ МЫТНЮ

У Кобрынскім раёне, каля вёскі Магдалін, праверылі мікрааўтобус, які быў загружаны замежнай касметыкай. Груз прыбыў з Украіны ў аб'езд мытні. Вадзіцель аўтамашыны заявіў, што ён не мае да тавару ніякага дачынення. Груз на суму 110 млн рублёў канфіскаваны на карысць дзяржавы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

МАЁНТАК ЗА ТЭАТР!..

На нашай зямлі шмат што трымалася на энтузіязме людзей, якія яе вельмі любілі. Прынамсі, з яго сто гадоў таму пачынаўся прафесійны беларускі тэатр...

Тата ды мама, тры дачкі, сябры сям'і ды мясцовыя сяляне — вось вам і трупа для таго, каб ставіць спектаклі. Татам быў не хто іншы, як Ігнат Буйніцкі. Беларускі шляхціч, якому было, відаць, сумнавата ад звычайнага жыцця ў маёнтку, у фальварку Палівачы на Полаччыне, дзе ён нарадзіўся і дзе потым жыла яго сям'я. Забаву прыдумалі сабе самі — хатні тэатр. Ладзілі беларускія вечарынкі, дзе кожны мог праявіць сябе — хто ў якасці спевака ці танцора, хто ў якасці акцёра. Тата, натуральна, быў галоўней за ўсіх. Рэжысёр значыць. Не, ён, канешне, як і належала шляхцічу, атрымаў прыстойную адукацыю, прафесію землямера. Але для сваёй краіны зрабіў справу больш значную — стаў стваральнікам першага прафесійнага беларускага тэатра, акцёрам і рэжысёрам. Але тады, калі з народных крыніц браў багацце песень і танцаў, калі ствараў знаёмыя вобразы ў сваіх незвычайных пастаноўках, калі з падручных сродкаў рабіліся дэкарацыі і шыліся касцюмы, — няўжо хтосьці мог падумаць, што аматарства перарасце ў сапраўдны тэатр?

Трупа Буйніцкага ўзнікла ў 1907 годзе і так хутка набыла вядомасць, што нават пачала гастраляваць. Сярод людзей пайшла слава пра «народны тэатр», які праз якія тры гады можна было пабачыць на гастролях у Слуцку, Полацку, Нясвіжы, Клецку... Летам 1911 года першая беларуская трупа пад кіраўніцтвам Ігната Буйніцкага пабывала ў Мінску. Да таго часу яна ўжо набыла шырокую вядомасць у Вільні і нават Пецярбургу яе выдатна прымалі. А 25 і 26 чэрвеня ў мінскай тэатральнай зале «Парыж» паказала спектаклі «Па рэвізіі» Крапіўніцкага і «Модны шляхцюк» Каганца. Паглядзець іх маглі мясцовыя моднікі — заможныя людзі, квіткі для іх прадаваліся па зусім немалой цане. Але гэты тэатр быў даступны і бедным студэнтам — для іх квіткі прадаваліся значна танней. Вось што значыць дэмакратычнае мастацтва ў дзеянні!

Мастацтва патрабуе ахвяраў: гэтую ісціну шляхціч Буйніцкі спасцігаў на ўласным вопыце — тэатр аказаўся справай дарагой. Гастролі прынеслі такія страты, што яму давялося прадаць Палівачы і ўвогуле прыпыніць выступленні. У 1913 годзе Ігнат Буйніцкі распусціў трупу. Але яна аднаўлялася — справу зараджэння беларускага тэатра было ўжо не стрымаць...

Паўліна Мядзёлка ва ўспамінах аб гэтым тэатры пісала: «Незабыўнае ўражанне зрабіла на мяне першая беларуская вечарынка ў Вільні 12 лютага 1910 года, дзе выступала трупа Ігната Буйніцкага і хор пад кіраўніцтвам кампазітара Рагоўскага... Выступленне трупы Ігната Буйніцкага ўсхвалявала і Янку Купалу. Трэба зазначыць, што ў той час, акрамя вядомых п'ес Дуніна-Марцінкевіча, не было арыгінальнага сцэнічнага матэрыялу. Буйніцкі карыстаўся перакладамі ўкраінскіх п'ес і інсцэніроўкамі апавяданняў Элізы Ажэшкі «У зімовы вечар» і «Хам». Гэта навяло Купалу на думку стварыць арыгінальную беларускую п'есу, сугучную сучаснасці».

П'еса такая з'явілася. І не толькі адна яна. З'явіліся людзі, якім быў патрэбны беларускі тэатр, узнікла Першае Таварыства беларускай драмы і камедыі. Артысты трупы Буйніцкага склалі аснову Першага беларускага тэатра. Ён жыве сёння і носіць імя Янкі Купалы.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Здарэнне, крымінал

МУЖЧЫНУ ВЫЦЯГНУЛІ З... БАЛОТА

А пятай гадзіне вечара ад дзяжурнага РАУС у дзяжурную часць аддзела аховы паступіла інфармацыя аб тым, што ў забалочанай частцы ракі Мухавец, недалёка ад Кобрынскай цэнтральнай бальніцы, знаходзіцца невядомы мужчына, які самастойна не можа выбрацца з вады. Да месца здарэння былі накіраваныя дзве машыны дзяжурных нарадаў мясцовага падраздзялення аховы. Пасля прыбыцця на месца інфармацыя пацвердзілася: прыкладна на адлегласці 20 метраў ад берага тануў мужчына.

Не марудзячы ні секунды, старшына Седун і старшы сяржант Харавец **(на фота)** кінуліся ў ледзяную ваду і паплылі да тапельца. Перамяшчэнне па вадзе ўскладнялася яшчэ і тым, што зусім неглыбокая пойма старога рэчышча Мухаўца была такой глеістай, што кожны рух нагадваў запаволеныя здымкі. Але, на шчасце, міліцыянерам удалося своечасова дабрацца да няшчаснага і, абвязаўшы буксіровачнымі тросамі службовых аўтамабіляў, яго практычна ў непрытомным стане пацягнулі да берага.

Сіламі двух нарадаў мужчына быў выцягнуты з вады і неадкладна дастаўлены ў прыёмны пакой Кобрынскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Ужо на наступную раніцу, 12 сакавіка, асобу выратаванага ўдалося высветліць. Ён з цяжкасцю ўспомніў сваё прозвішча і пакуль яшчэ не ў стане патлумачыць, пры якіх абставінах аказаўся ў вадзе. 44-гадовага непрацуючага жыхара Кобрына ў той вечар чакалі дома жонка і сын — інвалід I групы.

Марына ЭВЕРСМАН.

«ШЭРАЯ» ГАРЭЛКА

Больш за паўтары тысячы бутэлек гарэлкі, якая не мела акцызных марак Беларусі, захоўвала ў сваім гаражы пінчанка.

Праваахоўнікі канфіскавалі гэты тавар, які «заважыў» на 20 мільёнаў рублёў. Таксама ў гаражы чакала свайго часу спіртазмяшчальная вадкасць, якую знайшлі супрацоўнікі ГУУС Мінгарвыканкама ў непрацуючага жыхара Белаазёрска. І гэты чалавек панёс значныя «расходы»: у яго было канфіскавана 1300 літраў «гаручага» на агульную суму 13 мільёнаў рублёў.

Аляксей ЦІТОЎ.

АКЦЫЗНЫХ МАРАК НЯМА — КАНТРАБАНДА

Каля вёскі Прылукі, што ў Брэсцкім раёне, міліцыянеры прыпынілі «Аудзі-100», за рулём якой сядзела беспрацоўная, і знайшлі там 760 бутэлек украінскай гарэлкі ды тры тысячы пачкаў замежных цыгарэт. Тавар не меў акцызных марак Рэспублікі Беларусь і пайшоў у даход дзяржавы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ГОРА-НАСТАЎНІК АПЫНУЎСЯ Ў СЛЕДЧЫМ ІЗАЛЯТАРЫ

За што? За тое, што, працуючы ў адной са школ Гомельскага раёна, як гаворыцца, паціху вучыў дзяцей «не ў той бок». А менавіта: калі школьнікі аздараўляліся ў санаторыі (а ён таксама знаходзіўся там), педагог, напэўна, вырашыў «дабавіць» ім настрою і наладзіў такі «эксперымент» па ўжыванню... наркотыкаў. Сумнавядомую траўку яны не курылі, а вырабілі з яе вадкі сурагат, які моцна біў па мазгах. А тут нечакана ў самы цікавы момант «балдзёжу» і з'явілася міліцыя. Узбуджана крымінальная справа.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ПАРТРЭТ КІЛЕРА Ў СТАЛІЧНЫМ ІНТЭР'ЕРЫ

У Мінску за мінулы год да крымінальнай адказнасці прыцягнуты 93 забойцы, на рахунку якіх 90 чалавечых жыццяў.

Паводле звестак сталічнай пракуратуры, сярод мінскіх кілераў пераважаюць мужчыны. Прадстаўнікі моцнай паловы складаюць крыху больш за 77 працэнтаў ад агульнай колькасці забойцаў. Амаль палову (44 працэнты) крывавых злачынстваў здзейснілі асобы ва ўзросце ад 30 да 45 гадоў. Больш за 60 працэнтаў кілераў — непрацуючыя, 75 працэнтаў — знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення, 41 працэнт — раней судзімыя.

Праведзены пракуратурай аналіз сведчыць, што найчасцей прычынамі забойстваў былі сваркі (53 працэнты выпадкаў) і сямейна-бытавыя разборкі (28 працэнтаў). Самай распаўсюджанай зброяй сталічных кілераў былі нажы і іншыя прадметы такога кшталту. Прыкладна 75 працэнтаў забойстваў былі ўчынены ў жыллёвых памяшканнях, амаль палова — у перыяд з 18 да 24 гадзін.

Нягледзячы на тое, што 60 працэнтаў гэтых злачынстваў былі здзейснены ва ўмовах невідавочнасці, летась нераскрытымі ў сталіцы засталіся толькі 2 забойствы. Для параўнання, у 2005 годзе ў Мінску было зарэгістравана 117 забойстваў, з якіх не ўдалося раскрыць 10 злачынстваў з лятальным зыходам.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Мартаўскія каты»

Пад такой назвай у мінскім Палацы мастацтваў адкрылася традыцыйная дабрачынная міжнародная выстаўка твораў выяўленчага мастацтва. Настрой праз жывапіс, скульптуру, фатаграфію і графіку якраз адпавядае гэтай пары года — вясна, каханне, джаз. Сабраныя сродкі ад прададзеных твораў пойдуць на падтрымку маламаёмным і хворым мастакам. Арганізатар акцыі — творчая мастакоўская суполка «Майстра».

На здымку: першы дзень работы выстаўкі.

Гарачы тэлефон «Звязды»

Тэрмін перарэгістрацыі можа быць падоўжаны, калі грамадзянін хварэў або адсутнічаў у краіне

Недзе ў канцы мінулага года я сустрэў інфармацыю, што, аказваецца, чэкі «Маёмасць» мянялі на чэкі «Жыллё» і наадварот. З жахам для сябе даведаўся, што чэкі «Маёмасць» можна было абмяняць ажно да 1 студзеня 2007 года. Дык чаму ж у гарвыканкаме мне пра тое ні слова не сказалі, наадварот, адказалі, маўляў, позна ўжо? Далей прачытаў, што з 1 студзеня гэтага года выдача і перарэгістрацыя чэкаў «Жыллё» спынена. Аднак для асобных грамадзян, згодна з заканадаўствам, гэта працэдура можа быць падоўжана, але — па рашэнню суда. Я вас вельмі прашу патлумачыць больш падрабязна: што гэта могуць быць за «асобныя грамадзяне» і ў якіх сітуацыях па рашэнню суда працэдура перарэгістрацыі можа быць падоўжана? Я пенсіянер, ветэран працы, інвалід II групы і такія вось сітуацыі для мяне і майго здароўя вельмі хваравітыя і балючыя.

Валерый Міхайлавіч СІДАРЭНКА, *г. Бабруйск.*

Зварот чытача па просьбе рэдакцыі быў разгледжаны ва ўпраўленні жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

«Па пытанню абмену чэкаў «Маёмасць» на чэкі «Жыллё» тлумачым наступнае. Дзеючымі нарматыўнымі прававымі актамі прадугледжваўся не абмен, а магчымасць вываду з агульнай сумы чэкаў «Маёмасць» часткі ўключанай у яе сумы жыллёвай квоты (чэкаў «Жыллё»), налічанай канкрэтнаму грамадзяніну ва ўстаноўленым парадку.

У адпаведнасці з пунктам 1.1 Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 07.06.2005 г. № 6 «Аб упарадкаванні абарачэння і выкарыстання імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё», імянныя прыватызацыйныя чэкі «Жыллё», у тым ліку выведзеныя з сумы чэкаў «Маёмасць», падлягалі перарэгістрацыі ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Ашчадны банк «Беларусбанк» да 1 студзеня 2007 года. Па заканчэнні вышэйуказанага тэрміну перарэгістрацыя чэкаў «Жыллё» спынена. Чэкі «Жыллё», якія не перарэгістраваны ў гэты тэрмін, лічацца несапраўднымі і падлягаюць здачы ў мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы для знішчэння.

Дадзеным Дэкрэтам прадугледжана, што калі перарэгістрацыя чэкаў «Жыллё» немагчымая з-за хваробы іх уласніка ці адсутнасці яго ў Рэспубліцы Беларусь, указаны тэрмін падаўжаецца на час хваробы або адсутнасці. Асобам, што не перарэгістравалі належныя ім чэкі «Жыллё» па іншых уважлівых прычынах, гэты тэрмін можа быць падоўжаны па рашэнню суда, калі іск аб гэтым прад'яўлены ў суд на працягу агульнага тэрміну іскавой даўнасці».

З навасельлем!

Вяслярны канал да прыёму спартсменаў і гасцей гатовы

Новы вяслярны канал у Брэсце вызначаны асноўнай базай для падрыхтоўкі беларускіх весляроў да Алімпіяды ў Пекіне. На мінулым тыдні дзяржаўная камісія прыняла ў эксплуатацыю аб'екты інфраструктуры Брэсцкага абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па веславанню.

Праведзена поўная рэканструкцыя воднай часткі канала. Літаральна за мінулы год на беразе выраслі карпусы гасцініцы на сотню месцаў, судзейска-адміністрацыйны блок, корпус для захавання лодак, медыцынскі цэнтр, плавальны і вяслярны басейны. Побач з каналам абсталявана зона адпачынку для гараджан. Тут ёсць пляж, выратавальная станцыя, лыжароллерная траса, гульнявыя пляцоўкі для валейбола і тэніса. Кошт праекта склаў крыху больш за два дзесяткі мільёнаў долараў.

Яна СВЕТАВА.

Фота БЕЛТА.

Абмяркуем?

Хто шукае...

Не ведаю, як іншым, а мне — набалела. Радыё, тэлебачанне, друкаваныя СМІ проста забіты рэкламай кшталту — купляйце білеты і ледзь не заўтра атрымаеце ўсё: дыяманты, золата, шыкоўныя кватэры, катэджы...

Я разумею: ёсць і былі латарэі, ёсць людзі, якія іх куплялі, купляюць і будуць... Іх справа — хай сабе трацяць грошы, хай спадзяюцца на ўдачу. Але падштурхоўваць усіх, замбіраваць, «укручваць» у мазгі ідэю «раптоўнага багацця», па-мойму, нельга.

Да чаго дайшло — наглядзеўшыся, наслухаўшыся рэкламных ролікаў, дзеці (малыя) выцягваюць з бацькоў апошнія грошы, спадзяюцца, чакаюць... Чаго? Ды, прабачце, халявы...

Усе мае знаёмыя абураюцца гэтым, кажуць, як добра было б, каб з гэткім размахам, з выдумкай агітавалі за здаровы лад жыцця, запрашалі людзей на каткі, у басейны, у лазні, на канцэрты, у тэатры... Заклікалі працаваць, узбагачацца духоўна, а не спадзявацца ўвесь час на тое, што не сёння дык заўтра нешта з неба табе зваліцца і ты зажывеш — у шыкоўнай кватэры, у цэнтры сталіцы... Ну і гэтак далей.

А. ХАРЛАН, *Мінск.*

У суд Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці паступіла заява аб прызнанні памерлым **САЛІМАВА Саіда Джалолавіча**, 6 лістапада 1962 года нараджэння, ураджэнца в. Кызыл-Кала Камуністычнага раёна Курган-Цюбінскай вобласці Рэспублікі Таджыкістан, апошняе месца жыхарства: в. Ракітаўшчына Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці, які ў ліпені 2001 года пайшоў з дому і да цяперашняга часу звестак аб ім няма.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра С.Д. Салімава, паведаміць іх суду Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці на працягу двух месяцаў з моманту апублікавання аб'явы.

Утерянную квитанцию формы СУ1 серия ГС № 9210365 Представительства ЗАСО ТАСК города Минска считать недействительной.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

14 сакавіка 2007 г. № 11 (65)

ЕСТЬ ВОПРОС

А МЕЛЬНИЦА — ЧЬЯ?

В редакцию пришло письмо от жителей деревни Старое Село Хотежинского сельсовета Минского района, в котором они просят помочь решить вопрос о передаче местной мельницы на баланс сельского Совета.

История с географией

Мельница в Старом Селе, которая обслуживает население в радиусе 15 километров, когда-то принадлежала совхозу «Птичь». Сейчас ее хозяином является учреждение «Республиканский центр олимпийской подготовки конного спорта и коневодства» (РЦОПКСиК). «Много лет верой и правдой служила она (мельница. — **Авт.**) населению Хотежинского сельсовета, — сказано в письме. — При расформировании бывшего совхоза «Птичь» все здания были переданы РЦОПКСиК бесплатно». Далее говорится, что Хотежинский исполком выходил с просьбой к директору РЦОПКСиК передать мельницу на баланс исполкома, но директор заинтересован в ее продаже. «В деревне всё население держит подсобное хозяйство и без мельницы им просто не обойтись. Мы очень обеспокоены этим положением и убедительно просим помочь решить вопрос о передаче мельницы на баланс Хотежинского сельского Совета». Письмо подписали 19 человек, в том числе трое депутатов сельского Совета и староста деревни. Был в письме и постскриптум, в котором уточнялось, что с 17 февраля мельница вообще перестала работать, т.к. РЦОПКСиК не продлил мельнику контракт.

По словам председателя Хотежинского сельского Совета Николая Чирика, на его подшефной территории находится 16 населенных пунктов, в которых проживает 2500 человек, и всего на сегодня там насчитывается 1145 частных подворий. Естественно, в каждом имеется какая-то живность (коровы, свиньи, домашняя птица). «Свинью зерном кормить не будешь — зерно надо смолоть, — объясняет Николай Петрович. — А мельница на весь сельсовет у нас одна, в Старом Селе. Потребность в мельнице — временное явление. Когда-то у наших людей на подворьях было 300 коров, почти тысяча свиней. Сельсовет у нас пригородный, количество прописанного населения год от года увеличивается. Но сельским хозяйством занимаются все меньше. Фермерам же гораздо выгоднее приобрести специализированную технику для качественного размола. Это если говорить о перспективе, но сегодня местным жителям мельница еще нужна».

Вопрос о передаче мельницы (казалось бы, довольно простой) сильно осложняется тем фактом, что земля, на которой она (мельница) находится, принадлежит одному хозяйству (агрокомбинату «Ждановичи»), а само здание числится на балансе другого (РЦОПКСиК). Оба предприятия имеют разную форму собственности (коммунальную и республиканскую) и относятся к разным министерствам: сельского хозяйства и продовольствия, а также спорта и туризма.

— В 1998 году земли отстающего совхоза «Птичь» передали нам, — взялся объяснить всю предисторию проблемы заместитель генерального директора по производству РЦОПКСиК Сергей Шевчик. — Мы подчиняемся Министерству спорта и туризма. Раз все эти земли оказались в республиканской собственности, значит, дотации на сельхозпроизводство мы могли получать только из республиканского бюджета. Но в Министерстве спорта и туризма средств на сельское хозяйство не предусмотрено. В итоге мы постоянно терпели убытки, вместо того, чтобы развиваться, хозяйство стало разваливаться.

(Окончание на 2-й стр. «МС».)

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

СТАРШЫНЯ СТАРШЫНЮ РАЗУМЕЕ...

Гэта толькі на першы погляд падаецца, што паўнамоцтваў у сельскіх Саветаў шмат. У рэальнасці, магчымасці яго часам абмежаваныя па прычынах фінансавых. А вось абавязкаў у старшыні — не пералічыць, таму што займацца прыходзіцца літаральна ўсім. А дзе знайсці сродкі, якія часам так неабходны? Самы правільны і распаўсюджаны шлях — звярнуцца па падтрымку да старшыні гаспадаркі. Атрымліваецца, што эфектыўная дзейнасць органаў самакіравання пярвічнага звяна залежыць у вялікай ступені ад паразумення з кіраўнікамі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

Старшыня Нёманскага сельскага Савета Яніна МАЙСЮК і кіраўнік СВК «Наднёманскі» Міхаіл КРУКОЎСКІ.

Старшыня Нёманскага сельскага Савета Яніна Майсюк на пасадзе ўжо васемнаццаты год. Былая настаўніца, потым — намеснік дырэктара школы, старшыня камісіі па справах непаўналетніх... Зараз яна, здаецца, знайшла сваё месца. Дваццаць два населеныя пункты, у якіх, сярод іншых, жывуць 73 адзінокія чалавекі сталага ўзросту, праблемныя сем'і, асобы з асацыяльнымі паводзінамі — і за ўсё гэта адказвае Яніна Майсюк. Кожны дзень яна сутыкаецца з надзённымі пытаннямі ў сваіх вёсках.

— Усе ведаюць, што ў сельскім Савеце вырашаюцца праблемы па ўсіх напрамках — сацыяльнае абслугоўванне, ахова здароўя, выхаванне і адукацыя. Быць ва ўсіх «кропках» кожны дзень немагчыма, таму ў іх працуюць старасты, якія з'яўляюцца надзейнымі маімі памочнікамі. Кіраваць тэрыторыяй можна, трэба толькі правільна арганізаваць людзей, — кажа яна, і дадае: — Не сакрэт, што фінансаў у сельскіх Саветах бывае недастаткова, таму абапіраемся мы на супрацоўніцтва з сельскімі гаспадаркамі. Іх у нашай мясцовасці тры.

Што могуць зрабіць кіраўнікі СВК? Іх гаспадаркі забяспечваюць людзей транспартам для падвозкі дроў, дастаўляюць корм для жывёлы. У апошні час з-за ўраганаў актуальнай стала праблема старых дрэў — у Нёманскім сельсавеце трэба спілаваць 156 такіх, і за гэта таксама адказваюць работнікі сельгаспрадпрыемстваў.

І вырашэнне гэтых пытанняў залежыць ад чалавечага фактару — ці знойдуць агульную мову старшыня сельскага Савета з кіраўніком гаспадаркі. Да таго ж людзі прызвычаіліся, што сельскія Саветы разглядаюць пытанні, якія часам выходзяць за рамкі іх паўнамоцтваў.

...Старшыня СВК «Наднёманскі» Міхаіл Крукоўскі таксама не аддзяляе праблемы сельсаветаў і работнікаў уласнага прадпрыемства. Ён лічыць, што супрацоўніцтва паміж мясцовай уладай і гаспадаркай павінна прыносіць карысць абодвум бакам:

— У нас наладжана дзелавое і адначасова чалавечае паразуменне. Сёння ў сельскіх Саветах няма такіх магчымасцяў, як у прадстаўнікоў вытворчай сферы, — у першую чаргу я маю на ўвазе наяўнасць фінансавых сродкаў. Аднак трэба разумець, што мы робім агульную справу, таму гаспадарка вырашае пытанні, якія звязаны з матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем вяскоўцаў. А мясцовая ўлада дапамагае нам дакладна ўбачыць праблемы, якія мы не заўважалі раней.

У тым ліку і ў сувязі са зваротамі грамадзян сродкі сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва пайшлі на рэканструкцыю Дамоў культуры і лазнева-пральнага камбіната. Гаспадарка ўкладвае грошы і ў медыцынскае абслугоўванне. Хутка «Наднёманскі» распачне ўзвядзенне культурна-забаўляльнага цэнтра.

Трэба адзначыць, што пакуль не ўсе гаспадаркі могуць дазволіць сабе раскошу выдаткоўваць грошы на карысць вяскоўцаў. У гэтым сэнсе Нёманскаму сельсавету пашанцавала:

— Мы намагаемся рабіць усё, што ад нас залежыць, амаль без выключэння. Няма розніцы, школа, арганізацыя або толькі адзін чалавек мае патрэбу, напрыклад, у набыцці спартыўнага інвертару. Дарэчы, развіццю спорту ў мясцовасці мы надаём асаблівую ўвагу, і першыя вынікі ўжо ёсць — валейбольная каманда перамагае на спаборніцтвах.

Так і працуюць поруч Яніна Майсюк і Міхаіл Крукоўскі. Дарэчы, як мы даведаліся пасля гутаркі, Нёманскі сельсавет і СВК «Наднёманскі» лічацца аднымі з лепшых у Уздзенскім раёне. «Сёння трэба зрабіць крыху больш, чым учора, а заўтра — крыху больш, чым сёння — гэтым прынцыпам мы і кіруемся ў сваёй дзейнасці», — кажа Міхаіл Крукоўскі.

Дзмітрый АЛЬФЕР.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.
Уздзенскі раён.

АДКРЫТЫ ДЫЯЛОГ

Аркадзь КАРПУЦЬ, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:

«ТРЭБА НЕ ПРОСТА ЎЗЯЦЬ, А МЕНАВІТА ЗАРАБІЦЬ ГРОШЫ ТАМ, ДЗЕ ІХ РАНЕЙ НІХТО НЕ ЗАРАБЛЯЎ»

Як мы паведамлялі, старшынёй Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў на першай арганізацыйнай сесіі дэпутацкага корпуса 25-га склікання быў выбраны Аркадзь Карпуць. Такі давер Аркадзю Іванавічу аказаны ўжо ў чацвёрты раз, аднак, мяркуючы па нашай гутарцы, ён не збіраецца абапірацца толькі на праверэныя формы ў рабоце прадстаўнічай улады, а мае намер задзейнічаць новыя падыходы.

Фота Яраслава ВАНКОВІЧА.

— Чым, на вашу думку, будзе адметнай праца дэпутацкага корпуса мясцовых Саветаў гэтага склікання?

— Найперш тым, што прыняты вельмі важны дакумент, які ў наступныя гады будзе вызначальным для работы пярвічнага звяна Саветаў дэпутатаў і выканаўчых камітэтаў. Гэта Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва».

Сярод важнейшых палажэнняў гэтага дакумента — вырашэнне фінансава-эканамічных пытанняў і, перш за ўсё, вызначэнне парадку фарміравання бюджэтаў пярвічнага ўзроўню. З дакладным пералікам даходных крыніц і, адпаведна, расходных паўнамоцтваў. На што ж можна разлічваць? Як зменіцца даходная база бюджэтаў пярвічнага ўзроўню? Гэтыя пытанні мы нядаўна абмеркавалі на семінары з удзелам старшынь усіх раённых Саветаў Гродзеншчыны і работнікаў фінансавых службаў, які адбыўся на базе Абухаўскага сельскага Савета. Пэўныя падлікі сведчаць, што ў залежнасці ад размяшчэння на той ці іншай тэрыторыі прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, ад іх дзейнасці даходная частка бюджэту некаторых сельскіх Саветаў будзе сфарміраваная на 14 працэнтаў, а ёсць і такія, дзе больш чым на 30 працэнтаў.

Я падтрымліваю ініцыятыву старшыні Лідскага раённага Савета дэпутатаў Уладзіміра Цімчанкі правесці ў гэтым раёне эксперымент па выпрацоўцы механізма выканання прэзідэнцкага Указа № 21, у прыватнасці той яе часткі, што датычыцца сістэмы фарміравання бюджэту Савета пярвічнага узроўню. На Лідчыне моцныя старшыні сельскіх і пасялковых Саветаў, вопытны кіраўнік раённага Савета.

Безумоўна, пройдзе пэўны час, і мы павінны будзем разам з фінансавымі органамі, верагодна, па выніках паўгоддзя правесці карэкціроўку бюджэтных пазіцый, каб ужо сёлета перайсці на вызначаныя кіраўніком дзяржавы прынцыпы фарміравання бюджэту сельскіх і пасялковых Саветаў.

Зрэшты, пытанне не толькі ў гэтым, але і ў псіхалогіі многіх нашых старшынь сельскіх і пасялковых Саветаў: маўляў, дайце нам грошы і ўсе праблемы мы вырашым. На самай справе гэта далёка не так. У роўных умовах ёсць шмат ініцыятыўных кіраўнікоў і, на жаль, вельмі многа песімістаў, якія не ўмеюць працаваць на перспектыву. Менавіта прэзідэнцкі Указ № 21 дае правы і магчымасці Саветам пярвічнага ўзроўню не проста ўзяць, а менавіта зарабіць грошы там, дзе іх раней ніхто не зарабляў. Гэты дакумент падрыхтаваны з улікам перспектывы і, безумоўна, разлічаны на кадры з гібкім складам розуму. І, канешне, з пачуццём адказнасці за становішча спраў на сваёй тэрыторыі.

Скажам, такая заўсёды надзённая справа, як навядзенне парадку на зямлі. Канешне, нярэдка яна стрымліваецца з-за фінансавых цяжкасцяў. Аднак у гэтай сітуацыі адны кіраўнікі мясцовых Саветаў шукаюць выйсце, аб'ядноўваюць намаганні вытворчых калектываў і насельніцтва, а іншыя проста апускаюць рукі і распісваюцца ва ўласнай бездапаможнасці. У адным месцы — і кветкі ля будынка мясцовай улады, і акуратна ўнутры памяшкання, ёсць уся неабходная тутэйшым жыхарам даведачная інфармацыя, у іншым — усё абы як...

Кіраўнікі Саветаў усіх узроўняў павінны дасканала валодаць становішчам спраў на прадпрыемствах, у арганізацыях і ўстановах, аналізаваць, на якую суму прададзена тавараў на кожнага жыхара, у якіх аб'ёмах аказаны на гэтых тэрыторыях паслугі «бытоўкі», паштовай, тэлефоннай сувязі, як вырашаюцца транспартныя праблемы, актыўна ўзаемадзейнічаць з рознымі службамі. І не толькі ведаць існуючыя праблемы, але і аператыўна ўплываць на іх вырашэнне.

— Аднак, відавочна, пры ўсім жаданні старшыня сельскага Савета не можа адказваць літаральна за ўсё, што адбываецца на гэтай тэрыторыі...

— І не павінен. Указам кіраўніка дзяржавы прадугледжаны шэраг мераў па вызваленню Саветаў пярвічнага ўзроўню ад неўласцівых ім функцый. Да прыкладу, аблвыканкамам у шасцімесячны тэрмін даручана правесці інвентарызацыю сістэм водазабеспячэння і водаадводу, а таксама дарог сельскіх населеных пунктаў і іншых аб'ектаў нерухомай маёмасці з мэтай перадачы спецыялізаваным арганізацыям. І ў мае абавязкі старшыні абласнога Савета дэпутатаў уваходзіць разам з выканаўчай уладай арганізаваць выкананне гэтай задачы.

— Якія пытанні будуць прыярытэтнымі для абласнога Савета дэпутатаў?

— Зыходзячы з выключнай кампетэнцыі Саветаў дэпутатаў, наша дзейнасць будзе накіравана ў першую чаргу на арганізацыю выканання прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця і бюджэту. На першы план сёння выходзяць пытанні эканоміі і эфектыўнага выкарыстання энергарэсурсаў, матэрыяльных сродкаў, бюджэтных асігнаванняў. Востра стаяць праблемы пераходу на выкарыстанне мясцовых відаў паліва, а таксама зніжэння энергаёмістасці прадукцыі, і пры гэтым, незалежна ад росту цэн, прагнозныя паказчыкі павінны быць выкананы. Так, мы зацвердзілі бюджэт, кантрольныя паказчыкі па кожнай галіне. Але наколькі рацыянальна і эфектыўна працуем? Гэтыя пытанні будуць у цэнтры ўвагі нашых рабочых органаў — сесій, пасяджэнняў прэзідыума і пастаянных камісій. Будзем аналізаваць, праводзіць сумесныя з выканаўчым камітэтам праверкі і, калі жыццё запатрабуе, прымаць аператыўныя рашэнні па змяненню асобных пазіцый бюджэту.

І другая, не менш важная задача — шукаць дадатковыя крыніцы папаўнення бюджэту. У кампетэнцыі Саветаў прымаць мясцовыя зборы, падаткі. Але адны шукаюць дадатковыя крыніцы, а другія аб гэтым не клапоцяцца.

— Пошук варыянтаў папаўнення бюджэту ў асноўным будзе арыентаваны на нейкія фіскальныя функцыі?

— Не выключаны тыя крыніцы, што прымяняліся раней, але трэба думаць і аб іншых. Да прыкладу, згодна з Указам аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання, у бюджэты пярвічнага ўзроўню залічваюцца даходы ад здачы ў арэнду маёмасці, што знаходзіцца на тэрыторыі гэтага Савета, ад рэалізацыі безгаспадарнай маёмасці... Аграгарызм, Аўгустоўскі канал, падтрымка прадпрымальніцтва... Тут яшчэ, як кажуць, неўзаранае поле для стварэння такіх умоў, якія б стымулявалі дзелавую ініцыятыву і, адпаведна, папаўнялі бюджэт падаткамі.

— На першай арганізацыйнай сесіі абласнога Савета дэпутатаў 25-га склікання старшыня аблвыканкама Уладзімір Саўчанка прапанаваў перадаць яму для разгляду і прыняцця мераў тыя пытанні, якія былі ўзняты выбаршчыкамі падчас перадвыбарнай кампаніі...

— Мы ўжо абагульняем гэтыя просьбы, заўвагі і прапановы выбаршчыкаў, каб затым разам з выканкамам іх разгледзець і, усё, што магчыма, вырашыць.

Аб тым, што выканаўчая ўлада зацікаўлена ў павышэнні ролі мясцовых Саветаў, сведчыць і наступны факт. Нядаўна рашэннем аблвыканкама было выдзелена 200 мільёнаў рублёў на аснашчэнне Саветаў і выканкамаў пярвічнага ўзроўню мадэмамі да камп'ютара, каб людзі не бегалі па інстанцыях, а на месцах па электроннай пошце атрымлівалі ад раённых службаў адпаведную інфармацыю.

Цяперашні састаў абласнога Савета ўяўляе сабой сплаў вопыту і маладосці, цалкам адлюстроўвае прафесійную і сацыяльную структуру нашага грамадства. Але я хачу актывізаваць работу дэпутатаў. Раней як было? Многія дэпутаты стараліся выступаць на сесіі, выходзячы са сваёй прафесійнай прыналежнасці. Калі настаўнік — узнімае праблемы адукацыі, аграрнік — сельскай гаспадаркі, урач — аховы здароўя. І гэта зразумела. Але ж ёсць адпаведныя галіновыя ведамствы, а дэпутат прадстаўляе выбарчую акругу, насельніцтва гэтай тэрыторыі. Таму стаўлю перад сабой задачу дабіцца, каб дэпутаты пастаянна сустракаліся са сваімі выбаршчыкамі, быў наладжаны прыём грамадзян. Каб дакладна працаваў механізм зваротаў выбаршчыкаў да дэпутатаў і рэагавання на іх з боку тых ці іншых службаў і арганізацый.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПАТРАБУЮ ІНВАЛІДНУЮ ГРУПУ!

МАГЧЫМА, ГЭТА АДБЫВАЕЦЦА НЕ АД «ДОБРАГА ЖЫЦЦЯ», АЛЕ Ў ЛЮБЫМ ВЫПАДКУ ЧАЛАВЕК, НАПЭЎНА, НЕ ПАВІНЕН ІМКНУЦЦА ДА ЎТРЫМАНСТВА

У рэдакцыю газеты часта звоняць людзі з глыбінкі: скардзяцца на дрэннае здароўе, на тое, што ім замяняюць або ўвогуле «не даюць» групу па інваліднасці, Пра магчымасці эфектыўнага лячэння, рэабілітацыі — ні слова. Калі сам журналіст пачынае падводзіць суразмоўцаў да гэтай думкі, злуюцца і не хочуць слухаць. Канешне, можна было б дапусціць, што ў вёсках, у малых гарадах людзі дрэнна валодаюць сітуацыяй. Аднак на самай справе яны надзвычай добра ведаюць, чаго дабіваюцца, імкнучыся «атрымаць групу».

Што гаварыць, калі ў апошні час і некаторыя гараджанкі спяшаюцца стаць шматдзетнымі маці зусім не таму, што «ўсё жыццё» марылі пра вялікую сям'ю і яе «выхаванне» — бадай, самую складаную работу. Яны ідуць на нараджэнне трэцяга дзіцяці, хоць ультрагукавое даследаванне выяўляе ў плода цяжкія парокі развіцця. Шматдзетнасць патрэбна гэтым жанчынам для хутчэйшага вырашэння жыллёвага пытання. А дзіця... Яго можна накіраваць пазней у спецыялізаваны інтэрнат.

Хранічныя захворванні маюць многія з нас. Але чамусьці ўсё менш тых, хто прыкладае ўсе намаганні, каб заставацца ў страі — быць адказным за сябе, сачыць за здароўем, працаваць, не абцяжарваць навакольных, у рэшце рэшт, ганарыцца тым, што ты не на «групе». Тым больш, у нас ёсць адпаведныя спецыялісты і медустановы, дзе здольны дапамагчы ў гэтым.

Паводле слоў галоўнага спецыяліста па медыцынскай экспертызе і рэабілітацыі Камітэта па ахове здароўя г. Мінска Валянціны ЯФІМЕНКА, ёсць людзі, не зацікаўленыя ў рэабілітацыі. «Кожны чацвёрты зварот у наш камітэт, — кажа яна, — гэта скарга, незадаволенасць чалавека тым, што яму змянілі або зняслі групу па інваліднасці, аднялі льготы».

У Мінску зарэгістравана каля 105 тысяч інвалідаў. Летась 11 228 з іх прайшлі ўрачэбны перагляд, у выніку чаго 14 працэнтаў хворых былі часткова рэабілітаваныя — атрымалі больш нізкую групу, а 5,9 працэнта ўвогуле пазбавіліся яе.

— Згодна з заканадаўствам, устанаўленне інваліднасці дае права на атрыманне цэлага шэрагу льгот, — кажа начальнік аддзела медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Ганна ЛУКІНА.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

КАБ ЛЮДЗЯМ ПАДАБАЛАСЯ

План Івянца гістарычна склаўся па традыцыйнай схеме: сетка вуліц разыходзіцца ад плошчы. Яна мае форму вялікага шматвугольніка, раней тут размяшчаліся гандлёвыя рады са шматлікімі крамамі. Кажуць, што гэтыя пабудовы разам з групай старых каменных дамоў разабралі ў сярэдзіне 70-х. З'явілася новае жыллё, былі ўзведзены сацыяльныя і вытворчыя аб'екты — змены адбыліся значныя. Аднак старажытны Івянец сваёй адметнасці ніколькі не згубіў, захаваў непаўторныя шарм і прыгажосць.

Кветкі — лепшая «візітоўка»

Гарадок вельмі дагледжаны — ва ўсякую пару года. Адразу відаць, што да навядзення парадку тутэйшыя жыхары ставяцца надзвычай сур'ёзна. Канешне, няма тут сталічнага шыку, ды ён проста не да месца, трэба захоўваць уласны каларыт.

— Знешні выгляд населенага пункта, стан дарог — адсюль пачынаецца знаёмства з мясцовасцю, — кажа старшыня Івянецкага пасялковага Савета Юрый Шарый. — Вельмі важна, якой будзе менавіта першая сустрэча. Кветкі — самая лепшая «візітоўка». Вельмі важна заўсёды захоўваць чысціню, парадак, утульнасць. Гэта стварае настрой у жыхароў і нашых гасцей.

На правядзенне добраўпарадкавання летась выдаткавана больш чым 1 мільярд рублёў. Новы выгляд набылі цэнтральныя вуліцы, дзе было пакладзена больш за 5 тысяч «квадратаў» тратуарнай плітак, устаноўлена каля кіламетра новай панэльнай агароджы (яшчэ 1 тыс. м зрабілі на падворках ветэранам вайны, пенсіянерам, малазабяспечаным сем'ям). Таксама ўладкавалі 20 альпійскіх горак, высадзілі амаль тысячу дрэў і 15 тыс. кветак. Цікава, што кожная з тутэйшых вуліц мае свайго «гаспадара» — замацавана за канкрэтнай арганізацыяй альбо прадпрыемствам, якія старанна даглядаюць «падшэфную тэрыторыю».

У Івянцы працуе ўласнае камунальнае падраздзяленне, якое ўкамплектавана ўсёй неабходнай тэхнікай. Таму з аператыўным выкананнем неабходных работ праблем не ўзнікае — напрыклад, як адзначыў Юрый Шарый, падчас снегападаў камунальнікі выязджаюць на расчыстку дарог і тратуараў ужо ў пяць гадзін раніцы. З такім разлікам, каб людзі маглі без цяжкасцяў да працы дабрацца. Смецце з падворкаў (у пасёлку больш чым 1,7 тысячы прыватных дамоў) вывозіцца рэгулярна, па спецыяльнаму графіку — з усімі прадпрыемствамі і жыхарамі камунальнікі заключылі адпаведныя дагаворы. Дарэчы, многія тутэйшыя сядзібы па-свойму вельмі адметныя — тут і сучасны дэкор, і напамін пра даўніну. У Івянцы ўсё робіцца па-гаспадарску, грунтоўна, з густам, нездарма ж па выніках абласнога агляду-конкурсу па добраўпарадкаванню менавіта ён быў прызнаны лепшым у сваёй групе. Грошы, якія такім чынам удалося атрымаць (гэта больш чым 60 мільёнаў рублёў), прыйдуцца дарэчы — зноў-такі на навядзенне парадку пойдуць.

Будаваць — дык з розумам

Важныя справы тут робяць, што называецца, усёй талакой. У Івянцы, на мой погляд, знойдзена аптымальная форма ўзаемадзеяння мясцовай улады з прадпрыемствамі, моладдзю, пенсіянерамі. Актыўна працуе савет дырэктараў, кіраўнікі разам з прадстаўнікамі пассавета рэгулярна збіраюцца і абмяркоўваюць шляхі вырашэння надзённых пытанняў. Займаюцца канкрэтнай справай. Створаны і савет ветэранаў, яго ўзначальвае вядомы чалавек — Леанід Андрэевіч Вечар. Ён дваццаць гадоў кіраваў тутэйшай цукеркавай фабрыкай. Працаваў на сваёй пасадзе, пакуль дазваляла здароўе. Аднак, як выйшаў на пенсію, то доўга не змог на месцы сядзець.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Малады майстар Яўген СЕРАФІМОВІЧ — з ліку тых, хто працягвае традыцыі івянецкіх ганчароў.

— Ветэраны не застаюцца ў баку ад штодзённага жыцця Івянца, — заўважае Леанід Вечар, — можам нешта падказаць, параіць, паколькі маем вялікі вопыт, які часта прыходзіцца дарэчы. Шкада толькі, што ветэранаў з кожным годам застаецца ўсё менш.

Актыўнасці і жыццёвай пазіцыі гэтых людзей сапраўды можна пазайздросціць — яны заўсёды ў курсе спраў. Шмат карысных пачынанняў адбывалася з іх удзелам. Як узгадваў Леанід Вечар, дзесяць гадоў таму ў Івянцы на цукеркавай фабрыцы былі пабудаваны, напэўна, першыя (ці адны з першых) у Беларусі ачышчальныя збудаванні, дзе прымянялася біялагічная форма ачысткі сцёкавых водаў. Гэта гарантыя нармальнай экалогіі, што для пасёлка вельмі важна.

Тут проста ўнікальныя мясціны — помнікі даўніны, побач — рэчка і возера, а таксама легендарная Налібоцкая пушча. Да таго ж, блізка да райцэнтра. Выгаднае становішча, што і казаць, таму і колькасць жыхароў стабільна павялічваецца. Прыязджаюць і з-за мяжы — як заўважыў Юрый Шарый, толькі за мінулы год сюды перабраліся 6 сем'яў з Казахстана і 12 — з Расіі. Усе жывуць вельмі дружна — ніякіх спрэчак на нацыянальнай ці канфесійнай глебе.

Узводзіцца шмат жылля, у тым ліку і жыхарамі сталіцы. Пры жаданні тут можна набыць зямельны ўчастак і пачаць будавацца. Праўда, трэба мець добры «грашовы запас». Як лічыць Юрый Шарый, Івянец мог бы прырастаць за кошт катэджаў, якія будуюцца гаспадаркамі. Такі вопыт пэўны час таму з поспехам прымяняўся ў Нясвіжы.

— Кошт катэджа «набягае» вельмі высокі — больш чым 30 тысяч долараў, — адзначае Юрый Шарый.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

А МЕЛЬНИЦА — ЧЬЯ?

(Окончание. Начало на 1-й стр. «МС».)

В 2000 году райисполком принял решение часть земель бывшего совхоза «Птичь» передать от нас новому хозяину — агрокомбинату «Ждановичи». Что и было сделано. Но определенная часть, в т.ч. и земли деревни Старое Село, оставались у РЦОПКСиК. Только весной прошлого года, после того как Президент освободил РЦОПКСиК от производства мяса и молока, райисполком принял решение оптимизировать наши земли. Так как наш центр — специализированное учреждение, с согласия министра мы вернули оставшиеся земли совхоза «Птичь» в коммунальную собственность, и теперь земли на территории всего Хотежинского сельсовета относятся к АК «Ждановичи».

Неувязка, по словам Сергея Семеновича, заключается в том, что географически мельница деревни Старое Село находится на земле агрокомбината, а числится по-прежнему на балансе РЦОПКСиК. Содержать мельницу на чужой территории да еще и терпеть убытки центру невыгодно, поэтому в конце прошлого года РЦОПКСиК прислал на имя председателя Хотежинского сельисполкома письмо с предложением о передаче пресловутой мельницы сельисполкому в безвозмездное пользование.

«В Учреждение «Республиканский центр олимпийской подготовки конного спорта и коневодства» поступило коллективное обращение граждан д. Старое Село о работе мельницы для нужд граждан сельсовета. В связи с тем, что земли, находящиеся на территории Хотежинского сельсовета, переданы агрокомбинату «Ждановичи», учреждение вынуждено закрыть данную мельницу. Учреждение «Республиканский центр олимпийской подготовки конного спорта и коневодства» предлагает здание мельницы использовать Хотежинским сельсоветом с решением вопроса трудоустройства мельника, а также подключить указанную мельницу к РЭС».

Договор как вариант

— Для того чтобы передать мельницу сельисполкому на баланс, нужно согласовать этот вопрос с Минэкономики, — поясняет Сергей Семенович. — На это уйдет много сил и времени — примерно год. Населению мельница нужна работающей уже сегодня, поэтому в качестве выхода мы предложили Хотежинскому сельисполкому подписать договор о передаче в безвозмездное пользование здания мельницы в деревне Старое Село. Это даст возможность исполкому запустить мельницу, хотя на балансе она будет по прежнему числиться у РЦОПКСиК. Согласно проведенной оценке, балансовая стоимость мельницы сегодня составляет примерно 9 млн рублей. Износ — 89 процентов. Остаточная стоимость — чуть меньше 2 млн рублей. Со временем, когда износ увеличится, мельницу можно будет списать.

Председателя сельисполкома вариант с договором не особенно устраивает, гораздо надежнее, с его точки зрения, передать ее с баланса на баланс: «Я уже имел дело с подобным договором, — признался Николай Петрович. — Потом хлопот не оберешься. Правда, если не будет другого выхода — придется пойти на его подписание. Скажем, мельника можно будет взять на хозрасчетных условиях. Но здание-то само старое, оборудование — тоже. Тем не менее мы обязаны соблюдать там технику безопасности, а у меня нет специалистов, которые смогли бы следить за этим на мельнице. Нет и электросчетчика. Когда придет с проверкой представитель энергонадзора, он засчитает не 1 час в неделю, как работает мельница реально, а за целый месяц по 8 часов в день. И не по льготному тарифу. Все это очень затратно. Я считаю, в решении вопроса о передаче мельницы нам должен помочь райисполком».

— Минский райисполком может принять решение о передаче только с согласия собственника, а им является Минэкономики, — объясняет позицию районной власти заместитель начальника управления сельского хозяйства райисполкома по механизации Сергей Серый. — Если бы одним росчерком пера председателя райисполкома мельницу можно было передать на баланс сельисполкома, это уже было бы сделано. Самый простой и быстрый способ — договор о передаче в безвозмездное пользование, но так как этот вариант не устраивает местную власть, значит, надо идти по пути согласования с Минэкономики. Минский райисполком оформит официальный запрос. На согласование, бесспорно, уйдет время, зато в результате сельисполком будет иметь все законные основания распоряжаться мельницей.

Отдадим «Ждановичам»?

Еще одним выходом из ситуации могла бы стать продажа здания мельницы в частные руки, с оговоркой — без изменения производства. Предприниматель провел бы там ремонт, обновил оборудование, установил счетчик электроэнергии и оказывал бы населению услугу по размолу зерна. Заинтересованные люди на территории сельсовета есть, но вот само население категорически против. Ведь ни один предприниматель не будет работать себе в убыток. Расценки на свою услугу он поднимет в несколько раз, а люди не хотят платить больше прежнего.

Оптимальный вариант, устраивающий всех, — передача мельницы хозяину земли, на которой здание находится, т.е. агрокомбинату «Ждановичи». «У него есть и соответствующие специалисты по технике безопасности, и средства на ремонт и приобретение счетчика», — аргументирует Николай Петрович. Правда, в таком случае агрокомбинату придется заплатить за мельницу: «Согласно существующему законодательству сельисполкому как бюджетной структуре, не получающей прибыль, мы имеем право передать в пользование мельницу бесплатно, — вносит пояснения Сергей Шевчик. — А агрокомбинату — только за деньги».

Николай Петрович пообещал обсудить этот вопрос с генеральным директором агрокомбината. Если же тот откажется от предложения, сельсовет примет мельницу в безвозмездное пользование.

Временное решение

Пока что мельница, вокруг которой разгорелись такие страсти, остается закрытой. Возле нее периодически дежурит только сам мельник — Петр Королик, отработавший на ней около 10 лет. До этого он числился сварщиком в местном совхозе. «Если бы не я, тут бы давно все пылью покрылось и развалилось, — заявил Петр Федорович. — Основная загруженность у мельницы, конечно, осенью. А сейчас запускать ее достаточно раз в неделю. Жалко мне этих стариков. Одна пенсионерка сюда уже три раза ходила: три мешка зерна смолоть — проблема. Без мельницы нам нельзя — чем же людям скотину кормить?»

Пока вопрос о передаче окончательно не решен, председатель Хотежинского сельского Совета договорился с РЦОПКСиК оказывать населению услугу по размолу на мельнице для внутреннего пользования. Дело в том, что в Старом Селе пока еще остается ферма РЦОПКСиК, где доращиваются до кондиции быки. Для размола зерна им на корм тут же работает мельница. Через несколько месяцев, когда быки доберут вес, их сдадут на мясо, а ферму и мельницу закроют. Остается надеяться, что к этому времени вопрос с «общественной» мельницей будет решен.

Инга МИНДАЛЁВА.

Минский район.

P.S.: Пока готовился материал, Николай Чирик встретился с гендиректором АК «Ждановичи» Григорием Чуйко. Тот согласен взять мельницу, но — бесплатно, а это не устраивает РЦОПКСиК. Чирик и Чуйко договорились о следующем: председатель Совета дает жителям трактор для перевозки зерна, а Чуйко предоставляет для размола любую из своих мельниц. А мельница в Старом Селе будет дожидаться своей участи. Какой? Вопрос остается открытым...

ПРАПАНОВА

ДРУЖЫННІКІ ЁСЦЬ. СТЫМУЛАЎ НЯМА...

Раней іх называлі народнымі, пазней азначэнне «адпала», і дружыны ператварыліся проста ў добраахвотныя. Шчыра кажучы, думала, што неабходнасць у гэтай з'яве (на паперы — добраахвотнай, на практыцы зачастую — добраахвотна-прымусовай) з цягам часу адпадзе, а людзі з чырвонымі павязкамі застануцца толькі ў савецкіх кінафільмах.

Аказалася, добраахвотныя дружыны жывуць. Прычым не толькі на паперы і не толькі дзеля справаздач аб паляпшэнні прафілактыкі правапарушэнняў. Адна з такіх структур была створана восем гадоў таму на тэрыторыі населенага пункта Бароўка, што ў Лепельскім раёне. Ініцыятарамі стварэння добраахвотнай дружыны выступілі мясцовы саюз афіцэраў і савет воінаў-інтэрнацыяналістаў. Ну а пазней Бароўскі сельскі Савет узяў гэту структуру пад сваё «крыло».

Магчыма, у іншым сельсавеце, дзе большасць жыхароў — людзі пенсійнага ўзросту, неабходнасць у падобным фарміраванні з'яўляецца пытаннем спрэчным. Бароўскі ж сельсавет — спецыфічны. Уласна кажучы, тэрытарыяльна ён супадае з аднайменным населеным пунктам — Бароўкай, дзе пражываюць у пераважнай большасці сем'і ваеннаслужачых.

— Бароўка — тое, што мы называем ваенны гарадок, — тлумачыць сакратар сельвыканкама Валянціна Урбан. — Тут няма прыватных сядзіб, падсобных гаспадарак. Людзі — а гэта больш за 3 тысячы чалавек — жывуць у шматкватэрных дамах.

Практычна гарадскі лад жыцця дыктуе «гарадскія» ж паводзіны. Моладзь, не абцяжараная вясковай працай, бавіць час у кафэ і на дыскатэках, якія на гэты момант ператвараюцца ў канцэнтрацыю небяспечных сітуацый. Таму ў Бароўскім сельсавеце ўжо восем гадоў існуе добраахвотная дружына, якая ахоўвае грамадскі парадак на вуліцах, у кафэ, на дыскатэках, а таксама ў час масавых мерапрыемстваў.

Дружыннікі ў Бароўскім сельсавеце не толькі на паперы. Яны сапраўды ёсць, і іх нямала — 15 чалавек. Ёсць нават свой камандзір — Аляксандр Міхайлаў. Ён, дарэчы, адзіны з дружыннікаў, хто мае пасведчанне добраахвотнага народнага дружыннага ўзору. Ён, як і ўсе яго падначаленыя, праходзіў спецыяльную падрыхтоўку ў Лепельскім РАУС, здаваў экзамены, атрымаў адпаведныя дакументы. Ён ведае, як дзейнічаць у экстрэмальных сітуацыях, як правільна скласці пратакол, як затрымаць парушальніка. Ён ведае, што дружыннік — не самастойная адзінка, а толькі частка групы, якая дзейнічае толькі ў кантакце з супрацоўнікамі міліцыі.

Дружыннікі ёсць, стымулаў няма. Ні матэрыяльных, ні маральных. Ні ў Міхайлава, ні ў яго падначаленых няма нават пасведчанняў, якія б давалі ім права ў выпадку неабходнасці затрымаць парушальніка. Ні ў Міхайлава, ні ў яго падначаленых няма нават спецыяльнай формы, якая б адрознівала іх ад астатніх грамадзян. Ні ў Міхайлава, ні ў яго падначаленых няма нават спецыяльных сродкаў абароны. Ні ў Міхайлава, ні ў яго падначаленых няма нават... грошай на бензін, каб выехаць на выклік.

— У мінулым годзе нашы дружыннікі ўдзельнічалі ў раскрыцці двух злачынстваў, па гарачых слядах дапамагалі ўчастковаму інспектару выкрываць зладзеяў, — расказвае Вольга Міхайлаўна. — Здараліся і больш небяспечныя сітуацыі... Неяк у кафэ пачалася бойка, і начальнік штаба дружыны, імкнучыся спыніць хуліганаў, апынуўся ў самым яе эпіцэнтры. Канешне, пацярпеў і сам.

Што мог бы зрабіць у пасёлку з 3-тысячным насельніцтвам адзін участковы? (Тым больш, што за апошнія гады яны мяняліся некалькі разоў). Касцяк жа добраахвотнай дружыны на працягу сямі гадоў (і нават больш) застаецца нязменным. Да яго цягнуцца новыя людзі, сярод якіх практычна не трапляюцца «выпадковыя». Іх аўтарытэт працуе на аўтарытэт дружыны ў цэлым. А адпаведныя нарукаўныя павязкі выклікаюць у насельніцтва не здзеклівыя ўсмешкі, а паважлівае стаўленне.

— На жаль, сёння мы нічога не можам прапанаваць сваім абаронцам, акрамя маральных стымулаў, — уздыхае Вольга Міхайлаўна. — Адпраўляем іх у якасці ганаровых гасцей на ўсе раённыя святы — на сёння гэта адзінае заахвочванне, якое можна гарантаваць.

У законе аб добраахвотных дружынах ёсць палажэнне, якое прадугледжвае прадастаўленне дружынніку ад 1 да 3 дадатковых дзён да адпачынку па месцы працы. Але калі раней арганізацыі і прадпрыемствы ішлі насустрач хадайніцтвам сельвыканкама адносна добраахвотнікаў, то сёння сітуацыя складваецца не на карысць апошніх.

— Кіраўнікі адмахваюцца ад нашых хадайніцтваў, аргументуючы свае адмовы наяўнасцю кантрактаў або калектыўных дагавораў, дзе ніякіх «дадатковых дзён» не прадугледжана. Відавочна, што палажэнні закона разбіваюцца аб жыццёвыя рэаліі. Атрымліваецца, калі добраахвотная дружына створана не на прадпрыемстве, а пры сельвыканкаме, я як старшыня не маю ніякіх рычагоў уздзеяння на кіраўнікоў арганізацый, дзе працуюць дружыннікі... Грошы на іх прэміраванне ў бюджэт сельвыканкама таксама не закладваюцца, хоць я неаднаразова выходзіла з гэтай прапановай на раённы ўзровень і не толькі. Усе пагаджаюцца з тым, што добраахвотная дружына — справа патрэбная, але... Воз, як кажуць, і зараз там...

Нейкае выйсце з сітуацыі Вольга Міхайлаўна ўсё ж знайшла... «Дзякуй Богу, — гаворыць, — што ў сельскім Савеце распрацавана палажэнне аб Ганаровай грамаце, да якой дадаецца матэрыяльнае заахвочванне — да 5 базавых велічынь». Але гэта — на паперы.

Старшыня Лепельскага раённага Савета дэпутатаў Мікалай Місюра аб праблеме ведае, але абяцанняў наконт яе хуткага вырашэння не дае. «Пакуль што, — гаворыць Мікалай Мікалаевіч, — Бароўскі сельвыканкам не разлічыўся з даўгамі за рамонт свайго будынка. У іх няма свабодных грашовых астаткаў, як у іншых сельскіх Саветах, таму і сродкі на заахвочванне людзей узяць няма адкуль. Паспрабуем абмеркаваць гэта пытанне з райфінаддзелам — магчыма, нешта ўдасца зрабіць. Я не кажу пра асобны радок у расходнай частцы бюджэту — гэта наўрад ці. Але наконт мэтавай матэрыяльнай дапамогі будзем думаць».

На справе ж з небагатага сельсаветскага бюджэту да гэтага часу ўдавалася выкройваць не больш за 5—10 тысяч у год на стымуляванне аднаго добраахвотніка — прытым што кожны дружыннік ахвяруе сваім здароўем і вольным часам як мінімум адзін-два разы ў месяц. У любое надвор'е.

— У мінулым годзе, — гаворыць Вольга Пятрова, — мы выступілі на пасяджэнні Лепельскага райвыканкама з прапановай аб удасканаленні работы па прафілактыцы правапарушэнняў, папрасілі ўвесці ў бюджэт адпаведны артыкул расходаў — на заахвочванне людзей... Звярнуліся і ў раённы Савет дэпутатаў — там пайшлі насустрач, і рашэннем прэзідыума Савета два чалавекі былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі, да якіх дадаваліся і прэміі. Гэта, канешне, добра. Але хацелася б большага — каб матэрыяльнае стымуляванне актывістаў добраахвотных дружын было падмацавана на заканадаўчым узроўні.

Наталля КАРПЕНКА.

КАБ ЛЮДЗЯМ ПАДАБАЛАСЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Так атрымліваецца з-за таго, што неабходна ўзводзіць дадатковыя камунікацыі. Большасць вуліц Івянца забяспечаны ўсімі неабходнымі інжынернымі сеткамі. Дык чаму не будаваць тут? Гэта дазволіць значна зменшыць кошт жылля, з'явяцца новыя працоўныя месцы.

Адпачынак у дэфіцыце?

У Івянцы развіта сацыяльная сфера — ёсць Дом быту, 2 бібліятэкі, цудоўны музей, дзіцячы дом-інтэрнат, садок, музычная школа. Тут вельмі добрая бальніца, у якой апошнім часам значна абнавілася абсталяванне. З медыцынскімі кадрамі праблем не ўзнікае — нядаўна з Гродзеншчыны прыехалі два тэрапеўты, а таксама па размеркаванню — малады ўрач (дарэчы, мінчанка). Спецыялістам выдзелілі добрае жыллё, забяспечылі нармальны заробак.

Тутэйшая школа па колькасці вучняў самая вялікая ў Валожынскім раёне. У ёй зараз займаюцца 823 дзіцяці, адукацыю яны атрымліваюць самую сучасную. Аб чым, дарэчы, сведчыць тое, што летась больш чым 62 працэнты выпускнікоў паступілі ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. У школе ёсць профільныя накірункі (гуманітарны, фізіка-матэматычны, хімія-біялагічны), па дамоўленасці з Беларускім дзяржаўным аграрна-тэхнічным універсітэтам працуе ліцэйскі клас, усе яго выпускнікі паспяхова паступаюць у ВНУ. «У школе добрае камп'ютарнае абсталяванне, настаўнікі распрацоўваюць мультымедыйныя методыкі выкладання, — кажа дырэктар Івянецкай СШ Пётр Бібік. — Плануецца нават арганізаваць лакальную камп'ютарную сетку».

Пры школе працуюць 12 спартыўных секцый, галоўная спецыялізацыя — лёгкая атлетыка. Заняткі карыстаюцца вялікім попытам, паколькі ў пасёлку шмат моладзі. А вось прапаноў наконт таго, дзе з карысцю бавіць вольны час, не так ужо і шмат. У планах — прыбудова да мясцовага Дома культуры, а таксама ўласны стадыён. Гэта дазволіць зрабіць адпачынак больш разнастайным.

— Хочацца стварыць усе умовы, каб людзям падабалася тут жыць, — кажа Юрый Шарый. — Каб усім, хто ў нас пабыў, хацелася б вярнуцца яшчэ і яшчэ...

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Мінск—Івянец.

САЛІГОРСК І ЯГО НАВАКОЛЛІ ПЕРАЎТВАРАЦЦА Ў «ГОРАД-САД»

Вясной мінулага года па даручэнню кіраўніка дзяржавы пачалася распрацоўка ўнікальнага праекта добраўпарадкавання і азелянення тэрыторый, што прылягаюць да вытворчага аб'яднання «Беларуськалій», і горада Салігорска.

Як паведаміла галоўны саветнік-інспектар старшыні Мінскага аблвыканкама Людміла Луцэвіч, адпаведныя работы былі выкананы даволі аператыўна — на працягу некалькіх месяцаў. Генеральным праекціроўшчыкам выступіў «Барысаўпраект». Ужо ў чэрвені праект быў адобраны, а ў верасні пачалася яго актыўная рэалізацыя.

Да асаблівасцяў Салігоршчыны адносіцца складаная экалагічная сітуацыя, якая перш за ўсё звязана з дзейнасцю ВА «Беларуськалій». Таму ці не галоўнай задачай праекта стала распрацоўка навуковых рэкамендацый па аптымізацыі навакольнага асяроддзя сродкамі азелянення. Паводле слоў Людмілы Луцэвіч, гэтая мера, пры грамотным яе ўвасабленні, з'яўляецца адным з найбольш эфектыўных спосабаў паляпшэння экалагічнай сітуацыі. У такім разе ствараецца ўжо зусім іншае асяроддзе, больш прыдатныя ўмовы для жыцця людзей.

Як адзначыў аўтар праекта, дырэктар творчай майстэрні Аляксандр Сабалеўскі, існуе тэрмін «зялёная экалагічная архітэктура». З дапамогай азелянення можна дасягнуць многага, перш за ўсё ў гарадах са стандартнай «савецкай» забудовай, да якіх адносіцца і Салігорск. У яго прыгарадзе неабходныя работы па добраўпарадкаванню і азеляненню ўжо выкананы. Яны датычыліся як вытворчых плошчаў «Беларуськалія» і яго навакольля, так і тэрыторый бліжэйшых сельгаспрадпрыемстваў. Выдаткі на правядзенне комплексу работ (фінансаванне адбывалася з розных крыніц, у тым ліку значныя сродкі на гэтыя патрэбы выдзелены з абласнога бюджэту) склалі больш чым 4 мільярды рублёў.

Паводле інфармацыі намесніка старшыні Мінскага абласнога камітэта аховы прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Ганны Валажынскай, на 28 участках ужо высаджана больш чым 63 тысячы спецыяльна падабраных дрэў і кустоў. Сёлета рэалізацыя комплекснага праекта закране і Салігорск. Ужо вызначаны прыярытэтныя ўчасткі, дзе будуць праводзіцца адпаведныя работы. На ўсёй тэрыторыі (у горадзе і яго навакольлях) паступальна будзе ўвасабляцца ідэя «горада-сада». Мяркуецца, што ўсе неабходныя работы ў Салігорску (разам з будаўніцтвам новых аб'ектаў) будуць завершаны на працягу бліжэйшых трох гадоў. Напрацаваны тут унікальны вопыт можа быць выкарыстаны ў іншых вялікіх гарадах. Магчыма, наступным на чарзе стане Барысаў.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ПАТРАБУЮ ІНВАЛІДНУЮ ГРУПУ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Напрыклад, інваліды першай і другой груп, дзеці-інваліды забяспечваюцца лекавымі сродкамі, а хірургічныя хворыя — неправязачнымі матэрыяламі з 90-працэнтнай скідкай, а інваліды трэцяй групы — з 50-працэнтнай. Пенсійнае заканадаўства гарантуе асобам, якія сталі інвалідамі, большую сацыяльную абароненасць, чым іншым катэгорыям пенсіянераў. З аднаго боку, гэта можна лічыць прыкметай сацыяльнай дзяржавы, а з другога — прыводзіць да таго, што грамадзяне выбіраюць не рэабілітацыю, а пенсіі па інваліднасці, з якімі звязаны вялікі пакет ільгот. Аналіз зваротаў у наша міністэрства дазваляе канстатаваць, што наяўнасць ільгот пабуджае людзей... адмаўляцца ад рэабілітацыі, пратэзавання і г.д., яны не імкнуцца да хутчэйшага поўнага выздараўлення.

— Нагадайце, калі ласка, асноўныя прычыны, якія прыводзяць людзей працаздольнага ўзросту да інваліднасці. Наколькі развіта ў нас медыцынская рэабілітацыя, якая дазваляе зняць групу, вярнуць хворага да паўнацэннага жыцця?

— Узровень інваліднасці залежыць не толькі ад работы сістэмы аховы здароўя, але і ад шэрагу іншых, скажам, сацыяльных, экалагічных аспектаў. Аб гэтым сведчыць і той факт, **што асноўнымі прычынамі інвалідызацыі насельніцтва працаздольнага ўзросту застаюцца на працягу апошніх гадоў хваробы сістэмы кровазвароту, злаякасныя новаўтварэнні і траўмы.** Даступнасць медыцынскай рэабілітацыі функцыянуюць стацыянарныя аддзяленні — неўралагічнага, кардыялагічнага і артапеда-датраўмапаталагічнага профілю на ўзроўні абласных бальніц. Тут праходзяць рэабілітацыю хворыя і інваліды пасля рэканструкцыйных аперацый на сэрцы і сасудах, інфаркту міякарда, сасудзістых захворванняў галаўнога мозга, з наступствамі траўмаў. Спецыялісты спрабуюць аднавіць парушаныя функцыі арганізма настолькі, каб чалавек мог абслугоўваць сябе ў той ці іншай ступені, рухацца — самастойна або з дапамогай прызначаных для гэтага прыстасаванняў, быць псіхалагічна адаптаваным да свайго стану і настроеным на ажыццяўленне ўсёй праграмы рэабілітацыі, якая ў далейшым працягваецца ў поліклінічных аддзяленнях медыцынскай рэабілітацыі.

Высокатэхналагічныя метады рэабілітацыі, якія дазваляюць пераадолець наступствы цяжкіх захворванняў, прымяняюцца і на базе іншых рэспубліканскіх арганізацый аховы здароўя. У Рэспубліканскай клінічнай бальніцы паталогіі слыху, голасу і маўлення выкарыстоўваюцца як хірургічныя, так і не хірургічныя метады рэабілітацыі хворых з паталогіяй слыху, у тым ліку і аперацыі па імплантацыі, калі аднаўленне слыху становіцца магчымым дзякуючы спецыяльнаму пратэзу. У Навукова-даследчым інстытуце анкалогіі і медыцынскай радыялогіі функцыянуе аддзяленне рэканструкцыйнай хірургіі і кабінет стамійнай дапамогі — па пластыцы выводзячых шляхоў. У Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры «Кардыялогія» праводзяцца аперацыі на сэрцы і сасудах, якія дазваляюць пацыенту вярнуцца да актыўнага жыцця... Гэты пералік, дарэчы, можна працягваць доўга. Важна дадаць, што ў бліжэйшай будучыні плануецца развіваць сетку адпаведных устаноў і аддзяленняў міжраённага ўзроўню. Такія прыклады маюць месца ў Пінску і Мазыры.

— А яшчэ запланавана адкрыццё рэабілітацыйнай клінікі ў Мінску — на базе чыгуначнай бальніцы. Вышэйпамянёныя ўстановы з'яўляюцца структурамі ранняй рэабілітацыі. Паводле даных той жа Рэспубліканскай клінічнай бальніцы медыцынскай рэабілітацыі, у 98,6 працэнта хворых назіраецца станоўчы эфект, паляпшэнне стану. Аднак ёсць, зразумела, стойкія парушэнні, пры якіх немагчыма дасягнуць далейшай станоўчай дынамікі. У такіх выпадках і паўстае пытанне аб групе... Якая роля ў гэтым працэсе адведзена медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі?

— У Беларусі дзейнічаюць міжнародныя падыходы да вызначэння інваліднасці. **Група ўстанаўліваецца не за наяўнасць аднаго ці некалькіх захворванняў, а за наступствы, якія яны выклікаюць.** Напрыклад, у выніку інсульту чалавек паралізаваны, страціў маўленне, — менавіта гэта, а не сам па сабе інсульт, вызначае інваліднасць. Да таго ж, мы гаворым пры досыць дынамічную катэгорыю: стан здароўя можа як пагоршыцца, так і палепшыцца. Інваліднасць могуць зніжаць, павышаць ці здымаць.

Сёння няма паняцця «непрацаздольны інвалід». Інвалід першай і другой груп таксама могуць працаваць, але для гэтага МРЭК павінен вынесці працоўныя рэкамендацыі, пэўныя ўмовы. Скажам, для інвалідаў трэцяй групы прадугледжаны скарочаны працоўны дзень. Часта інваліднасць устанаўліваецца для магчымасці праходжання хворым актыўнай рэабілітацыі тэрмінам да аднаго года, аб чым яму паведамляецца падчас медагляду. Размовы аб неабходнасці правядзення прафесійнай, сацыяльнай рэабілітацыі вядуцца з усімі, але не ўсе згаджаюцца на яе.

Варта адзначыць, што група не «даецца», а менавіта вызначаецца камісіяй.

Для ўстанаўлення той ці іншай групы інваліднасці, сапраўды, неабходна прайсці комплекс дыягнастычных, лячэбных і рэабілітацыйных мерапрыемстваў, пасля чаго пры наяўнасці падстаў у паліклініцы па месцы жыхарства афармляецца пасыльны ліст, які накіроўваецца ў медыка-рэабілітацыйную экспертную камісію.

Сёння спецыялісты МРЭК закліканы вызначыць у чалавека абмежаванні жыццядзейнасці, выявіць яго рэабілітацыйны патэнцыял, знайсці меры сацыяльнай абароны. Да кожнага чалавека спецыялісты камісіі падыходзяць індывідуальна, з улікам яго прафесійных навыкаў, адукацыйнага ўзроўню, стану здароўя. Толькі пасля азнаямлення з усімі нюансамі можа быць устаноўлена, ці адносіцца чалавек да катэгорыі «інвалід». Варта адзначыць, што група не «даецца», а менавіта вызначаецца камісіяй. Толькі яна мае на гэта юрыдычнае права. Заключэнні іншых устаноў аховы здароўя носяць характар рэкамендацый. Адмяніць рашэнне МРЭК можна толькі ў судовым парадку.

Ступень — у дзяцей, група — у дарослых

Калі ў дарослых вызначаецца група інваліднасці — трэцяя, другая ці першая, то ў дзяцей, у залежнасці ад цяжкасці паталогіі і ступені парушэння жыццядзейнасці, — так званая ступень страты здароўя. Найбольш лёгкая ступень — першая, найбольш цяжкая — чацвёртая. Калі дзіця дасягае 18-гадовага ўзросту, яму замест ступені страты здароўя ўстанаўліваецца група інваліднасці, аднак аўтаматычна ступень страты здароўя ў групу не пераходзіць. З кожным канкрэтным выпадкам разбіраецца МРЭК.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:

МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;

САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;

СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292-21-03.

Краіна здароўя

Выпуск № 6 (19)

Малочныя прадукты: лепш абястлушчаныя!

Малако і малочныя прадукты займаюць важнае месца ў харчаванні як дзіцячага, так і дарослага насельніцтва. Аднак, паводле слоў намесніка міністра аховы здароўя — Галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача РэспублікіБеларусь Міхаіла РЫМЖЫ, чым больш дарослымі мы становімся, тым менш тлустымі яны павінны быць.

Асаблівую каштоўнасць уяўляюць бялкі малака, якія ўтрымліваюць усе неабходныя для жыццядзейнасці арганізма незаменныя амінакіслоты. Малако, малочныя прадукты, асабліва кісламалочныя, з'яўляюцца добрым лячэбным сродкам для людзей, якія пакутуюць ад страўнікава-кішачных захворванняў. У тэхналогіі вырабу кісламалочных прадуктаў выкарыстоўваюцца бактэрыяльныя закваскі. Малочнакіслыя бактэрыі ствараюць у страўнікава-кішачным тракце кіслае асяроддзе, што перашкаджае развіццю гніласных бактэрый, якія выклікаюць распад бялкоў ежы з утварэннем таксічных рэчываў.

Зараз шырокае распаўсюджанне атрымалі кісламалочныя прадукты, узбагачаныя прабіётыкамі — прадстаўнікамі абарончай флоры арганізма і вітамінамі А, С, Д, Е. Сёння вырабляецца досыць шырокі асартымент як традыцыйных прадуктаў (смятана, кефір, сыракваша, ражанка), так і кісламалочных прадуктаў новага пакалення, узбагачаных біфідабактэрыямі, лактулозай, з выкарыстаннем фруктовых напаўняльнікаў (ёгурты, біяёгурты, біякефір, біфілін). Высокае ўтрыманне ў кісламалочных прадуктах біфідабактэрый спрыяе нармалізацыі мікрафлоры арганізма чалавека і павышае імунітэт. Асабліва карысныя «жывыя» ёгурты і біяёгурты, якія вырабляюцца без тэрмічнай апрацоўкі. Спалучэнне малочнай сыравіны з фруктова-ягаднымі напаўняльнікамі значна ўзбагачае прадукты прыроднымі біялагічна актыўнымі рэчывамі: вітамінамі, арганічнымі кіслотамі і мінеральнымі солямі. Пры гэтым жалеза засвойваецца арганізмам значна лепш, чым тое, што ўваходзіць у склад лекавых прэпаратаў. Фрукты і ягады, якія ўваходзяць у якасці напаўняльнікаў у кісламалочныя прадукты, з'яўляюцца натуральнымі вітамінаакісляльнікамі. Яны ўтрымліваюць шмат караціну, а арганічныя кіслоты актывізуюць дзейнасць стрававальных сокаў і паляпшаюць рухальную функцыю кішэчніка.

Найбольш карыснымі з'яўляюцца абястлушчанае малако і малочна-кіслыя прадукты, якія не саступаюць па сваёй біялагічнай каштоўнасці неразведзенаму малаку. Пры гэтым энергетычная каштоўнасць абястлушчанага малака амаль у 2 разы меншая, чым неразведзенага. У абястлушчанае малако пераходзіць з неразведзенага звыш 70 працэнтаў сухіх рэчываў, а бялкі і малочны цукар — поўнасцю. Мінеральныя рэчывы амаль усе пераходзяць з неразведзенага малака ў абястлушчанае.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ЭПІДЭМІЯ ГРЫПУ Ў МАГІЛЁВЕ НА ПІКУ

Паводле інфармацыі Магілёўскага абласнога цэнтра санітарыі, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя парог захворваемасці дзяцей і дарослых перавышаны ў абласным цэнтры аж у 9 разоў. З 22 лютага, калі была аб'яўлена эпідэмія, у Магілёве захварэлі на грып амаль 20 тысяч чалавек, з якіх больш за 7 тысяч — дзеці.

— Такога высокага парога захворваемасці не было апошнія пяць—шэсць гадоў, — паведаміла загадчыца аддзела эпідэміялогіі Ала Булай. — Чаму так адбылося? Мы прааналізуем сітуацыю і зробім высновы пасля эпідэміі. Аднак і цяпер можна сказаць, што апошнія гады эпідэмія грыпу ў нас была сярэдняй інтэнсіўнасці, таму лагічны і пік.

У Бабруйску эпідэмія грыпу пачалася толькі 7 сакавіка. Тут ужо захварэлі больш за 6 тысяч чалавек, і большая частка хворых — дзеці. Касцюковіцкі раён грыпуе ўжо больш за два тыдні, а Крычаўскі, Клімавіцкі і Чэрыкаўскі раёны толькі ў пачатку эпідэміі, якая аб'яўлена там 2 сакавіка. Медыкі гавораць, што сёлета людзі хварэюць на грып няцяжка. У асноўным гэта вірус А і ў меншай колькасці выпадкаў — вірус В. Спецыялісты папярэджваюць, што ў сярэднім эпідэмія грыпу доўжыцца 4—5 тыдняў.

Ілона ІВАНОВА.

У ГРОДНЕ СТАЛІ ПАПУЛЯРНЫМІ ПАРТНЁРСКІЯ РОДЫ

У Гродне сталі папулярнымі партнёрскія роды, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА загадчыца акушэрска-фізіялагічнага аддзялення абласнога раддома Наталля Качук. Паводле яе слоў, паняцце партнёрскіх родаў падразумявае прысутнасць пры родах цяжарнай жанчыны яе мужа, мамы, сястры, сяброўкі або іншага блізкага ёй чалавека.

Як адзначыла Наталля Качук, першыя партнёрскія роды адбыліся паўтара года таму. Тады 24-гадовы гродзенец на руках аднёс сваю жонку ў раддом і прысутнічаў пры нараджэнні дзіцяці.

У 2006—2007 гадах раджаць у прысутнасці мужа выказалі пажаданне ўжо 40 жанчын. У гэтай сувязі ў Гродне на базе дзвюх жаночых кансультацый адкрыты курсы, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку сямейнай пары да партнёрскіх родаў. Пасля наведвання шасці заняткаў жонка і муж атрымліваюць адпаведны сертыфікат.

У абласным раддоме таксама наладжаны электронны варыянт заняткаў: гімнастыка для цяжарных, правільнае родавае дыханне, масаж рэфлекторных кропак і зон, адзначыла спецыяліст.

Рычард САЛАТА, БЕЛТА.

НАВОШТА ПАТРЭБНЫ ЁД?

Ёд неабходны для выпрацоўкі гармонаў шчытападобнай залозы, без якіх абсалютна немагчымая нармальная дзейнасць арганізма чалавека. Менавіта гармоны шчытападобнай залозы адказваюць за фарміраванне і станаўленне многіх функцый мозгу. Таму ад дэфіцыту ёду пакутуе мозг дзіцяці, слых, маўленне, памяць, а таксама фарміруецца спачатку дыфузны, а пасля і вузлавы валляк (павелічэнне шчытападобнай залозы).

Змяненні нервовай сістэмы, якія выкліканы недахопам ёду на этапе ўнутрывантробнага развіцця і ў раннім дзіцячым узросце, з'яўляюцца незваротнымі і практычна не паддаюцца лячэнню. Аднак своечасовыя прафілактычныя мерапрыемствы дазваляюць папярэдзіць усе ёдадэфіцытныя захворванні. Да 80 працэнтаў усяго ёду ў арганізме знаходзіцца ў шчытападобнай залозе. Абмен ёду ў ёй адбываецца вельмі марудна: 1 працэнт у дзень.

Наогул большая частка ёду сканцэнтравалася ў марской вадзе, а значная частка сушы і прэсная вада бедныя на яго. Недахоп мікраэлементу ў глебе прыводзіць да зніжэння ёду ў прадуктах харчавання, вырабленых у гэтай мясцовасці. Для масавай ёдавай прафілактыкі выкарыстоўваецца ёдаваная соль. Індывідуальная і групавая сырод асобаў, якія адносяцца да груп павышанай рызыкі па развіццю ёдадэфіцытных станаў — дзяцей, падлеткаў, цяжарных жанчын, маладых маці на грудным выкормліванні прафілактыка ажыццяўляецца з дапамогай лекавых прэпаратаў. У ідэале ёдавую прафілактыку неабходна прызначаць на этапе падрыхтоўкі да цяжарнасці і працягваць да завяршэння перыяду грудnога выкормлівання. Штодзённая фізіялагічная патрэба ў ёдзе залежыць ад узросту і фізіялагічнага стану чалавека і складае ў сярэднім 150—200 мкг.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Доктар адкажа

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

На наступным тыдні асноўную нагрузку на «гарачай» тэлефоннай лініі Міністэрства аховы здароўя (222-70-80) возьмуць на сябе:

14 сакавіка — галоўны ўрач 23-й дзіцячай паліклінікі г. Мінска ***Наталля Міхайлаўна ЛАШЫНА***.

15 сакавіка — галоўны ўрач 32-й гарадской паліклінікі г. Мінска ***Валянціна Мікалаеўна ЧУПІК***.

16 сакавіка — галоўны ўрач 2-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска ***Вікенцій Часлававіч ПРЫСТУПА.***

У графіку магчымыя змяненні.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Настасся САЎЧУК з братам Кірылам. г.п. Шарашова, Брэсцкая вобласць.

АДЗЁР, ТУБЕРКУЛЁЗ І ПТУШЫНЫ ГРЫП выпрабоўваюць санэпідслужбу на прафесіяналізм

На думку Галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Рэспублікі Беларусь Міхаіла Рымжы, сітуацыя па вакцынакантралюемым інфекцыям у Беларусі на сёння адна з самых стабільных сярод краін СНД. «Больш таго, Сусветная арганізацыя аховы здароўя прызнала летась арганізацыю імунапрафілактыкі ў Беларусі ўзорнай, — заявіў, выступаючы на Рэспубліканскім санэпідсавеце, дзе падводзіліся вынікі работы дзяржаўнай санэпідслужбы за 2006 год, Міхаіл Рымжа. — У немалой ступені гэтаму спрыяе дзеючая сістэма цэнтралізаваных закупак імунабіялагічных прэпаратаў, якая ажыццяўляецца Міністэрствам аховы здароўя. Летась на закупку імунабіялагічных прэпаратаў з бюджэту была выдаткавана сума ў памеры 4 млн 720 тысяч долараў. Больш за 1 мільён долараў спатрэбілася толькі для набыцця процігрыпозных вакцын...»

У 2006 годзе дзяржаўнай санэпідслужбе ўдалося забяспечыць далейшае зніжэнне інфекцыйных захворванняў у краіне на 6,5 працэнта ў параўнанні з папярэднім годам. У Беларусі не рэгістраваліся выпадкі інфекцый па 20 назалагічных формах, а па 47 — было адзначана зніжэнне або стабілізацыя паказчыкаў.

Успышачная захворваемасць на вострыя кішачныя інфекцыі, якая з'яўляецца індыкатарам санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту, рэзка скарацілася і знаходзіцца зараз на ўзроўні адзінкавых выпадкаў. Для прыкладу, не было зарэгістравана ніводнай успышкі вострых кішэчных захворванняў, звязаных з прадпрыемствамі харчовай вытворчасці. У дзіцячых калектывах былі зарэгістраваныя напрыканцы года два выпадкі масавага захворвання дзяцей на дызентэрыю і сальманэлёз (у Мазыры і Сянно) — абодва гэтыя выпадкі былі дэталёва прааналізаваныя, і для папярэджвання аналагічных сітуацый у будучыні распрацаваны Комплексны план па прафілактыцы групавога захворвання на вострыя кішачныя інфекцыі ва ўстановах адукацыі, разлічаны на 2007—2010 гады.

— Зразумела, што ёсць яшчэ інфекцыі, якія прымушаюць нас хвалявацца, напрыклад, адзёр, — прызнаўся Міхаіл Рымжа. — У 2005 годзе ў нашай краіне быў усяго адзін выпадак захворвання на адзёр, а ў 2006 годзе — 149. Праведзенае эпідэміялагічнае расследаванне дазволіла ўстанавіць, што адзёр быў завезены на тэрыторыю Беларусі з Украіны, дзе склалася вельмі напружаная сітуацыя з гэтай інфекцыяй. І хоць далейшае распаўсюджванне адзёру нам удалося спыніць, тым не менш гэты выпадак даказаў, што нам пакуль яшчэ рана расслабляцца...

Насцярожанасць трэба пастаянна захоўваць і да менінгакокавай інфекцыі. У 2006 годзе нам удалося зменшыць колькасць лятальных выпадкаў ад гэтай інфекцыі больш чым удвая. Усяго загінулі 14 чалавек — пераважную колькасць смяротных ахвяраў менінгіту складаюць дзеці ва ўзросце да трох гадоў. Напружанай застаецца і сітуацыя з захворваннем на туберкулёз, асабліва ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях. «Я лічу захворванне дзіцячага насельніцтва на туберкулёз увогуле проста недаравальным», — падкрэсліў Міхаіл Рымжа. На барацьбу з туберкулёзнай інфекцыяй у Беларусі Глабальны фонд барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй збіраецца выдзеліць у красавіку грант у памеры 15 млн долараў.

Ёсць яшчэ адна інфекцыя, якая выпрабоўвае санэпідслужбу на прафесіяналізм — гэта птушыны грып. Летась за міграцыяй пералётных птушак вельмі ўважліва сачылі арнітолагі на шасці станцыях назірання. Гэтай вясной станцый стане ўдвая менш, але месцы масавай канцэнтрацыі пералётных птушак усё роўна будуць знаходзіцца пад пастаянным кантролем спецыялістаў.

Як адзначыў у сваім выступленні Міхаіл Рымжа, з 1 сакавіка ўступіў у дзеянне новы Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях, які значна пашырыў правы і магчымасці прадстаўнікоў дзяржаўнага санітарнага нагляду. У адрозненне ад папярэдняга дакумента, у новым Кодэксе прадугледжана 8 артыкулаў, якімі можна карыстацца для таго, каб прыцягнуць фізічную, службовую, юрыдычную асобу або індывідуальнага прадпрымальніка да адміністрацыйнай адказнасці.

Для прыкладу, штрафныя санкцыі за рэалізацыю тавараў з завершанымі тэрмінамі прыгоднасці вагаюцца ад 20 да 50 базавых велічынь. Забруджванне або засмечванне паверхневых ці падземных водаў цягнуць накладанне штрафу на фізічную асобу ў памеры ад 4 да 20 базавых велічынь, на індывідуальнага прадпрымальніка — да 100 базавых велічынь і на юрыдычную асобу — да 500 базавых велічынь.

Дарэчы, летась органамі і ўстановамі дзяржаўнага санітарнага нагляду (у межах сваёй кампетэнцыі) праводзілася работа па кантролю за выкананнем мерапрыемстваў па добраўпарадкаванню тэрыторый населеных пунктаў і навядзенню парадку на зямлі. За выяўленыя парушэнні санітарна-эпідэміялагічнага заканадаўства на службовыя асобы было накладзена 17 113 штрафаў на суму больш як 1 673,4 мільёна рублёў, па прадпісаннях было ліквідавана больш за 6300 несанкцыянаваных звалак смецця. Ахоп рэгулярнай санітарнай ачысткай сельскіх населеных пунктаў павялічыўся да 64 працэнтаў, садаводчых таварыстваў — да 59, гаражных кааператываў — да 69 і месцаў пахаванняў — да 72 працэнтаў.

У 2006 годзе спецыялістамі санэпідслужбы былі падрыхтаваныя 140 санітарных правілаў, гігіенічных нарматываў і інструкцый. «Мы практычна завяршылі работу па замене дакументаў з грыфамі СССР і БССР на новыя сучасныя дакументы», — дадаў Міхаіл Рымжа.

На працягу 2006 года дзяржаўнай санэпідслужбай былі абследаваны 55 483 аб'екты гандлю і на 36 працэнтаў з іх былі выяўленыя тыя ці іншыя парушэнні санітарнага заканадаўства. Лідзіруе ў пераліку выяўленых парушэнняў рэалізацыя прадукцыі з завершаным тэрмінам прыгоднасці (31 працэнт) і рэалізацыя прадукцыі без дакументаў, якія пацвярджаюць яе якасць і бяспечнасць (20 працэнтаў).

У параўнанні з 2005 годам на 15 працэнтаў узрасла колькасць прадпрыемстваў харчовай прамысловасці, гандлю харчовымі таварамі і грамадскага харчавання, санітарна-тэхнічны стан якіх быў прыведзены ў адпаведнасць з гігіенічнымі патрабаваннямі. Пры непасрэдным удзеле спецыялістаў санэпідслужбы ў 2006 годзе значна пашырыўся асартымент выпускаемых на прадпрыемствах харчовай вытворчасці прадуктаў, узбагачаных вітамінамі і мінеральнымі рэчывамі, з паніжаным утрыманнем тлушчоў і цукру, прадуктаў лячэбна-прафілактычнага і дыетычнага прызначэння і дзіцячага харчавання. Маюцца на ўвазе малочна-кіслыя прадукты, узбагачаныя лактулозай, біфідабактэрыямі, кальцыем, ёдам і вітамінамі, хлебабулачныя вырабы з зерневымі дабаўкамі, узбагачаныя жалезам, вітамінам С і фоліевай кіслатой.

Працягвалася таксама і работа па паляпшэнню ўмоў і якасці аздараўлення дзяцей. Паляпшалася матэрыяльна-тэхнічная база стацыянарных лагераў і, як вынік, у летні час выражаны аздараўленчы эфект быў адзначаны ў 83 працэнтаў дзяцей, у 14 працэнтаў дзяцей адзначалася наяўнасць слабага аздараўленчага эфекту і толькі ў 3 працэнтаў дзяцей аздараўленчы эфект не назіраўся.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Конкурс прыпевак

Усе з нас вельмі любяць кпіць... А мы раптам кінем піць

Ідзём мы з мужам па рынку ў Ждановічах, поўныя рукі торбачак з агуркамі, капустай, ківі для дзяцей... Раптам ўзгадваем, што забылі купіць нешта яшчэ, але вяртацца не хочацца, і я жартую: «Зэканомім!» А муж падхоплівае: «Мая жонка-эканомка, эканоміць на ядзе...» Далей ён, канешне, не вырашыўся працягваць прыпеўку Лідзіі Фарботка (у нумары за 27 лютага) і правільна зрабіў. Бо я б тады адбрыла з Браніслава Мароза: «Быў учора ў гасцях, а сягоння «ох» ды «ах»...» Ці што-небудзь з новенькага (глядзі ніжэй). Яму б тады не здабраваць, бо прыпеўкі ад чытачоў «Звязды» не проста запамінальныя, трапныя, з'едлівыя, але і на ўсе выпадкі. Глядзіце самі, мяркуйце самі, спявайце і дасылайце. Мяркуючы па пошце, надта ўжо тэма натхняльная аказалася! Адна толькі маленькая просьбачка: не спяшайцеся ў канверт пакласці тое, што трошачкі яшчэ можна было б падшліфаваць, лепей падабраць рыфму, больш прыгожа выказаць думку. Поспехаў, здароўя, цвярозасці ў доме, на вуліцы і ў краіне!

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Алена ПАЖОГА,
в. Абруб Глыбоцкага раёна:

Ой, «зялёны змей» лютуе
У маёй старонцы:
Мужыкоў не ўратуем —
Бяда будзе жонкам!

І жанок «змей» спакушае —
Радасць, шчасце абяцае.
Усіх з дарогі роўнай зводзіць
І да бездані прыводзіць.

Распадаецца сям'я,
Як звіняць там чаркі —
Часу на дзяцей няма
І на гаспадарку.

За здаровы лад жыцця
«За» — дзвюма рукамі!
Я хачу шчаслива жыць.
Вы ж рашайце самі...

Любоў СЛОНКІНА,
г.п. Глуск:

Заказала Прэзідэнту
Тэлеграму з раніцы —
Каб пазводзіў ён са свету
Лайдакоў ды п'яніцаў.

З неба пляшачка ляцела,
Нібы зорка зіхацела,
Ды мой мілы не злавіў,
Усю ночку галасіў.

Райаддзел застукаў Валю:
Гнала Валя «сівую».
Тры вядры канфіскавалі
І за ноч асілілі.

Наталля КАРНЕЙ,
в. Жарлакі Маладзечанскага раёна:

Адмысловы гаспадар
Быў сусед мой Сева.
«Змей зялёны» спакусіў —
Стаў хадзіць налева!

Самагонкі назбіраўся,
Зусім розум адняло,
Як свіння ў гразі качаўся
І не сорамна было!

Заліў вочы дзядзька Ян,
Горкая часіна:
Слуп дарожны абдымаў —
Думаў, што дзяўчына.

Уладзімір СІТНІК,
в. Палажэвічы Старадарожскага раёна:

Як любіў калісьці спорт,
Дык здаровы быў, як чорт.
Як гарэлку ўпадабаў,
Сам за чорта цяпер стаў.

Ой ты, п'яненькі вадзіла,
Для цябе ўжо не сакрэт:
Дзе гарэлка і «чарніла»,
Там кювет і лазарэт.

Стала моднай наша Міла:
Нос і шчокі з просінню,
Бо купаецца ў «чарніле»
І вясной і восенню.

Ой гарэлачка, ты булькай...
Як цябе не шанаваць?!
Мне шчэ 30, а бабулькі
Месцы сталі саступаць.

Няма грошай на бутэльку —
Браць «на вэксаль» не люблю.
Злажу к дзеду ў камізэльку,
Сабе пляшачку куплю.

Ой, нялёгкую задачу
Задала сама сабе:
Куды ж мілага цягнуць мне
Перш у ЗАГС ці ў ЛПП?

Усе з нас вельмі любяць кпіць...
А мы раптам кінем піць.
Як жа потым пойдуць справы
І ў гандлі, і ў дзяржавы?

36,6°

КАЛІ Ў ВУШАХ ШУМІЦЬ І ЗВІНІЦЬ

Згодна са статыстыкай, ад 4 да 6 працэнтаў жыхароў нашай планеты пакутуюць ад тых ці іншых расстройстваў слыху. Найбольш часта сустракаюцца такія захворванні вуха, як хранічныя атыты, отасклерозы, нейрасенсорная тугавушасць. Прычыны іх узнікнення самыя розныя. Аднак, як адзначае **сурдолаг Рэспубліканскай клінічнай бальніцы паталогіі слыху, голасу і мовы Ніна КАСЦЮК**, немалаважнае значэнне для таго, каб вушных праблем было менш, мае гігіена органаў слыху.

Тое, як большасць людзей чысціць вушы, прыводзіць спецыялістаў у поўны сум. Нават інтэлігентныя людзі выкарыстоўваюць для гэтых мэтаў пруткі, алоўкі, дужкі ад акуляраў, шчэпкі — усё гэта без малейшых ваганняў суецца ў вуха.

На самай справе здаровыя вушы ачышчаюцца без нашай дапамогі. Гэты працэс адбываецца падчас натуральных дзеянняў — калі мы жуём, размаўляем ці кашляем. Гэтаму садзейнічаюць рухі скронева-ніжнясківічнага сустава, які размешчаны побач з пярэдняй сценкай вонкавага слыхавога праходу. Калі вушы не баляць, іх дастаткова мыць са знешняга боку і акуратна выціраць ручніком. Лазіць у слыхавы праход зусім не трэба, бо гэта вельмі небяспечна: можна пашкодзіць слыхавы праход, барабанную перапонку. У цяжкіх выпадках гэта прыводзіць да пашкоджання ланцуга слыхавых костак, што пагражае зніжэннем слыху і прыступамі галавакружэння.

Вядома, што ў вонкавым слыхавым праходзе ў кожнага чалавека ўтвараецца сера. Яна служыць натуральнай змазкай для вуха, гэта нармальны фізіялагічны працэс. Але часам серы выдзяляецца занадта шмат, і тады ўтвараецца серная пробка, якая можа часова пазбавіць чалавека слыху ці значна знізіць яго.

Серныя пробкі — гэта назапашванне сакрэту серных залозаў разам з адмерлымі клеткамі скуры, пылам. Прычын для іх з'яўлення можа быць некалькі:

■ Сера спрасоўваецца, і ўтвараюцца пробкі з-за рэгулярнага «ачышчэння» вушэй ватнымі палачкамі, запалкамі, пруткамі.

■ Схільнасць ад прыроды да павышанага ўтварэння серы.

■ Вузкі і звілісты слыхавы праход.

■ Запаленне скуры праходу, іншародныя целы, часцінкі пылу, якія трапілі ў слыхавы праход.

■ Парушэнне абмену рэчываў (павышанае ўтрыманне халестэрыну ў крыві).

Сімптомы сернай пробкі асабліва яўна праяўляюцца, калі ў вуха трапляе вада ці пры празмерным потавыдзяленні. Хутчэй за ўсё серная пробка ёсць, калі без бачных на тое прычын вушы закладвае, адчуваецца рэзананс уласнага голасу, шуміць у вуху.

Вымыць серную пробку можа толькі ЛОР-урач. А вось пасля гэтага для прафілактыкі можна і самому дома 2—3 разы на месяц рабіць простыя працэдуры.

Легчы на бок і закапаць у вушы 3-працэнтны раствор пераксіду вадароду па 5 капель ці вазелінавае масла, паляжаць 15—20 хвілін. Пасля гэтага пачысціць вонкавы слыхавы праход жгуцікам са стэрыльнай ваты ўкручвальнымі рухамі. Нестэрыльныя ватныя палачкі для вушэй не падыходзяць, таксама не трэба намотваць вату на запалку: ёсць небяспека пашкодзіць структуру вуха. Бо пры чыстцы вушэй серныя залозы раздражняюцца, серы можа ўтварацца як болей, так і меней, а можа адбыцца, што яны зусім перастануць працаваць. Прыемнага ў любым выпадку мала — пры павышаным утварэнні серы з'яўляюцца пробкі, пры яе адсутнасці адчуваецца сверб, сухасць у слыхавых праходах.

І яшчэ трэба ўзяць на заметку. Часам у вуха чалавека можа трапіць насякомае. Дзеці могуць засунуць туды дробныя дэталі ад мазаікі, канструктара, шрубкі, гайкі, костачкі ад вішні. Нават не спрабуйце самастойна выдаліць з вуха іншароднае цела. Наўрад ці вы яго дастанеце, толькі бяды наробіце: траўміруеце барабанную перапонку ці нават праштурхняце прадмет за яе — у сярэдняе вуха. У такой сітуацыі трэба тэрмінова звяртацца да аталарынголага.

Сур'ёзнымі прычынамі звярнуцца на дапамогу спецыяліста з'яўляюцца: шум і звон у вушах, адчуванне, што ў вуху булькае вада, вушы закладвае, сверб знутры.

А што рабіць, калі ў вуху страляе, галава раскалваецца і няма магчымасці хутка звярнуцца да ўрача?

■ Трэба закапаць у нос каплі, якія паляпшаюць насавое дыханне: назівін, санарын, атрывін і г.д. Гэта неабходна, каб зняць ацёк, расшырыць вусце слыхавых труб у насаглотцы для свабоднага адтоку змесціва з барабаннай поласці. Нос трэба закапваць лежачы на баку, у тую ноздру, якая аказваецца пры гэтым знізу, паляжаць 7—10 хвілін. Абедзве паловы носа трэба закапваць па чарзе.

■ Калі няма выдзяленняў з вуха, у слыхавы праход закапаць 5 капель (дзецям — 2—3) гарэлкі ці разведзенага ў тры разы 96-працэнтнага спірту.

■ Прыняць абязбольвальны гарачкапаніжальны сродак, нават калі няма тэмпературы — нурафен, колдрэкс, парацэтамол, аспірын і г.д.

■ Калі не ведаеце дакладнага дыягназу, кампрэсы лепш не рабіць.

Вольга ШАЎКО.

ДЛЯ ХВОРАЙ ПЕЧАНІ — СВОЙ РАЦЫЁН

Дыетычнае харчаванне пры хранічных захворваннях печані і жоўцевага пузыра павінна быць дробным, пяціразовым, з адным разгрузачным днём на тыдні (кефір+тварог). Ежу варта прымаць павольна, абавязкова снедаць, а вячэраць сціпла і не пазней за 2—3 гадзіны да сну. Колькасць вадкасці не абмяжоўваецца (за выключэннем цырозу печані ў стадыі дэкампенсацыі). Неабходна карэктаваць масу цела. Дарэчы, знаёмства з гэтымі і наступнымі рэкамендацыямі па харчаванню будуць карыснымі не толькі для хворых.

Дыетычнае харчаванне дазваляе ўжываць варанае мяса, катлеты на пары, фрыкадэлькі з цяляціны, курыцы, труса, бараніны, не дазваляецца смажанае і тлустае мяса, вэнджаныя каўбасы, субпрадукты (печань, язык, ныркі, мазгі і г.д.), кансервы. Рачная і марская рыба — у адвараным і запечаным выглядзе, селядзец — вымачаны. Ніякіх рыбных кансерваў, смажанай і вэнджанай рыбы. 1—2 яйкі ў дзень можна ўсмятку, у выглядзе паравых амлетаў, нельга смажаныя і сырыя яйкі. Супы — толькі ненаварыстыя з агародніны, крупяныя, мясныя, рыбныя, малочныя. Можна нятлустыя малако, смятану, тварог, кефір, масла сметанковае — абмежавана, варта забыцца на прадукты з павышаным утрыманнем тлушчу, на цвёрдыя сыры. Рэкамендуецца ў адвараным і запечаным выглядзе бульба, буракі, морква, памідоры, агуркі, салодкі перац, баклажаны, кабачкі, цвятная капуста. Нельга ўжываць свежую цыбулю, часнок, рэдзьку, радыску, шчаўе, шпінат, грыбы, марынаваную гародніну. Лепей — яблыкі, грушы, дыні, бананы, персікі, абрыкосы, някіслыя ягады, кавун, пры наяўнасці болевага сіндрому колькасць фруктаў і гародніны варта абмяжоўваць. Давядзецца выдаліць з рацыёну кашы і стравы з бабовых, прасяную кашу, але пакінуць — грэчневую, аўсяную, рысавую, манную кашы. З мучных вырабаў лепей белы нясвежы хлеб, сухары з белага хлеба, сухое няздобнае пячэнне, макаронныя вырабы (абмежавана), нельга ўжываць здобу і кандытарскія вырабы з крэмам. Можна свежаадціснутыя сокі, нямоцны чай з лімонам, кампоты, але не халодныя і газіраваныя напоі, канцэнтраваныя сокі, каву, алкагольныя напоі. Карыснымі будуць адвары аўса (1 шклянка аўсянай крупы на 3 шклянкі вады, настояць 10—12 гадзін, гатаваць 1,5 гадзіны, пакуль не застанецца 1/3 аб'ёму). Рэкамендуюцца прадукты, багатыя на калій. 1-ы дзень: чарнасліў ад 1 да 5 штук; 2-і дзень: печаная бульба з лупінай; 3-і дзень: курага ад 3 да 10 штук, маркоўны сок.

Наступленне неўралагічных хвароб

Згодна з новым дакладам Сусветнай арганізацыі па ахове здароўя, ад неўралагічных парушэнняў церпяць мільёны людзей ва ўсім свеце

Паводле даных гэтага дакумента, на неўралагічныя парушэнні — ад эпілепсіі да хваробы Альцгеймера, ад інсульту да галаўнога болю — хварэюць каля аднаго мільярда чалавек ва ўсім свеце. Да неўралагічных парушэнняў таксама адносяцца мазгавыя траўмы, нейраінфекцыі, рассеяны склероз і хвароба Паркінсона. 50 мільёнаў чалавек церпяць ад эпілепсіі і 24 мільёны — ад хваробы Альцгеймера і іншых відаў дэменцыі. Ад неўралагічных парушэнняў церпяць жыхары ўсіх краін, незалежна ад іх узросту, полу, адукацыі або даходу.

Паводле ацэнак экспертаў, штогод 6,8 мільёна чалавек памірае ў выніку неўралагічных парушэнняў, эканамічны кошт якіх толькі ў Еўропе ацэньваецца прыкладна ў 140—150 мільярдаў еўра.

Для многіх людзей з неўралагічнымі парушэннямі, іх сем'яў і тых, хто ажыццяўляе іх догляд, доступ да лячэння абцяжараны недахопам навучанага персаналу, адсутнасцю асноўных лякарстваў і шырокім распаўсюджаннем забабонаў. Таму арганізацыя заклікае ўключыць неўралагічную дапамогу ў першасную медыка-санітарную дапамогу. Для многіх людзей яна з'яўляецца адзіным даступным відам медыцынскай дапамогі. У такіх умовах урачы могуць праводзіць лячэнне на базе нескладаных тэхналогій, адзначаецца ў дакладзе.

На погляд экспертаў, па меры старэння насельніцтва ў свеце ўздзеянне неўралагічных хвароб будзе ўсё больш адчувацца як у развітых, так і ў краінах, якія развіваюцца. Цяжар неўралагічных парушэнняў становіцца значным у краінах, дзе расце доля насельніцтва, узрост якога перавышае 65 гадоў.

Леанід ТУГАРЫН.

Пінскдрэў

Закрытае акцыянернае таварыства «Пінскдрэў»:

ВЕКАВЫЯ ТРАДЫЦЫІ ЯКАСЦІ, ПРАВЕРАНЫЯ ЧАСАМ

АЙЧЫННАМУ ФЛАГМАНУ ВЫТВОРЧАСЦІ МЭБЛІ І ДРЭВААПРАЦОЎКІ — 127 ГАДОЎ

Закрытае акцыянернае таварыства «Пінскдрэў» у абсалютнай большасці айчынных вытворцаў мэблі і дрэваапрацоўкі выклікае станоўчыя асацыяцыі. І не толькі таму, што прадпрыемства мае вельмі паважаны сярод прамыславікоў «узрост» — больш за сотню з чвэрцю гадоў працоўнай біяграфіі. У большай ступені за тое, што пінчане за гэты час змаглі ўзняць дрэваапрацоўчую галіну рэспублікі ад ручной прымітыўнай тэхналогіі да самай моднай і сучаснай, удасканаліць шматпрофільную вытворчасць да небывалых раней вышынь. Тут надзвычай удала спляліся многія віды вытворчасцяў — мяккай і корпуснай мэблі, фанеры, ламінаваных і кашыраваных драўніннастружкавых пліт, габляванай шпоны, піламатэрыялаў, запалак... Гэта далёка не поўны спіс таварнай прадукцыі, якая штодня сыходзіць з канвеера ЗАТ «Пінскдрэў». Таварыства зараз можа лічыцца сапраўдным холдынгам-манстрам, яно асвоіла не толькі беларускія прасторы, але і рынкі некалькіх дзесяткаў краін свету.

Зараз на прадпрыемстве ідзе мэтанакіраваная і добрасумленная работа па далейшаму паляпшэнню якасці і пашырэнню асартыменту выпускаемай прадукцыі і ўкараненню сучасных дасягненняў навукі і тэхнікі ў сферы дрэваапрацоўкі, што ў далейшым дазволіць на роўных канкураваць з вядучымі вытворцамі мэблі на сусветным рынку, дасягаць заслужаных перамог на вытворчых франтах.

Сярод прыгажэйшай паловы калектыву шмат вопытных і аўтарытэтных працаўніц. Гэты сімвалічны фотамантаж знаёміць з прадстаўніцамі розных участкаў вытворчасці — намеснікам дырэктара па вытворчасці Людмілай ГАЛАХОЎСКАЙ, начальнікам вытворчасці — начальнікам ВДС Зояй ЖАЎЛАКОВАЙ, начальнікам вытворчасці запалкавай фабрыкі Валянцінай ГЛАВАЦКАЙ, выхавальніцай інтэрната і сакратаром мясцовай арганізацыі БРСМ Людмілай ТРУШ, эканамістам Наталляй КАЛІЛЕЦ.

Мэбляй *ЗАТ «Пінскдрэў»* абсталяваны многія аб'екты, у тым ліку і дзяржаўнага значэння. Сярод іх — Палац Рэспублікі, Нацыянальная бібліятэка, гасцініца «Мінск», гасцініца «Юбілейная», Палац спорту, гасцініца «Арбіта» (усе — г. Мінск), Лядовы Палац, Палац спорту (усе — г. Брэст), Палескі драмтэатр, інтэрнат Банкаўскага каледжа (усе — г. Пінск)

Вытворчасць мэблі

«Пінскдрэў» — буйнейшае ў рэспубліцы прадпрыемства па выпуску мэблі самага рознага прызначэння. Высокую якасць прадукцыі кампаніі пацвярджаюць сертыфікаты і шматлікія дыпломы вядучых профільных выстаў.

Узровень камфорту і якасць аказваемых паслуг — гэта важнейшы і рашаючы фактар, які ўплывае на вызначэнне класа, напрыклад, гасцінічнага нумара ці фае. Выбар дызайну інтэр'ера, абсталявання, мэбліроўкі залежыць ад агульнай тэматыкі гатэля, ад яго кліентаў, іх ведаў аб камфорце. Сучасным гасцям патрабуюцца зручнасці, якімі яны карыстаюцца дома: койка, крэсла альбо канапа, туалетны столік, тэлевізар, тэлефон... Усё гэта ў сваю чаргу павінна быць бяспечным, камфортным і надзейным у карыстанні. Мэбля маркі ***«Пінскдрэў»*** адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца як у гасцінічнай гаспадарцы, так і ў хатніх умовах незалежна ад узроўню камфортнасці і жылой плошчы.

Бяспека. Мэбля ***ЗАТ «Пінскдрэў»*** адпавядае ўсім патрабаванням ДАСТа, яна забяспечана сертыфікатамі адпаведнасці, гігіенічнымі пасведчаннямі, праходзіць поўны цыкл выпрабаванняў. На прадпрыемстве з 2003 года дзейнічае СМК СТБ ISO 9000-2001 (частка прадпрыемстваў ЗАТ «Пінскдрэў у 2006 годзе атэставана на экалагічную і пажарна-тэхнічную, а таксама і па тэхніцы бяспекі). Прычым, паняцце «бяспека» ўключае ў сябе не толькі экалагічную і пажарную бяспеку, але і агульную. Напрыклад, краі корпуснай мэблі апрацаваны па тэхналогіі «софтформінг» (закругленне тарцовых кромак).

Функцыянальнасць. Гэтая якасць з'яўляецца галоўнай пры распрацоўцы новага вырабу. Мэбля ***ЗАТ «Пінскдрэў»*** не толькі эстэтычная, яна таксама практычная і зручная ў карыстанні і адпавядае ўсім нормам эргаміомікі. Сярод набораў мяккай мэблі найбольш практычнымі лічацца мадэлі, якія выкананы ў натуральнай скуры: бруд і пыл з іх убіраецца з дапамогай вады і мыла, без выкарыстання спецыяльных хімічных сродкаў.

Трываласць. Прадпрыемствы-вытворцы мэблі, якія ўваходзяць у склад ***ЗАТ «Пінскдрэў»***, аснашчаны сучасным абсталяваннем лепшых еўрапейскіх фірмаў, на якіх мэбля вырабляецца па сучасных тэхналогіях з прымяненнем толькі сертыфікаваных камплектуючых і матэрыялаў вядучых замежных кампаній. Так, напрыклад, койкі ЗАТ «Пінскдрэў» аснашчаны трывалымі металакаркасамі, што забяспечвае іх устойлівасць і даўгавечнасць.

Прывабліваць. Зараз на прадпрыемстве ***«Пінскдрэў»*** выпускаецца звыш 1500 найменняў мэблі. Дызайн мадэляў распрацоўваецца дызайнерамі прадпрыемства з улікам тэндэнцый еўрапейскай моды. Тут не баяцца першымі выходзіць на рынкі з ультрамоднымі мадэлямі. У той жа час калекцыя мэблі ЗАТ ***«Пінскдрэў»*** налічвае вялікую колькасць мадэляў, выкананых у класічным стылі. Асартымент мэблі пастаянна абнаўляецца і папаўняецца перспектыўнымі распрацоўкамі.

Разнастайнасць. Кампанія ***«Пінскдрэў»*** прапануе калекцыі корпуснай мэблі разнастайных цэнавых катэгорый: эканом-класа — з ламінаваных драўніннастружкавых пліт (ЛДСП), бізнэс-класа з ЛДСП і МДФ, VIP-класа — з масіва і шпаніраваныя. Наборы мяккай мэблі таксама прадстаўлены шырокім мадэльным радам: у тканіне, у штучнай скуры ці натуральнай, у тым ліку з элітных скураных матэрыялаў.

На ***ЗАТ «Пінскдрэў»*** эфектыўна ўдасканальваецца сістэма арганізацыі вытворчасці, нармавання працы, актыўна вядзецца работа па абнаўленню асартыменту вырабаў шляхам тэхнічнай мадэрнізацыі вытворчасці. Усё энергічней прыцягваюцца інвестыцыі, у тым ліку замежныя, прадумана рэалізуецца канцэпцыя па прывядзенню ў адпаведнасць з аб'ёмамі вытворчасці колькасці працуючых, узмацняецца рэжым эканоміі матэрыяльных і энергетычных рэсурсаў, узмацняецца дысцыпліна і парадак.

Гэтыя і іншыя дзеючыя меры дазваляюць калектыву ЗАТ «Пінскдрэў» выстойваць у жорсткай канкурэнтнай барацьбе, трывала ўтрымліваць імідж перадавога прадпрыемства галіны.

ЗАТ «Пінскдрэў» — адно з вядучых горадаўтваральных прадпрыемстваў г. Пінска, якое зараз выпускае звыш 1500 найменняў разнастайнай мэблі (на яго долю прыходзіцца 35 працэнтаў таварнай прадукцыі, 47 працэнтаў экспарту і амаль 21 працэнт гарадскогу бюджэту).

Прадпрыемства сёння не толькі буйнейшы ў рэспубліцы вытворца піламатэрыялаў, ДСП, запалак, але і мэблі рознага прызначэння — для офісаў, кватэр, навучальных установ, бараў, рэстаранаў, гасцініц.

ЗАТ «Пінскдрэў» — гэта:

- Пінскі леспрамгас;
- дрэваапрацоўчы камбінат;
- завод ДСП;
- лесапільны завод;
- запалкавая фабрыка;
- фанерны завод;
- камбінат корпуснай мэблі;
- камбінат мяккай мэблі;
- завод габляванай шпоны і мэблі;
- фабрыка экспартнай мэблі;
- крэславая фабрыка;
- фабрыка сталоў;
- Гарадзішчанская мэблевая фабрыка;
- СТАА «Пінскдрэў-Адрыяна»;
- СТАА «Бел-Эст-Мэбля»;
- ПВУП «Пінскдрэў-Еўрамэбля»,

а таксама шэраг прадпрыемстваў, службаў, аддзелаў, груп і падраздзяленняў, якія штодня забяспечваюць вытворчы рытм ***закрытага акцыянернага таварыства «Пінскдрэў»***.

ЗАТ «Пінскдрэў» знаходзіцца ў дзівосна прыгожым горадзе Пінску — сталіцы Беларускага Палесся — знакамітым гістарычнымі падзеямі і архітэктурнымі збудаваннямі.

ЗАТ «Пінскдрэў» трывала займае вядучае месца ў дрэваапрацоўчай галіне краіны і амаль дзесятак гадоў пацвярджае ганаровае званне флагмана рэспублікі па вытворчасці мэблі і дрэваапрацоўцы. Прадпрыемства вырабляе больш за 30 працэнтаў мэблі, амаль 37 працэнтаў клеянай фанеры, звыш 26 працэнтаў — ДСП, больш за 45 працэнтаў — запалак і звыш 30 працэнтаў — габляванай шпоны ад агульнага аб'ёму вытворчасці ўсіх прадпрыемстваў канцэрна «Беллесбумпрам», і 37 працэнтаў экспарту прадукцыі і дрэваапрацоўкі і мэблі галіны. Пры гэтым тэмпы росту аб'ёму экспарту ў доларах ЗША ў 2006 годзе склалі звыш 122 працэнтаў.

На здымках:
1. На гэтым участку дзейнічае высокапрадукцыйная ўстаноўка для сушкі шпоны.
2. Брыгадзір станочнікаў Генадзь ГАРОШКА.
3. Абіўшчыца мэблі Ірына Гурына і прадукцыя, з якой яна працуе штодзень.
4. На ўчастку абіўкі мяккай мэблі СТАА «Пінскдрэў-Адрыяна» працуе Алег ГРЫШКО.
5. Загадчыца секцыі салона мэблі Яна КАТОВІЧ заўжды дапаможа зрабіць патрэбную пакупку.
6. Фанера — што трэба!

Матэрыялы рэкламна-інфармацыйнай старонкі падрыхтаваў Уладзімір ЗДАНОВІЧ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіва прадпрыемства.

У рамках дзяржаўнай праграмы энергазберажэння і эканоміі на ***ЗАТ «Пінскдрэў»*** укараняецца сістэма ацяплення, падагрэву вады для вытворчых патрэб за кошт драўнінных адходаў. Тут наладжваецца вытворчасць пілет — моцна спрасаваных драўнінных адходаў дыяметрам са спагеці і даўжынёй крыху менш за звычайную запалку. Дзякуючы такой вытворчасці расход паліва на ўсёй вытворчасці зменшыцца ў 3—4 разы.

Для параўнання: 2 кубічныя метры пілет замяняюць 1000 кубічных метраў газу. Вытворчасць пілет будзе запушчана з II паўгоддзя.

Адметна, што першыя гады новага стагоддзя сталі вельмі прадуктыўнымі ў плане пашырэння і тэхнічнага пераўзбраення прадпрыемстваў:

- ***узведзена прыбудоўка для вытворчасці мэблі на заводзе габляванай шпоны і мэблі;***
- ***пабудаваны і запушчаны ў вытворчасць цэх ламінавання пліты ДС;***
- ***пабудаваны, аснашчаны і запушчаны ў вытворчасць цэх дрэваапрацоўкі па вытворчасці шчыта з масіўнай драўніны на лесазаводзе;***
- ***праведзена мадэрнізацыя фанернага завода з павелічэннем магутнасці на 50 працэнтаў;***
- ***праведзена мадэрнізацыя запалкавай фабрыкі з паляпшэннем якасных паказчыкаў і павелічэннем магутнасці на 30 працэнтаў;***
- ***завершана рэканструкцыя СП «Бел-Эст-Мэбля» з павелічэннем магутнасці на 100 працэнтаў;***
- ***завершана рэканструкцыя крэславай фабрыкі з павелічэннем магутнасці на 100 працэнтаў.***

На прадпрыемстве ЗАТ «Пінскдрэў» працуе звыш 5500 чалавек.
Кампанія ўключае ў сябе 33 прадпрыемствы, а прамысловыя плошчы складаюць 737 000 квадратных метраў.

На СТАА «Пінскдрэў-Адрыяна» выпускаецца мяккая мэбля.

ФІРМЕННЫ ГАНДАЛЬ

Фірменны гандаль ЗАТ «Пінскдрэў», створаны па ініцыятыве генеральнага дырэктара, пачаў сваю дзейнасць з 1992 года з адзінага магазіна. Сёння ўвесь фірменны гандаль увасабляе буйное прадпрыемства «Гандлёвы Дом ЗАТ «Пінскдрэў» .

Асноўныя задачы фірменнага гандлю:

- забеспячэнне высокага ўзроўню абслугоўвання насельніцтва, рэалізацыя ў шырокім асартыменце прадукцыі і камплектуючых вырабаў, спадарожных тавараў, укараненне прагрэсіўных формаў і метадаў рэалізацыі гандлю;
- вывучэнне спажывецкага попыту, падрыхтоўка прапаноў па абнаўленню асартыменту выпускаемых тавараў, паляпшэнню якасці і павышэнню іх канкурэнтаздольнасці;
- дастаўка тавараў пакупнікам, зборка і ўстаноўка вырабаў, гарантыйнае і паслягарантыйнае абслугоўванне, аказанне іншых паслуг, звязаных з гандлёвым абслугоўваннем насельніцтва.

Прадстаўніцтвы ЗАТ «Пінскдрэў» у Рэспубліцы Беларусь

- г. Мінск, вул. М. Танка, 16. тэл. (+375-17) 206-43-27
- г. Магілёў, вул. Залуцкага, 21, тэл. (+375-222) 45-74-11
- г. Брэст, вул. Кірава, 52/1, тэл. (+375-162) 23-66-97
- г. Гродна, вул. Горкага, 22, тэл. (+375-152) 75-10-95
- г. Віцебск, вул. Церашковай, 3, тэл. (+375-212) 26-76-00
- г. Гомель, пр. Леніна, 3, тэл. (+375-232) 53-58-24
- г. Слуцк, вул. Сацыялістычная, 144, тэл. (+375-1795) 5-40-03
- г. Пінск, вул. Брэсцкая, 23, тэл. (+375-165) 35-32-08

Гандлёвыя дамы ў краінах СНД

- Расія: г. Масква, г. Калінінград, г. Смаленск
- Украіна: г. Кіеў, г. Запарожжа, г. Лазовая

Дылеры

- **Расія:** 11 адрасоў у гарадах Паўночна-Заходняга, Прыволжскага, Паўднёвага і Сібірскага Федэральных акругоў
- **Казахстан:** 5 адрасоў у розных гарадах краіны
- **Украіна:** 3 адрасы
- **Малдова:** 2 адрасы
- **Таджыкістан:** 1 адрас
- **Узбекістан:** 1 адрас
- **Краіны Прыбалтыкі**: 2 адрасы

Сёння ***ЗАТ «Пінскдрэў»*** — гэта шматпрофільнае прадпрыемства, якое мае амаль усе накірункі ў дрэваапрацоўцы і вырабе мэблі, аснашчанае сучасным абсталяваннем і еўрапейскімі прагрэсіўнымі тэхналогіямі, кампанія з адпаведнымі сацыяльнымі ўмовамі працы і быта.

ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА ЗАЦІКАЎЛЕНЫЯ БАКІ

Нашы рэквізіты:
ЗАТ «Пінскдрэў», 225710
Рэспубліка Беларусь, г. Пінск, вул. І. Чуклая, 1
Тэл.: (+375-165) 36-49-07; 35-04-98; 35-06-46
Internet:www.pinskdrev.by
E-mail:box@pinskdrev.by

З ГІСТОРЫІ

Свайму нараджэнню ***ЗАТ «Пінскдрэў»*** у сённяшнім абліччы абавязаны аўстра-венгерскім капіталістам братам Лур'е — Ліпу і Аляксандру. Менавіта яны ў 1880 годзе вырашылі выгадна ўкласці свае грошы на пінскай зямлі, стварыўшы фабрыку абутковых шпілек і фанерных скрыняў. Зрэшты, за новаспечанай назвай фабрыкі па сутнасці праглядвалася звычайная мануфактурная майстэрня. Тым не менш гэта ні ў якім разе не змяншае значнасць падзеі, якая стала пачаткам самага буйнога ў Беларусі і аднаго з буйнейшых ў Еўропе дрэваапрацоўчага камбіната.

Канец XIX стагоддзя ў Пінску на базе дзеючага шпілечнага прадпрыемства быў азнаменаваны стварэннем яшчэ і фабрыкі па вытворчасці запалак, крыху пазней — Пінскай шпілечна-фанернай фабрыкі.

Далейшыя пераўтварэнні, у тым ліку і грандыёзныя, прыйшліся на XX стагоддзе. Гэта быў няпросты час для завода. Давялося перажыць дзве сусветныя вайны, падчас якіх вытворчыя карпусы былі разгромленыя і разграбленыя, пасля чаго зноў і зноў адраджаліся...

Першая назва сённяшняй гандлёвай маркі ***«Пінскдрэў»*** была агучана ў 1971 годзе, калі на базе фанерна-запалкавага камбіната стварылася вытворчае дрэваапрацоўчае аб'яднанне ***«Пінскдрэў»***. Асноўныя пераўтварэнні са станоўчай дынамікай прыйшліся на сярэдзіну 80-х гадоў, калі далёка не перадавое прадпрыемства дрэваапрацоўчай галіны рэспублікі ўзначаліў Ларан Арыніч. Гэта быў 1983 год. Ларан Сцяпанавіч не любіць выстаўляць свае заслугі перад калегамі і параўноўваць іх з нейкім подзвігам. Хоць сённяшняму капітану ***ЗАТ «Пінскдрэў»***, які амаль чвэрць стагоддзя трымае ўпэўнена курс у няпростым вірлівым жыцці, ёсць што ўспомніць са сваёй «камандзіроўкі» з перадавой Гродзенскай мэблевай фабрыкі з паста кіраўніка на ***«Пінскдрэў»***. Старажылы прадпрыемства расказваюць, што першы крок новага шэфа на прадпрыемстве быў вельмі арыгінальны — ён купіў сабе гумавыя боты, каб камфортна абыходзіць тэрыторыю прадпрыемства... Такі падыход да справы першай асобы прымусіў увесь кадравы склад камбіната перагледзець сваю пазіцыю да дысцыпліны, прафесійных навыкаў і проста сумленнасці да працы. Маштабы работы і высокая арганізацыя працы за даволі кароткі тэрмін прывялі ***«Пінскдрэў»*** да пастаяннай стабільнасці і ў свядомасці кожнага работніка заклалі паняцце лідарства. Няважна пры якой форме ўласнасці прадпрыемства — вытворчае аб'яднанне, калектыўнае аб'яднанне, закрытае акцыянернае таварыства. Дарэчы, апошнюю назву ***«Пінскдрэў»*** носіць з 2000 года.

Рубрыку вядзе Мікола ДЗЯВЁЛА.

аўта аматар

Аўтабяспека

ГУЛЯЦЬ ДЫК ГУЛЯЦЬ?

За мінулыя святочныя і выхадныя дні супрацоўнікамі ДАІ затрыманы 610 нецвярозых вадзіцеляў і 1390 — прыцягнуты да адказнасці за перавышэнне хуткасці.

Такую інфармацыю паведамілі ва ўпраўленні Дзяржаўтаінспекцыі МУС краіны. Увогуле за памянёны перыяд было зафіксавана 6270 парушэнняў Правілаў дарожнага руху. Смяротнымі ахвярамі ДТЗ сталі 8 чалавек, яшчэ 46 — атрымалі раненні. Супрацоўнікі ДАІ аказалі дапамогу 1065 п'яным пешаходам, якія знаходзіліся на праезнай частцы і маглі стаць ахвярамі ДТЗ.

Аўтапрам

ВЯЛІКАЯ ФРАНЦУЗСКАЯ МАРА

У серыйную вытворчасць запушчаны першы французскі ўсюдыход «Peugeot 4007».

Паколькі французы не мелі вопыту распрацоўкі красавераў, то дапамогу ў падрыхтоўцы тэхналагічнай базы «Peugeot 4007» ім аказалі спецыялісты японскага канцэрна «Mitsubishi». Продаж французскіх усюдыходаў пачнецца ў бліжэйшы час. Прыблізны кошт аўтамабіля для еўрапейскіх спажыўцоў складзе каля 30 тысяч еўра.

Аўтасалон

ЭКАЛОГІЯ І ЭКАНОМІЯ

Лейтматывам сёлетняга Жэнеўскага аўтасалона стала дэманстрацыя машын, якія спажываюць мінімум паліва і не забруджваюць навакольнае асяроддзе.

Практычна ўсе буйнейшыя вытворцы аўтамабіляў прадставілі транспартныя сродкі на альтэрнатыўным паліве. Удзел у аўтасалоне бяруць 250 аўтамабільных кампаній. Наведвальнікі, а іх па падліках арганізатараў будзе не менш за 700 тысяч, убачаць 80 «аўтапрэм'ер». Аўтамабільная выстава завершыцца 18 сакавіка.

Аўтарэйтынг

ТРОЙКА ПРЭТЭНДЭНТАЎ

Вызначаны фіналісты на званне лепшага аўтамабіля ў свеце.

Першапачаткова на гэты тытул прэтэндавалі 28 машын. Прадстаўнічае журы выбрала тройку лепшых. Такім чынам за «аўтамабільную карону» будуць змагацца «Audi TT», «Lexus LS460» і «MINI». Пераможца будзе аб'яўлены 5 красавіка падчас Міжнароднага аўтасалона ў Нью-Йорку.

Аўтатэхналогія

МЕТАМАРФОЗЫ АД «GENERAL MOTORS»

Амерыканскі канцэрн «General Motors» плануе праз 3 гады распачаць вытворчасць аўтамабіляў, якія будуць самаднаўляцца пасля аварый і нават мяняць колер.

Уладальніку «пабітага» аўто дастаткова будзе націснуць адпаведную кнопку і «жалезны конь» зноў будзе як новенькі. Сакрэт «аўтаметамарфозаў» у тым, што спецыялісты GM будуць выкарыстоўваць гэтак званыя «разумныя матэрыялы», здольныя лёгка мяняць форму.

Аўтапрагноз

ЛАНЦУГОВАЯ РЭАКЦЫЯ

Негатыўны ўплыў на сітуацыю на дарогах па-ранейшаму будуць аказваць неспрыяльныя ўмовы надвор'я, а таксама няўважлівасць вадзіцеляў і пешаходаў. Да гэтых фактараў рызыкі могуць далучыцца таксама і адзінкавыя выпадкі парушэння Правілаў дарожнага руху, якія стануць прычынай цэлага ланцуга аварый.

14 сакавіка вялікае значэнне для забеспячэння бяспекі на дарогах будзе мець строгае выкананне патрабаванняў знакаў і сігналаў рэгуліроўшчыка. На пачатку дня аварыйныя сітуацыі з удзелам пешаходаў могуць прывесці да пажараў. Вадзіцелям транспартных сродкаў рэкамендуецца адмовіцца ад складаных манеўраў на вялікай хуткасці, асабліва за межамі населеных пунктаў. Увечары не вельмі ўпэўнена будуць адчуваць сябе на дарогах жанчыны.

15 сакавіка небяспечныя сітуацыі могуць узнікнуць па віне пешаходаў. Таксама вялікая верагоднасць аварый з удзелам нецвярозых удзельнікаў дарожнага руху.

16 сакавіка гарантыяй бяспекі для ўсіх удзельнікаў дарожнага руху, асабліва на пачатку сутак, будзе правільны выбар хуткасці на складаных участках магістраляў. Пешаходам і веласіпедыстам рэкамендуецца не спяшацца ў месцах інтэнсіўнага руху транспартных сродкаў. Раніцай і ўвечары верагоднасць узнікнення аварый за межамі гарадоў можа павялічыцца з-за нездавальняючага стану дарог.

17 сакавіка ў першай палове сутак вельмі нізкая верагоднасць ДТЗ. А вось бліжэй да паловы дня ўсім удзельнікам дарожнага руху трэба праявіць павышаныя меры бяспекі ў зоне шматлюдных пешаходных пераходаў і выхаду з метро.

18 сакавіка зоркі раяць кожнаму ўдзельніку дарожнага руху быць надзвычай уважлівым і запомніць узніклыя раней небяспечныя сітуацыі. Гэта своеасаблівыя папярэджванні аб верагоднасці іх паўтарэння ў больш жорсткім варыянце.

Аўтакур'ёз

БЯСПРАЎНАЯ АДЫСЕЯ

Жыхар французскага горада Нант 57 гадоў кіраваў аўтамабілем не маючы вадзіцельскага пасведчання.

Магчыма, гэтая бяспраўная адысея працягвалася б і далей, калі б 78-гадовы пенсіянер не здзейсніў ДТЗ. Паліцэйскія, якія даставілі парушальніка ў пастарунак, высветлілі, што дзядуля не толькі моцна п'яны, але і амаль 60 гадоў ездзіць без правоў.

Аўтажарт

Памерлі адначасова вадзіцель аўтобуса і святар. Вадзіцель адразу ж трапіў у рай, а святара не пускаюць.

— Божа літасцівы, тут нейкая памылка. Мяне павінны неадкладна прапусціць у рай, а гэтага грэшніка-вадзіцеля адправіць у пекла, бо я — твой верны слуга, а ён — п'яніца і бязбожнік, — тлумачыць святар. А Бог яму ў адказ:

— Затое на тваіх пропаведзях людзі спалі, замест таго, каб маліцца. А ў яго аўтобусе яны маліліся, замест таго, каб спаць.

АСАБЛІВАСЦІ ВЯСНОВАГА ШОПІНГУ

Памятаю, у школе на ўроках англійскай мовы мы вывучалі тэму «шопінг». Расказ пра пакупкі ўсім даваўся вельмі складана, прынамсі, тады, у маім савецкім юнацтве. Трэба было ведаць назвы розных аддзелаў у крамах, вялікую колькасць слоў, якія абазначалі тавары — з прадуктаў і вопраткі. Складанасць была ў тым, што мы ў прынцыпе не ведалі, што азначаюць многія словы нават на нашай роднай мове. Такога не елі і не насілі. І можа таму раслі вялікімі патрыётамі, якія люта ненавідзелі буржуазны лад жыцця: яны, бачыце, шыкуюць, а ў нашым раённым універмагу стандартны набор тавараў...

Цяпер я вырасла і ўсё змянілася. Сам шопінг і расказ пра яго па-англійску не ўяўляецца фатальна безнадзейным. Паходы за пакупкамі сталі даволі звычайнай справай. Праўда, падставы для дэпрэсіі ёсць і з гэтым даступным сучасным шопінгам.

Вось і яна: вечная жаночая праблема —— «мне няма чаго апрануць». З першымі промнямі вясны яна абвастраецца. Мая шафа набітая да канца. Усе паліцы занятыя. Свабодных вешалак няма. Але кожную раніцу я стаю перад ёю і разумею, што нічога добрага яна мне не адкажа. У яе для мяне нічога няма. Мне сапраўды няма чаго апрануць. Ну абсалютна!.. Як можна радавацца жыццю ў такіх умовах?

Гэта той самы выпадак, калі клін клінам выбіваюць. Пазбавіцца ад вясновай дэпрэсіі прасцей за ўсё менавіта падчас шопінгу. Адзін з найбольш эфектыўных сродкаў барацьбы з дрэнным настроем для жанчын, сцвярджаюць псіхолагі. Ён пакідае далёка ззаду нават такія праверэныя сродкі, як шакалад і марожанае.

Кажуць, жанчына не можа патрапіць у дэпрэсію, калі ў яе ёсць хоць колькі грошай, каб прайсціся па бліжэйшых крамах. Асабліва прыемна набыць што-небудзь простае і непатрэбнае, што нагадвае яшчэ раз пра нашу жаночую прыроду.

«А ці ведаеце вы, што блуканне па крамах абыходзіцца нашмат танней, чым паслугі псіхааналітыка?» — пытае Аманда Форд, жанчына з вялікім пакупніцкім стажам, якая яму ж прысвяціла цэлую кнігу. У жартаўлівай манеры яна разважае аб уроках жыцця, якія засвойвала ў працэсе шопінгу: як навучыцца рабіць правільныя і прыемныя пакупкі, як дазволіць сабе купляць тое, што хочацца...

Вось начытаешся такога... І захочацца здзейсніць рэвалюцыю. Таму што ў нас паход па крамах ператварыўся ў жаночы від спорту, прычым, лёгкай атлетыкай яго наўрад ці назавеш, асабліва калі імкнешся данесці дадому пакет з прадуктамі, які (вось зараза!) яшчэ і рвецца ў самы непрадказальны момант. Але каб хоць раз атрымаць ад гэтага сапраўднае задавальненне, пра якое гавораць замежныя прафесіяналы...

Усё, першы вясновы заробак патрачу толькі на сябе, хіба я не жанчына!? Для большасці з нас грунтоўны паход па пакупкі арганізуецца з прычыны непазбежнага і неабходнага абнаўлення гардэробу. Па правілах цывілізаванага шопінгу, у гэтай справе муж ці сябра павінен удзельнічаць толькі ў якасці кашалька. На тым і пагадзіліся.

Узброіўшыся парадамі Аманды, я ўпэўнена крочу да шапіка з рознымі глянцавымі часопісамі: для таго, каб паход атрымаўся прадуктыўным, спачатку трэба вывучыць апошнія модныя тэндэнцыі. У кожным з часопісаў яны чамусьці асаблівыя, таму, набраўшы стос, лезу ў кашалёк. Ён тут як тут: «Дык, можа, гэтым і абмяжуемся? Сума ўжо кругленькая...» Але гэта толькі пачатак. Кашалёк мяне не разумее. Ужо можна было аплаціць электрычнасць за месяц, ці набыць праязны на метро і адкласці на маршрутку, некалькі разоў схадзіць у кіно ці тэатр, урэшце набыць дарагія полівітаміны, якія дакладна пайшлі б на карысць.

Затое мяне разумее сяброўка. У яе тая ж праблема, плюс непаразуменні на працы. Хочацца развеяцца, ні пра што не думаць. Мы працягваем разам блуканне па крамах, якія абяцаюць распродажы. Гламурная прафесіяналка шопінгу звар'яцела б дакладна, калі б пайшла адсюль ні з чым. А я радуюся: атрымала задавальненне ад таго, што прымярала шыкоўныя дарагія рэчы, нарэшце адчула сябе сапраўднай топ-мадэллю і пры гэтым зберагла грошы. Хочаце верце, хочаце не, але маёй спадарожніцы здалося, што ўсё гэта не вельмі мне пасуе. Нарэшце яна мяне ацаніла ў поўнай красе!.. Прычым далося мне гэта абсалютна бясплатна.

Можа, каб не вярнуцца дадому з пустымі рукамі, браць з сабой на шопінг маму? Хто-хто, а яна заўсёды хоча, каб дачка выглядала добра, купляла да кожнага сезона штосьці новае. Пры гэтым яна параіць ісці на кірмаш, дзе ўсё танней. І з выбарам тут усё проста, калі ўлічыць канфлікт пакаленняў: кажа, што нясціплая сукенка і надта адкрытая — каханаму дакладна спадабаецца, трэба браць. Яшчэ і на боты застанецца...

Замежным пакупніцам-крамаманкам нас не зразумець. Нашы жанчыны ніколі не патрацяць грошай больш, чым ёсць у кішэні, папярэдне адклаўшы на квартплату, тэлефон, харчаванне і яшчэ на ўсякі непрадказальны выпадак. Таму што колькі б ні даваў сабе слова, што купіш усё, што захочаш, разумееш, што ты не Вікторыя Бэкхэм і не Брытні Спірс. Яны могуць дазволіць сабе купляць усё, на што вока глянула і не думаць пра цану. І сучасная хвароба крамаманіі (залежнасці ад пакупак) большасці з нас наўрад ці пагражае. Таму што збіраючыся за пакупкамі, мы заўсёды ведаем, колькі можам патраціць і што дакладна трэба набыць, калі ўвогуле не склалі спіс неабходных набыткаў. Калі такі спіс амаль увесь будзе складацца з прадуктаў, жанчына хутчэй за ўсё вернецца дадому задаволенай. І гэтаму нават ёсць навуковае тлумачэнне.

Нямецкія вучоныя ў выніку двухгадовых даследаванняў прыйшлі да высновы, што падчас паходаў па крамах разумовая актыўнасць жанчын-пакупніц роўная нулю. Збіраючыся зрабіць пакупку, яны ў гэты момант не могуць адэкватна на што-небудзь рэагаваць і тым больш думаць. Папросту, яны расслабляюцца. У момант шопінгу арганізм вырабляе «гармоны радасці» — эндарфіны. А іх проста так не купіш ні за якія грошы.

Чаму пакупкі падымаюць настрой? Па-першае, мы ідзём траціць грошы, а гэта адказнасць. Адказнасць за пакупкі прымушае розум адхіліцца ад таго, што ёсць на душы набалелага. Ідзе пазбаўленне ад стрэсу. Па-другое, прыгожыя вітрыны прымушаюць забываць на ўсё на свеце. У тым ліку на крыўдныя словы і праблемы на працы, якія сапсавалі настрой. Калі чалавек робіць набыткі, у яго павышаецца самаацэнка. Трэцяе: рэальныя вынікі наведвання крам у выглядзе новага прыгожага адзення. А з новай сукенкі пачынаецца новае жыццё, у якім няма старых праблем.

Шопінг — сёння не праблема. Як і яго адсутнасць у жыцці многіх людзей. Шчаслівыя — яны ўмеюць атрымліваць радасць ад простых звычайных рэчаў, не ўкладваючы ў іх ні капейчыны, а толькі сваю душу. Найлепшае выйце з розных непрыемнасцяў. Але для тых, хто імкнецца стварыць сабе штучную радасць, прайшоўшыся па крамах, ёсць усёгакі пэўныя законы. Я для сябе знайшла іх не ў «правільных» кнігах, а выключна вопытным шляхам.

Вось адзін з іх: калі заходзіш у краму, каб развеяць дрэнны настрой, не варта набываць больш за адну рэч. Эфект задаволенасці ад пакупкі сімпатычнай таннай драбязы ў гэтым выпадку будзе такі ж, як ад 10 сукенак і футра ў прыдачу. Інакш застаецца адчуванне выкінутых на вецер грошай, і жаданне насіць рэчы, выбраныя ў змрочным настроі, наўрад ці будзе. Ці не імі перапоўнена мая шафа зараз?..

Далей — болей. Чалавечая істота лёгка ператвараецца ва ўючную жывёліну, якая можа ўзяць і панесці столькі, колькі б ні далі. Вось толькі ці варта браць? Сёння на чалавека абрушылася вялікая колькасць спосабаў уздзеяння, іх мэта — прымусіць зрабіць імпульсіўную пакупку. Калі сказаць больш проста — купіць тое, без чаго лёгка можна абысціся. Спецыялісты па маркетынгу добра ведаюць, што больш за палову пакупак робяцца якраз імпульсіўна —прыйшоў, убачыў, набыў. Рэклама, сучасныя тэхналогіі продажу разлічаны на падсвядомасць, інстынкты чалавека. Яны заснаваныя на выкарыстанні пачуццяў пакупнікоў, не заўсёды самых лепшых.

Наўрад ці вас здзівіла б падобная размова прадаўца з пакупніком: «Гэта апошні экзэмпляр застаўся, усё ўжо раскупілі. Завозу такога тавару больш не будзе. Потым будзеце шкадаваць, што не набылі...»

Ці такая: «У нас самыя нізкія цэны. Вы ж паглядзіце, усё даражэе. Што тыя грошы...»

Альбо вось так: «Рэч таго каштуе. Я нават сабе купіў». Многія прадаўцы для наглядносці апранутыя ў тое, што самі прадаюць.

Яшчэ адзін стопрацэнтны варыянт апрацоўкі кліента: «Ваш густ бездакорны! На вас выдатна глядзіцца. Упершыню бачу, каб так цудоўна сядзела...» Прымітыўная лісцівасць, а які вынік!

Найлепшае выйсце ў такіх выпадках — ветліва адмовіцца ад дапамогі прадаўцоў, не паказвацца ім на вочы, прымяраючы што-небудзь. Не ўступаць у размовы і спрэчкі, не тлумачыць, чаму не падабаецца тавар. Проста канстатуйце — не падабаецца і ўсё! Сапраўды, цяжка сказаць «не» ў адказ на цудоўнае абслугоўванне. Але можна прызнаць сваю (!) памылку. Маўляў, я вінаватая, прычыніла вам столькі клопатаў, а сама памылілася з выбарам фасону, колеру, матэрыялу і гэтак далей. Можна нават папрасіць прабачэння за тое, што на вас патрацілі столькі часу дарэмна. І міла разысціся. Каб пазбавіцца небяспекі прыйсці дадому ў дрэнным настроі. А то дзеля чаго тады гэта ўсё ўвогуле патрэбна?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ёсць жанчыны, якія крамамі і супермаркетамі падмяняюць музеі, дзе гадзінамі праводзяць даследаванне паліц і вешалак. Здаецца, менавіта тут рэалізуецца іх жыццё, тут яны знаходзяць стымул для працы, адначасова форму адпачынку і тэрапію, а паход па абноўкі становіцца для іх назойлівай ідэяй. І ў такіх выпадках я разумею мужчын, якія шалеюць ад таго, што іх палавіна гадзінамі падбірае шалік для новага паліто. Але гэта не прыкмета жаноцкасці, а прыкмета чагосьці іншага. Няма больших клопатаў...

А ёсць жанчыны, якія ідуць у краму ці на кірмаш таму, што гэта неабходна рабіць час ад часу. Тут жа знаходзяць патрэбны памер, колер і яшчэ купляюць нешта сваім каханым. Тыя часам толькі робяць выгляд, што іх уся гэтая мітусня надта напружвае, а розныя неабавязковыя дробязі раздражняюць. Яны таксама бываюць рады абноўкам і любяць прыемныя дробязі, якія здольныя ўзнімаць настрой. Дык няхай дораць нам неназойлівую вясновую тэрапію.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ПАШПАРТ ДЛЯ ЧАТЫРОХНОГАГА СЯБРА

Чыпіраванне, або ідэнтыфікацыя жывёл становіцца больш папулярным. За апошнія тры гады ў сталіцы больш за тысячу жывёл сталі ўладальнікамі электроннага пашпарта — мікрачыпа-імплантанта.

Як расказаў карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» ветурач Мінскай гарадской ветэрынарнай станцыі Іван Глаз, усе жывёлы, якія падарожнічаюць праз межы Еўрасаюза, павінны мець электронную ідэнтыфікацыю. Чып — гэта мікрасхема, якая змешчана ў асобую капсулу і ўтрымлівае пятнаццацізначны лічбавы код, што гарантуе абарону ад падробак. Нумар мікрачыпа заносіцца ў кампʼютарную базу даных разам з поўнымі звесткамі аб жывёле, а таксама адрасам і тэлефонам гаспадара.

Чыпіраванне сабак і кошак дазваляе пазбегнуць падмены элітных жывёл на выстаўках і ў час падарожжаў, а таксама палегчыць пошук уладара ў выпадку страты жывёлы.

У Беларусі чыпіраванне праводзіцца пакуль толькі ў сталіцы.

Надзея ЛІСАВА, *«Мінск—Навіны».*

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» РЕАЛИЗУЕТ:

Вниманию покупателей!

Предприятие «Белспецконтракт» объявляет о снижении цен на следующую технику и имущество:
— автомобили и спецтехника: ***автоцистерны, топливозаправщики, маслозаправщики, перекачивающие станции горючего, прицепы-цистерны и т.д.***
— приборы: ***вольтметры, ваттметры, амперметры, измерительные линии, частотомеры и многое другое.***

АВТОМОБИЛЬНАЯ ТЕХНИКА
1. А/м УАЗ — 1500000-4960000 руб.
2. А/м ГАЗ — 2000000-4500000 руб.
3. А/м ЗИЛ — 1840000-5830000 руб.
4. А/м «УРАЛ» — 3860000-12500000 руб.
5. А/м КаМАЗ — 7960000-10765000 руб.
6. А/м КрАЗ — 5000000 руб.
7. Трактор Т-150К — 11020000 руб.
8. Трактор ДТ-75 — 3700000-4100000 руб.
9. Прицепы и п/прицепы — 645000-3500000 руб.
10. Автомобильные двигатели — 591000-880000 руб.
11. А/кабины — 97100-144000 руб.
12. Комплект №6 ГАЗ-66 — 22686000 руб., **а также запчасти и ремкомплекты к ним — всего порядка 300 позиций.**

ИМУЩЕСТВО РАКЕТНО-АРТИЛЛЕРИЙСКОГО УПРАВЛЕНИЯ
1. Изделие 8Т311 на шасси ЗИЛ-131 — 2700000-2800000 руб.
2. Автокран 9Т31М на шасси УРАЛ-375 — 5600000 руб.
3. А/ш КРАЗ-255Б — 8000000 руб.
4. А/ш ЗИЛ-131 — 2500000-3900000 руб.
5. Прицеп 1-П-1,5 — 410000 руб.
6. Шасси 1-П-2,5 – 480000руб.
7. Шасси 2-ПН-2 — 450000-730000 руб.
8. Агрегат бензоэлектрический АБ-4-П/115 — 200000-760000 руб.
9. Электростанция ЭСД-2-12 на пр. 2-ПН-2 — 1130000-7000000 руб.
10. Двигатель Д21А – 900000руб.
11. Кузов-фургон КМ66ДС — 420000 руб.
12. Токарно-винторезный станок ИТ-1М — 7350000 руб.
13. Электроточило ЭТ-2801 — 65000 руб.
14. Настольно-сверлильный станок НС-12А — 330000 руб.
15. Стол слесарный складной 165х65 — 70000 руб.
16. Насос БКФ-4 — 5000 руб.
17. Генератор ацетиленовый АСП-10 — 60000 руб.
18. Устройство зарядно-разрядное УЗР-15УЗ — 80900 руб.
19. Унифицированное зарядно-распределительное устройство УЗРУ — 2100000 руб.
20. Агрегат сварочный УДГ-301У — 350000 руб.
21. Таль электрическая ЭТС — 600000-1000000 руб.
22. Сварочный преобразователь ПД-502 — 200000 руб.
23. Универсально-фрезерный станок — 930000 руб.
24. Агрегат питания АБ2-0/230-М1 — 290000-800000 руб.
25. Двигатель УД25Г/УД2 — 150000-280000 руб.
26. Баллон емк. 40л. — 22000 руб.
27. Тиски слесарные 80-125мм — 43000 руб.
28. Мачта «Унжа-2» — 5000000 руб.
29. Мачта с редуктором подъема ПСК-25 — 5000000 руб.

ИМУЩЕСТВО ВВС И ВОЙСК ПВО
1. Двигатель ТВ3-117 МТ — 16500000-75000000 руб.
2. ДвигательТВ3-117 — 25000000 руб.
3. Двигатель ТВ2-117А — 10000000-65000000 руб.
4. Двигатель Аи-24ВТ — 40000000, Аи-20К — 14000000 руб.
5. Двигатель Д-30КП-2 — 130000000-190000000 руб.
6. Двигатель Д-136 — 210000000-340000000 руб.
7. Двигатель ГТД-350 — 30000000-80000000 руб.
8. Аэродромная железобетонная плита ПАГ-14 — 140000 руб.
9. Автошасси ЗИЛ-131 — 2950000-3900000 руб.
10. Автошасси Урал - 375 с кузовом-фургоном К1-375 — 6430000 руб.
11. Изделие АПМ-90М — 3500000 руб.
12. Прицеп бортовой СМЗ-8325 — 700000-800000 руб.
13. Прицеп 2-ПН-2 — 950000 руб.
14. Двигатель ЗМЗ-66 — 693000 руб.
15. Двигатель ЗИЛ-375 — 2990000 руб.
16. Двигатель КаМАЗ-740 — 3400000 руб.
17. Раздаточная коробка АПА-5Д — 950000 руб.
18. Кислородоазотодобывающая станция АКДС-70М — 55000000-180340000 руб.
19. Автомоб. кислороднозарядная станция АКЗС-75 — 5700000-15380000 руб.
20. Аэродромный кондиционер АК-1,6-9А — 133933000-140620000 руб.
21. Кондиционер аэродромный АК-0,4-9А «Пороша» — 28000000-84146000 руб.
22. Аэродромный многоцелевой кондиционер АМК-24/56 — 13947000-66940000 руб.
23. Аэродромный многоцелевой кондиционер АМК-24/56 — 66334000 руб.
24. Газификатор сжиженных газов ГСГ-250/420 — 40250000 руб.
25. Резервуар для хран. и трансп. жидкого кислорода ТРЖК-2У — 3000000 руб.
26. Унифицированная газозарядная станция УГЗС.МА — 25800000-56192000 руб.
27. Установка для проверки гидросистем летательных аппаратов УПГ-250ГМ — 17700000 руб.
28. Установка для проверки гидросистем УПГ-300 — 24817000-121605000 руб.
29. Обмывочно-нейтрализационная машина 8Т-311М — 6000000-7100000 руб.
30. Аэродромный передвиж. электроагрегат АПА-4Г — 4850000 руб.
31. Авиационный подвижной электроагрегат АПА-5Д — 40246000-193180000 руб.
32. Аэродромный передвиж. электроагрегат АПА-50М — 7100000-7400000 руб.
33. Аэродромный подвижной электроагрегат АПА-80 — 9500000-32700000 руб.
34. Агрегат электропреобразовательный авиационный АЭМГ-50М — 2450000-9230000 руб.
35. Электрогидроустановка ЭГУ-17/210 — 11275000-53297000 руб.
36. Электрогидроустановка ЭГУ-50/210 — 28480000 руб.
37. Унифицированная компрессорная станция УКС-400В-П4 — 16816000-40012000 руб.
38. Воздухозаправщик ВЗ-20/350 — 11470000-11800000 руб.
39. Мастерская слесарномеханическая универсальн. МСМУ-1АМ/2АМ — 5900000 руб.
40. Электростанция ЭСД-30-ВС/400-М5 — 4400000 руб.
41. Мастерская клепальносварочная универсальн. МКСУ-2А — 5900000 руб.
42. Электростанция ЭСД-10-ВС/400М — 2700000 руб.
43. Агрегат АБ-4-0/230М-1 — 235000-565000 руб.
44. Агрегат АБ-12-Т/400М1 — 1100000 руб.
45. Электростанция ЭСД 2-12 — 6500000 руб.
46. Электростанция ЭСД-30-ВС/230-М2 — 4600000 руб.
47. Электр. таль — 264450-382000 руб.
48. Подвесной топливный бак — 350000-500000 руб.
49. Костюм ВК-3М — 29100 руб.
50. Парашюты — 51000-1616000 руб.
51. Парашютно-десантная жидкая тара ПДТЖ-120 — 399100 руб.
52. Преобразователь ПТ-125Ц — 450000 руб.
53. Втулка рулевого винта — 35200000-247000000 руб.
54. Радиолокационная прицельно-навигационная система КУПОЛ-II-76 — 132000000 руб.
55. Лопасти несущего винта Ми-2 — 5000000 руб.
56. Автомат перекоса — 6000000 руб.
57. Редуктор ВР-26 — 14000000 руб.
58. Измеритель РЗ-42 — 322000 руб.
59. Набор мер длины из 83 мер — 100000 руб.
60. Линейки ЛД — 1900-6100 руб.
61. Линейка поверочная — 6400-7450 руб.
62. Угольник лекальный 160х100 — 6500 руб.
63. Теодолит 2Т-30П — 669100 руб.
64. Нивелир НЗК — 271500 руб.
65. Микрометры — 45000-68000 руб.
66. Дефектоскопы — 268000-1600000 руб.
67. Динамометр ДПУ-0,2-2 — 56500-75950 руб.
68. Преобразователь ПО-6000 — 110200 руб.
69. Коробка отсечки частоты КОЧ-1А — 14000-101700 руб.
70. Угольный регулятор напряжения РУГ — 13000- 91000 руб.
71. Переключатели — 2400-4850 руб.
72. Контакторы КМ,ТКД, КНЕ — 2930-150000руб.,
73. Блок защиты и управл. БЗУ — 143000-1077200 руб.
74. Розетка ШРАП-400-3ф, ШРАП-500 — 20010-27000 руб.
75. Сопротивление ВС-20 — 6750 руб.
76. Блок БРН-208М7А — 70000-306500 руб.
77. Реле ДМР-600АМ — 16600 руб.
78. Регулятор РТ-12-6 — 4350500 руб.
79. Электроугольные изделия МГС-7 — 1990 руб.
80. Манометр НТМ-240 — 77000-77900 руб.
81. Вариометр ВАР-30МК — 30400 руб.
82. Датчик ИД-100 — 34500 руб.
83. Измеритель шума и вибрации ВШВ-003 — 2630000 руб.
84. Ручная пневматическая машина СМ-21-6-12000 — 27000-30000 руб.
85. Пневмомолоток КМП — 51350-56500 руб.
86. Пневморезьбозавертная машина РМП-22-8-160 — 61150 руб.
87. Пневмошлифовальная машина ИП-2014 — 74000-80000 руб.
88. Сигнализаторы — 16200-172000 руб.
89. Блок БУС-1 — 500000 руб.
90. Клапан МКТ-212 — 37100 руб.
91. Механизм исполнительный ИМ-3А/40 — 97000-156250 руб.
92. Синхронизатор СО-40 — 106000-134500 руб.
93. Запасные части насоса НП-92А-4 — 4200 руб.
94. Запасные части тормоза КТ-135А-020 — 35000 руб.
95. ЗИП КАУ-115 — 15800 руб.
96. Одиночный комплект к АИ-9В — 1600000 руб.
97. Фильтроэлемент — 100000 руб.
98. Гироагрегат ГА-8 — 1300000 руб.
99. Приемник ППД-1 — 60000 руб.
100. Приемник ППД-5 — 60000 руб.
101. Преобразователь ПО-500А — 370000 руб.
102. Курсовая система ГМК-1А — 2300000 руб.
103. Пульт ПУ — 1050000 руб.
104. Гировертикаль МГВ-1СУ — 3900000 руб.
105. Аппаратура 2ИА-6-870 — 1950000 руб.
106. Усилитель У-6М — 400000 руб.
107. Промежуточный редуктор — 8000000-27000000 руб.
108. Хвостовой редуктор — 30000000-31000000 руб.
109. Хвостовой вал — 20000000 руб.
110. Гидроусилитель КАУ-140 — 3600000-10500000 руб.
111. Главный редуктор ВР-2 — 17000000-37000000 руб.
112. Автомат перекоса — 5800000-6000000 руб.
113. Втулка несущего винта — 56000000-57000000 руб.
114. Приборы (вольтметры, ваттметры, частотомеры, магазины сопротивлений, генераторы, измерители, переключатели) — 7000-3066000 руб.

ВДС
1. Парашюты: десантные, запасные, спортивные, вышковые, ПТЛ-72 с КЗУ — 40000-325000 руб.
2. ПГС-500 серии 2 с платформами и сотобловками — 107000 руб.
3. ПДСБ-1 — 57000-80000 руб.
4. Многокупольная парашютная система МКС-5-128Р — 4250000 руб.
5. Вытяжные парашютные системы — 150000-325000 руб.
6. Парашютная платформа П-7 — 1700000-2550000 руб.
7. Куполы парашютов (без строп) — 8000-77000 руб.
8. УПДММ-65 с ОКС-4 — 145000 руб.
9. Светомаяки СД-02-10 — 4500-4800 руб.
10. Контейнеры гр. ГК-30Р, ГК-30У — 13000-16500 руб.
11. Ремни крепления оружия — 200 руб.
12. Жилеты спасательные САЖ-43П — 6000-11500 руб.
13. Лодка МЛАС-1об — 45000-73000 руб.
14. Укладочные вилки с крючком к Д-5 — 300 руб.
15. Подвесная система к парашютам Д-5 — 4000 руб.
16. Ранцы парашютов — 4500-5500 руб.
17. Мешок ПГС-500 — 1000 руб.
18. Подвесная система к ПГС-500 — 11000 руб.
19. Парашютные приборы: ППК-У-240А-Д, АД-3У-Д-165, ППК-У-240А-Д — 2000-4100 руб.
20. Звенья крепления ПГС-500 — 250 руб.
21. Веревки вытяжные — 500-1000 руб..
22. Стаб. сист. с куполом — 7100-13000 руб.
23. Сумки переност. к парашютам — 3000-5000 руб.
24. Утиль капроновый — 1000 руб.

ИНЖЕНЕРНАЯ ТЕХНИКА
1. Тротил в шашках по 200г — 16900000 руб.
2. Тротил в шашках по 400г — 15810000 руб.
3. Экскаваторы – 16350000-56300000 руб.
4. Землеройная машина ПЗМ-2 — 52000000-62000000 руб.
5. Бульдозер ДЗ-42 -5100000 руб.
6. Бульдозер Д-271 — 17150000 руб.
7. Скрепер самоходный Д-357П — 20000000 руб.
8. Снегоочиститель ДЭ-220А — 19300000 руб.
9. Дизель-молот ДМ-240 — 2000000 руб.
10. Краны автомобильные КС — 4500000-19000000 руб.
11. Электропогрузчик ЭП-103-2,8У1,1 — 1900000 руб.
12. Автопогрузчик 4045Р-1100000 руб.
13. Электростанция ЭСД-10ВС/230-М — 3000000 руб.
14. Катер БМК-130МЛ — 38500000 руб.
15. Катер БМК-150М — 10500000 руб.
16. Звено речное ПМП — 4200000 руб.
17. Электростанция АЗДС-20-М2 — 1500000-3500000 руб.
18. Электростанция ЭСД-75ВС/230М — 6000000 руб.

ХИМИЧЕСКОЕ ИМУЩЕСТВО
1. Мастерская ПРХМ-3 — 56100000 руб.
2. Специальное оборудование тепловой машины ТМС-65 — 24000000-29000000 руб.
3. Комплект ДК-4К — 16500-17000 руб.
4. Костюм Л-1 — 26000 руб.
5. Плащ ОП-1М — 11100 руб.
6. Чулки защитные — 5100 руб.
7. Перчатки БЛ-1М — 450 руб.
8. Моноэтаноламин — 480 руб.
9. Дымовая шашка ДМ-11 — 2000 руб.
10. Ручная дымовая граната РДГ-2 — 1000 руб.
11. Щетка сб.07-8 из к-та ДК-4 — 1000 руб.
12. Ящик ст. для СЗ — 6300 руб.
13. Ящик из-под дымов — 500 руб.
14. Электрические агрегаты АБ-4/АБ-2 — 8000000-1100000 руб.
15. Цистерна Ц-2 на шасси прицепа 2-ПН-2 — 1100000 руб.

ИМУЩЕСТВО СЛУЖБЫ ГСМ
1. Автоцистерны (АЦЗ, АЦ, АКЦ) — 2500000-17000000 руб.
2. Автотопливозаправщики (АТЗ) — 3200000-35000000 руб.
3. Автотопливомаслозаправщики (АТМЗ) — 3500000 руб.
4. Маслозаправщики (МЗ) — 2500000-14800000 руб.
5. Топливозаправщики (ТЗ, ТЗА) — 7000000-11000000 руб.
6. ТММ-200 — 46000000 руб.
7. ПСГ — 1500000-37600000 руб.
8. Лаборатория 8Ю-44М-1 — 240000 руб.
9. ПНУ — 18500000-71400000 руб.
10. Установки МНУГ, МНУМ, МНУК — 120000-2800000 руб.
11. Специальное оборудование АЦ-5,5-375 — 3200000
12. Прицепы-цистерны (ПЦ, ППЦ) — 6500000 руб.
13. ЖД цистерны ЖКЦ, ЖГЦ — 10000000-14200000 руб.
14. Резервуары — 355000-2450000руб.
15. Бочки –30000- 621000 руб.
16. Масла, смазки, парафин, церезин — 545000-6520000 руб.
17. Муфты, переходники, вставки, кольца, задвижки— 600-110000 руб, ГЗСТ-4-1250 — 600000 руб.

ВЕЩЕВОЕ ИМУЩЕСТВО
1. Машина для спускания краев деталей АСГ-13 — 450000-620000 руб.
2. Машина для фрезерования уреза и голеночной части подошвы обуви ФУП — 1698000 руб.
3. Насосная станция 2 К-6А с электродвигателем АО-2-31 — 75000-90000 руб.
4. Ручной насос БКФ-4 — 8000-10100 руб.
5. Карусельный винтовой пресс для ремонта обуви ПРО-4 — 31000-41200 руб.
6. Палатка плащ-накидка для солдат — 12000 руб.
7. Рубаха нательная из бязи для солдат — 3000 руб.
8. Кальсоны нательные из гринсбона для солдат — 3000 руб.
9. Рубаха теплая — 3

СВІСЛАЦКАЯ ТАЛАКА: РАЗАМ, АЛЕ НЕ ЗА КОШТ ІНШАГА

«Чалавечы фактар быў, ёсць і будзе асноўным у рабоце нашага калектыву» — пазіцыя старшыні СВК «Свіслач» Гродзенскага раёна Васіля Густыра

Калі прыязджаеш у вядомы на ўсю рэспубліку сельскагаспадарчы кааператыў «Свіслач» і набліжаешся да яго адміністрацыйнага будынка, то першая думка — не пра выдатныя ўраджаі збожжа і надоі малака, а пра павагу мясцовых жыхароў да сваёй мінуўшчыны. Настолькі акуратна, прывабна выглядае былы палац графіні Марты Красінскай, дзе цяпер размяшчаюцца праўленне СВК, Дом культуры, бібліятэка і іншыя ўстановы. А з нядаўняга часу тут адчынены музей не толькі гаспадаркі, але і ўсіх населеных пунктаў Квасоўскага сельскага Савета. Ажыццявілася даўняя мара — не дзеля турыстаў, а для тутэйшых жыхароў, найперш каб моладзь ведала пра свае карані і гісторыю малой Радзімы.

Былы палац графіні Красінскай, дзе размяшчаецца праўленне СВК, і зараз цешыць вока.

Надвор'е і прафесіяналізм: хто каго?

Нядаўна працаўнікі СВК «Свіслач» падвялі вынікі сваёй работы за 2006 год. Часцей за ўсё як бывае ў справаздачах? Спачатку — аб дасягненнях, затым — аб недахопах і праблемах. Здавалася б, кіраўнік гаспадаркі Васіль Густыр таксама мог пайсці па гэтай наезджанай каляіне, тым больш што мінулы год, хоць і не быў лепшым у яе найноўшай гісторыі, але зноў не абышоўся без рэкордных паказчыкаў. На гэты раз — у жывёлагадоўлі. Вытворчасць малака на 100 гектараў сельгасугоддзяў склала 1836 цэнтнераў — самы высокі паказчык у вобласці. Упершыню дзяржаве рэалізавалі 5224 тоны малака і 585 тон ялавічыны. На адну фуражную карову надаілі 6616 кілаграмаў малака. Выхад цялят — 98 галоў на 100 кароў.

Ды ў земляробстве такія паказчыкі, аб якіх многія калегі Васіля Мікалаевіча пакуль толькі мараць. Як марыў і сам Густыр на пачатку свайго старшынства ў «Свіслачы». У 1978-м, па выніках першага года працы на пасадзе тады яшчэ дырэктара саўгаса яго віншавалі з ураджаем збожжа па 40 цэнтнераў з гектара. У той час гэта быў бясспрэчны поспех, але сёння — ужо даўно пройдзены этап. Мяркуйце самі. Летась ва ўмовах сумнапамятнай засухі атрымалі, з улікам кукурузы, па 77 цэнтнераў збожжа з гектара. Занялі першае месца на Гродзеншчыне па вытворчасці кармоў: нават пры ўзрослым пагалоўі і высокай шчыльнасці буйной рагатай жывёлы на адзінку плошчы маюць больш за 30 цэнтнераў кармавых адзінак на ўмоўную галаву.

І вось на фоне такіх зайздросных лічбаў старшыня пачынае свой справаздачны даклад з … недапрацовак.

— Не за гарамі час, калі вытворчасць нізкаякаснай і дарагой прадукцыі будзе не запатрабавана, а значыць, не будуць патрэбны дрэнныя спецыялісты, асобныя фермы і, можа, нават некаторыя гаспадаркі, — лічыць Васіль Густыр.

А надвор'е, кажа Васіль Мікалаевіч, трэба прымаць такім, якое яно ёсць, і замест спасылак на неспрыяльныя ўмовы лепш усёй талакой задумаемся, дзе нашы слабыя месцы, якія рэзервы на палях і фермах трэба задзейнічаць.

І тут жа — інфармацыя для роздуму, скрупулёзны эканамічны аналіз па кожнаму віду прадукцыі, эыходзячы з працазатрат і выручкі ад рэалізацыі. Аказваецца, найбольш працаёмкай пакуль з'яўляецца малочная жывёлагадоўля, а з найменшымі людскімі затратамі ў «Свіслачы» вырошчваюць рапс і цукровыя буракі. Пры гэтым, аднак, прыбытак з кожнага гектара агародніны разоў у шэсць большы, чым ад рапсу, і ўтрая, калі параўноўваць са збожжавымі. Засеяць усе палі капустай і морквай? Гэта зрабіць можна, а вось прадаць...

Дык, можа, варта больш увагі надаваць цыбулі і бульбе? Але тут праблема з уборкай і захоўваннем. Патрэбны сучасны ўніверсальны камбайн для ўборкі бульбы, караняплодаў і цыбулі, а таксама агароднінасховішча, фундамент якога, дарэчы, ужо закладзены.

У фірменным магазіне № 1 у абласным цэнтры. Дырэктар Ніна ВАЛЧКОВА і загадчыца аддзела Тамара МАРКЕВІЧ.

Хвалюе старшыню і такое пытанне, як розніца ў надоях малака ад розных груп кароў. Калі б на ферме «Цэнтральная» ўсе працавалі на ўзроўні лепшай даяркі Браніславы Шаболік (сярэдні ўдой на карову ў мінулым годзе — 8042 кілаграмы!), то гэта азначала б для кааператыва плюс прыкладна 500 тон малака. А адсюль і прапанова зоаветэрынарнай службе: на базе кароўніка, дзе працуе гэты сапраўдны майстар сваёй справы, стварыць племяннное ядро, адбіраючы туды лепшых цялушак і адпрацоўваючы пытанні тэхналагічнага ланцужка з карысцю для ўсёй гаспадаркі.

— Далейшы рост вытворчасці патрабуе ад нас сапраўднага прафесіяналізму, скарачэння затрат, эканоміі кармоў, электраэнергіі, беражлівых адносінаў да механізмаў, строгай тэхналагічнай дысцыпліны на кожным рабочым месцы, — падкрэсліў Васіль Густыр.

Да прыкладу, наколькі выгадна прымяненне мясцовых відаў паліва? У гаспадарцы эыходзяць з таго, што дровы не купляюць, а нарыхтоўваюць пры ачыстцы паркавай зоны і вёсак ад старых аварыйных дрэў і раскарчоўцы кінутых хутароў. Па сутнасці, вымушаная мера. Дык вось, на ўчастку Сяргея Урусава нарыхтавалі прыкладна 155 кубаметраў пры агульных затратах 1836 тысяч рублёў. Такім чынам, адзін кубаметр уласных дроў каштуе 11 850 рублёў, а лясгас прадае па 16—17 тысяч. Значыць, перавод кацельняў на мясцовае паліва цалкам апраўданы, тым больш з улікам навядзення парадку на сваёй тэрыторыі і працаўладкавання людзей у зімовы перыяд.

Што датычыцца электраэнергіі, то, пачынаючы з красавіка, дадатковая аплата кіраўнікам падраздзяленняў гаспадаркі будзе налічвацца пры ўмове скарачэння яе спажывання на 10 працэнтаў пры адначасовым павелічэнні вытворчасці прадукцыі (жывёлагадоўля) і адсутнасці зрываў у рабоце на іншых аб'ектах (піларама, бетонны вузел, сталярка, зерняток, магазіны). Лагічна: так, кааператыў — гэта адзіная сям'я, але за агульнымі паказчыкамі павінен быць бачны ўклад кожнага.

А вось на чым у «Свіслачы» не эканомяць, дык гэта на здароўі і ахове працы людзей. 32 мільёны рублёў затрацілі летась на паляпшэнне санітарна-бытавых умоў, сродкі аховы ад уплыву шкодных фактараў, забеспячэнне бяспекі абсталявання і тэхнікі, ільготы і кампенсацыі па ўмовах працы, на навучанне і павышэнне кваліфікацыі кадраў у вучэбных камбінатах. Шмат грошай укладзена таксама ў рамонт майстэрняў, пячнога ацяплення, падтрыманне тэмпературнага рэжыму на рабочых месцах.

Асноўны фактар — чалавечы

— Чалавечы фактар быў, ёсць і будзе асноўным у рабоце нашага калектыву, — гаворыць Васіль Густыр. — Рабілі, робім і будзем рабіць усё, што ў нашых сілах, для чалавека-працаўніка, ветэранаў, якія дзесяткі гадоў адпрацавалі ў гаспадарцы.

І гэта не прыгожыя словы, а рэальныя справы. Прычым у адносінах не толькі працаўнікоў палёў і фермаў. У «Свіслачы», калі справа датычыцца сацыяльных і іншых клопатаў, не робяць розніцы паміж спецыялістамі вытворчай сферы і медыкамі, настаўнікамі, работнікамі культуры, бытавога абслугоўвання і гандлю. Усе яны, да прыкладу, маюць роўныя правы на атрыманне жылля (цяпер падрадным спосабам будуюцца яшчэ тры чатырохкватэрныя дамы, а неўзабаве будуць закладзены чатыры аднакватэрныя) альбо на бясплатнае збожжа: дяркам і камбайнерам выдалі па 900 кілаграмаў, астатнім катэгорыям работнікаў — па 800, пенсіянерам — па 400. На балансе кааператыва клубныя памяшканні і бібліятэка, ажно 160 мільёнаў рублёў (!) затрачана на рамонт школы. А ФАП, каб пашырыць віды медыцынскіх паслуг насельніцтву, пабудаваны практычна наноў і будзе адной з лепшых падобных установ у вобласці. Гэта запатрабавала ад гаспадаркі 150 мільёнаў рублёў плюс яшчэ спатрэбяцца расходы на прыгожы выгляд фасаду будынка. Цяпер на парадку дня — праблема якасці вады, вельмі патрэбна станцыя па яе абезжалезванню.

У музеі гаспадаркі. Старшыня Квасоўскага сельскага Савета Віктар ГІДРАВЕЦ, гаспадыня музея Зінаіда ШЫДЛОЎСКАЯ і старшыня СВК Васіль ГУСТЫР.

...Пасля таго, як свае праблемы і прапановы выказалі на сходзе работнікі ўсіх структурных звёнаў гаспадаркі, былі прыняты правілы ўнутранага працоўнага распарадку СВК «Свіслач», дзе дакладна вызначаны правы і абавязкі кожнага работніка, у тым ліку што датычыцца заахвочванняў і спагнанняў, асабістай падсобнай гаспадаркі і г.д. А затым знайшлі сваіх уладальнікаў дзесяткі канвертаў з грашовымі прэміямі. Сярод іх — загадчыкі ўчасткаў Віктар Манкевіч, Генрых Гайдэль, механізатар Юрый Шашура, які намалаціў амаль 3000 тон збожжа. На сяўбе і доглядзе цукровых буракоў і кукурузы вызначыўся Генадзь Тапчылка, на ўборцы караняплодаў цукровых буракоў — Аляксандр Барэль, на нарыхтоўцы кармоў — Сяргей Берастоўскі і Анатоль Воўна, на ўборцы саломы, трамбоўцы сенажу і сіласу — Леанід Майсейчык. А як працуе на «Амкадоры» Ян Бекіш — заглядзенне! А ёсць жа яшчэ Іван Скаржынскі, Анатоль Бажко, на плячах якіх кааператыўны агарод, Мікалай Юшкевіч, Аляксандр Карпала, Валерый Скаржынскі, паляводы Вольга Капыцкая, Ларыса Хаміцкая, Вольга Арцюх, Марыя Шашура, цяплічніца Любоў Жукоўская, вадзіцелі Сяргей Рабчук, Аляксандр Абужынскі, Сяргей Жукоўскі...

Дарэчы, тым працаўнікам гаспадаркі, чые заслугі адзначаны занясеннем на Дошку гонару, прэмія «шматразовая»: спачатку — у памеры дзвюх базавых велічынь, а затым штомесячна па адной плюс да зарплаты. Лепшым жа жывёлаводам у якасці ўзнагароды — цяля. За першае месца — вагой 100 кілаграмаў, за другое і трэцяе — адпаведна 90 і 80 кілаграмаў. Падтрымалі і тых, каго праводзілі на пенсію.

Кветкі, апладысменты, усмешкі... Зрэшты, добры настрой быў не ва ўсіх, хтосьці, пэўна, атрымаў і горкі ўрок на будучыню. Можна ўявіць сабе: ты сярод лідараў па вытворчых паказчыках і практычна ратыў затраціў на ўдасканаленне яго матэрыяльнай базы і арганізацыі гандлёвага працэсу больш за 300 мільёнаў рублёў. Устаноўлены найноўшае халадзільнае абсталяванне, сучасныя вітрыны для раскладкі прадукцыі, укаранёна камп'ютарная сістэма ўліку тавараў і разліку з пакупнікамі. Штодзённы тавараабарот цяпер — каля 20 мільёнаў рублёў, з гэтым гандлёвым прадпрыемствам з задавальненнем супрацоўнічаюць больш за 100 пастаўшчыкоў самых розных тавараў. І, што вельмі радуе Ніну Мікалаеўну, ужо традыцыйна даспадобы пакупнікам агародніна СВК «Свіслач» — і, скажам так, у першапачатковым выглядзе, і пасля цэха засолу, які ёсць пры магазіне: з лістапада прадалі ўжо шэсць тон квашанай капусты, засалілі чатыры тоны агуркоў, каля тоны памідораў. Якасць свіслацкай агародніны — выдатная, цэны — самыя нізкія ў горадзе, а таму за пакупкамі прыязджаюць нават з іншых мікрараёнаў. Да таго ж, гаспадарка пастаўляе ў магазін збожжа, на якое ўжо таксама ёсць пастаянныя кліенты з прысядзібных і дачных гаспадарак. Карыстаюцца попытам і булачкі, якія тут выпякаюць у кандытарскім цэху.

Тавараабарот фірменнага гандлю СВК «Свіслач» (магазінаў у Гродне і на тэрыторыі гаспадаркі) летась склаў 6695 мільёнаў рублёў. Гэта азначае, што на аднаго занятага ў гандлі работніка рэалізавана тавараў на 111,6 мільёна рублёў. Зайздросны паказчык! А таму ў сваім справаздачным дакладзе Васіль Густыр нароўне з вытворцамі адзначыў і лепшых работнікаў гандлю — Ніну Валчкову, Ларысу Сак, Алену Шэрэль, Валянціну Пацына, Алену Палуянчык, Алену Халько, Людмілу Скаржынскую, вадзіцеляў Леаніда Шыдлоўскага і Леаніда Лабкова.

Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ, Барыс ПРАКОПЧЫК. Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Як гараджане сталі членамі сельгаскааператыва

Сярод удзельнікаў сходу была і выступіла з трыбуны Ніна Валчкова, якая з'яўляецца членам кааператыва, але пры гэтым пражывае і працуе ў... Гродне. І не толькі яна, а ўсе 60 членаў яе працоўнага калектыву, таксама гараджане.

Як жа атрымалася вось такое яднанне горада і вёскі? А справа ў тым, што пяць гадоў таму сельгаспрадпрыемства купіла прадуктовы магазін у абласным цэнтры (вул. Савецкіх пагранічнікаў, 116-а), і Ніна Валчкова на конкурснай аснове стала яго дырэктарам. У гандлі яна — не навічок, аднак упершыню, кажа Ніна Мікалаеўна, у яе, прызначаючы на пасаду, пацікавіліся не толькі чыста прафесійнымі якасцямі, але і спыталі аб бацьках, дзецях. Прычым такі падыход быў характэрны не толькі да кіраўніка магазіна, але і да ўсяго персаналу.

Сёння Ніна Валчкова і яе падначаленыя карыстаюцца такімі ж правамі, як і іншыя члены кааператыва (у прыватнасці, бясплатна альбо па чыста сімвалічнай цане забяспечваюцца капустай і бульбай), а магазін сярод прадуктовых увахадзіць у дзесяткі лепшых у Гродне. Толькі ў мінулым годзе сельгаскааператыў на ўжо маеш салідную прыбаўку да сямейнага бюджэту, аднак парушыў дысцыпліну і — бывай, прэмія. Крыўдна, канешне. Але хіба ж не справядліва?

Удзельнікаў урачыстага сходу вітаюць вучні мясцовай школы.

Модны базар

ЮДАШКІН-ШОУ: ГЛЯДЗЕЦЬ ЛЮБА, НАСІЦЬ ДОРАГА

Знакаміты расійскі куцюр'е Валянцін Юдашкін дзеля эксклюзіўнага паказу прывёз у Мінск не толькі сваю вяснова-летнюю калекцыю «Сады Санкт-Пецярбурга», але і ўсю сваю каманду, уключаючы дзяўчат-мадэляў.

Засталося таямніцай, як заснавальніка моднага Дома беларускія арганізатары ўгаварылі на такую авантуру, як фэшн-паказ у Беларусі. Звычайна калекцыі Юдашкіна паказваюцца ў вялікіх залах, разлічаных на 5—6 тысяч гледачоў (як, напрыклад, Крэмль). У нашым выпадку мадэлі дэфіліравалі ў мінскім клубе «Bronx», дзе хоць і пабудавалі адмыслова 15-метровы подыум, але колькасць публікі, эразумела, была ў разы меншая. Нягледзячы на гэта, беларусы нароўні з еўрапейцамі ўбачылі поўную, без купюр, версію славутай калекцыі. Дагэтуль «Сады Санкт-Пецярбурга» былі прадстаўлены ў Мілане і найперш у самім Пецярбургу — акурат да Дня св.Валянціна.

Матывамі і крыніцамі натхнення для стварэння новай калекцыі для Валянціна Юдашкіна сталі знакамітыя прыгарадныя палацы, фантаны Пецяргофа, раслінныя арнаменты каваных агароджаў, у тым ліку рашотка Летняга Саду — а таксама акварэльныя карціны рускіх мастакоў пачатку XX стагоддзя, эмацыянальныя і паэтычныя. Адпаведна, гэты настрой адбіўся на колерах прадстаўленага адзення: многа белага, дымчатага, малочнага, бежавага, лімоннага і светла-бірузовага. У якасці яркіх акцэнтаў — успышкі аранжава-чырвонага. Вясну і лета дызайнер прапануе модніцам (а калекцыя выключна жаночая) сустрэць у лёгкім шоўку ва ўсіх яго варыяцыях — ад шыфону і «дзікага» шоўку да сціснутых і вараных сацінаў, апрацаваных па сучасных тэхналогіях. Высокія таліі нагавіц і ўкарочаных паліто, вышыўка, стразы ў тон — гэта практычна фірменныя знакі Юдашкіна. Усё гэта спалучаецца з асноўнымі тэндэнцыямі 1990-х гадоў: любімыя многімі «плечыкі», падкрэслена жаноцкія сілуэты, шматслойныя дэталі, драпіроўка і г.д. Калекцыя выразна падзяляецца на дзве часткі: casual, або паўсядзённае адзенне для горада, і вячэрнія ўборы «ад куцюр».

Увогуле, Дом моды «Valentin Yudashkin» працуе зараз па трох накірунках: pret-a-porte, haute couture і дэмакратычная джынсавая лінія. Калі, скажам, эксклюзіўных мадэляў адзення Дом робіць у год не больш як 100 і маюць яны завоблачны кошт, то лінія гатовага адзення, якая выпускаецца ў Італіі, больш сціплая па цане — дызайнерскую рэч можна набыць, выклаўшы ад 1,5 да 5 тысяч еўра. А ўжо джынсы, асноўная частка якіх робіцца ў Ганконгу, «цягнуць» ад 120 долараў і вышэй. «У мяне вельмі дорага апранацца», — шчыра пракаментаваў Юдашкін. Магчыма, таму спявачка Анжэліка Агурбаш і змяніла марку Юдашкіна на больш даступны дызайн стыліста Алішэра; хоць сам Валянцін адзначыў, што «гэта быў прадзюсарскі праект майго сябра Філіпа Кіркорава, таму працаваць са спявачкай было вельмі цікава і прыемна».

Прызнаючы ўласную дарагавізну, Юдашкін, тым не менш, мяркуе, што публічныя людзі павінны апранацца менавіта ў знакамітых дызайнераў, прычым не браць напракат або купляць гатовае адзенне, а заказваць эксклюзіўныя мадэлі. Бо багатыя таксама плачуць — у сэнсе, умудраюцца пракалоцца, набываючы нават вельмі шыкоўныя ўборы. У якасці доказу Валянцін Юдашкін нагадаў прыём у Белым доме, дзе чатыры дамы, уключаючы Лору Буш, з'явіліся ў адной і той жа сукенцы ад Оскара дэ ла Рэнта. Мадэльеру гэта, канешне, дадатковы камплімент і рэклама — а вось дамам дакладна было няёмка і няўтульна...

— А ў нас, дарэчы, прадаюцца вашы рэчы з лініі «Yudashkin Jeans»! — пераключылі ўвагу куцюр'е з далёкага Белага дома на родны калярыт беларускія журналісты.

— Праўда? — здзівіўся Валянцін. — Ну, трэба паглядзець, ці сапраўды гэта наша прадукцыя. Бо мы даволі часта сутыкаемся, напрыклад, на поўдні Расіі з кантрафактам «пад Юдашкіна». І нічога дрэннага ў такіх падробках не было б, калі б рэчы былі сапраўды вартыя — але ж яны жахлівай якасці, а гэта падрывае прэстыж маркі!

Паводле слоў куцюр'е, следам за ім у Мінск наведаюцца камерцыйныя прадстаўнікі Дома — паглядзець, ці можна ў Беларусі разгарнуць свой бізнэс. Тым больш, наша краіна для Валянціна Юдашкіна не чужая — некалі пад Барысавам брат будучага знакамітага мадэльера і ганаровага акадэміка Расійскай акадэміі мастацтваў служыў у танкавых войсках, і Валянцін рэгулярна прыязджаў з Падмаскоўя наведаць родзіча. «Я не быў у Мінску вельмі даўно, і зараз тут усё па-новаму, — з лёгкім адценнем настальгіі заўважыў куцюр'е. — Новыя вуліцы, будынкі... Па-ранейшаму чыста і вельмі ўтульна. І калі паглядзець, напрыклад, як апранута моладзь — не адрозніш ад французаў ці іншых еўрапейцаў, бо зараз усе жывуць і камуніцыруюць у адзінай прасторы». А вось беларускіх мадэльераў, паводле ўласнага прызнання Валянціна, ён «не бачыць і не ведае», акрамя фабрыкі «Мілавіца», марка якой па-ранейшаму мае высокі статус.

У Мінску ж працягнецца праект «Bronx Couture»: плануецца прадставіць яшчэ многа куцюр'е, добрых і розных. Натуральна, ніхто не гарантуе, што ў выніку ў нас з'явіцца сетка разнастайных модных буцікоў і мы здолеем пагалоўна пераапрануцца ў дызайнерскае адзенне — але ж паглядзець, хоць адным вокам, можна...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Фота Сяргея ЧОРНАГА.

Дзве даты

14 сакавіка

1902 год — нарадзіўся Павел Сцяпанавіч Малчанаў, выдатны беларускі акцёр. Народны артыст Беларусі (1940), народны артыст СССР (1948), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Акцёр шырокага творчага дыяпазону, стварыў яркія народныя характары, вобразы трагічных і драматычных герояў.



1967 год — выйшаў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб пераводзе рабочых прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый на пяцідзённы рабочы тыдзень з двума выхаднымі днямі».

«У каханні мужчынам патрэбныя формы і фарбы: мужчыны патрабуюць вобразаў. А жанчыны — толькі адчуванняў. Яны кахаюць лепш за нас: яны сляпыя. Калі б у іх былі вочы, як жа можна было растлумачыць сабе іх выбар?»

Анатоль Франс (1844—1924), французскі пісьменнік.

Цытата дня:

Бацькі і браты шчыра віншуюць ***Ірыну ГРЫЦКЕВІЧ*** *з Віцебска з уступленнем яшчэ ў зусім веснавы ўзрост.*

Желаем очень много счастья.
Болезней, горестей не знать,
В труде успехов добиваться
И в личной жизни не зевать!



ВЫСТАЎКА АКТЫЎНАГА АДПАЧЫНКУ

13—16 сакавіка ў сталіцы праходзіць Міжнародная спецыялізаваная выстаўка-кірмаш «Паляванне і рыбалоўства. Вясна-2007».

Яе арганізатарамі з'яўляюцца Нацыянальны выставачны цэнтр «Белэкспа», Міністэрства лясной гаспадаркі, дэпартамент па меліярацыі і воднай гаспадаркі Міністэрства сельскай гаспадаркі. На выстаўцы прадстаўлены арганізацыі, што займаюцца аховай прыродных ландшафтаў і экасістэм, паляўнічым і экатурызмам, вытворцы рыбалоўных прынадаў і паляўнічых тавараў. Паляўнічыя трафеі, спецыяльная літаратура, паслугі па актыўнаму адпачынку і турызму — усё гэта можна знайсці тут. Вялікая ўвага будзе нададзена прыцягненню людзей да здаровага ладу жыцця. Наведвальнікі могуць дэталёва азнаёміцца з прапановамі дзяржаўных прыродаахоўных устаноў і лесапаляўнічых гаспадарак Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Міністэрства лясной гаспадаркі. У рамках выстаўкі праходзіць конкурс лепшых навінак сярод рыбалоўных прынадаў 2007 года на прыз глядацкіх сімпатый, а таксама будуць падведзены вынікі і ўзнагароджаны пераможцы фотаконкурсу «Рыбалоўны трафей-2007». А кожны паляўнічы зможа стаць удзельнікам прэстыжнага салона паляўнічых трафеяў, для чаго яму дастаткова будзе прадставіць свае трафеі для экспертнай ацэнкі спецыялістам.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАЛІЧЫЛІ ЗУБРОЎ

Планавы падлік зуброў у Белавежскай пушчы завяршылі егеры і навуковыя супрацоўнікі Нацыянальнага парку. Па выніках праведзенай работы было ўстаноўлена, што зуброў у лесе стала больш. Летась на беларускім баку пушчы нарадзілася 46 зубранят, некаторыя з іх паявіліся на свет у лістападзе-снежні. Але ўвесь маладняк добра перанёс зіму. Зараз у Нацыянальным парку жыве 334 асобіны зубра. Яшчэ каля 400 галоў пушчанскіх волатаў жыве на польскім баку пушчы.

Яна СВЕТАВА.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.28	18.11	11.43
Віцебск —	6.18	18.00	11.42
Магілёў —	6.18	18.01	11.43
Гомель —	6.14	17.58	11.44
Гродна —	6.43	18.26	11.43
Брэст —	6.43	18.27	11.44

Месяц

Апошняя квадра 12 сакавіка. Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Антаніны, Ганны, Еўдакіі, Надзеі, Аляксандра, Антона, Васіля, Івана, Несцера, Пятра*
К. *Евы, Мацільды, Лазара, Лявона, Міхала*

Надвор'е на заўтра



…у суседзяў

ВАРШАВА	+12 — +14 °C	МАСКВА	+4 — +6 °C
ВІЛЬНЮС	+8 — +10 °C	РЫГА	+7 — +9 °C
КІЕЎ	+4 — +6 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+2 — +4 °C

Без ападкаў

Усміхнёмся!

Дзікі Захад.

— Мамачка, Білі ўсё ж вырашыў са мной ажаніцца!

— Ён прапанаваў табе руку і сэрца?

— Яшчэ не, але ён ужо застрэліў сваю жонку.

☺

ЗША накіравалі ў Ірак чарговы воінскі кантынгент колькасцю 20 000 чалавек. Вучоныя падлічылі, што такімі тэмпамі ўсё насельніцтва Амерыкі зможа перабрацца ў Ірак толькі да 2198 года.

☺

Плывуць дзве акулы каля ўзбярэжжа і раптам заўважаюць віндсерфінгіста. Адна — другой (у захапленні):

— Вось гэта сэрвіс — на падносе, ды яшчэ і з сурвэткай!

☺

Мы ведаем чалавека, які за 20 секунд з'ядае кілаграм сліў. Мы не ведаем, як яго завуць, але ведаем, дзе яго шукаць...

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 1417. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12